КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 8 (1186) 21 лютага 2015 г.

СПАДЧЫНА ГЕДЫ

З 2013 года Магілёўскі абласны мастацкі музей імя Паўла Масленікава па частках атрымлівае спадчыну мастака Канстанціна Геды, якая па тастаменце яго дачкі перадаецца ў гэтую ўстанову. Днямі былі атрыманы работы, прысвечаныя Першай сусветнай вайне. Падрабязна пра гэта — у наступных нумарах "К"

"Круглы стол" "К"

Інфантыльнасць нараджае інфантыльнасць

Музычная журналістыка: будзе толькі горш?..

Каб абмеркаваць стан сучаснай айчыннай музычнай журналістыкі, да нас завіталі тыя, хто даўно піша пра музыку і карыстаецца пэўным аўтарытэтам, — Сяргей БУДКІН (далей — С.Б.) і Павел СВЯРДЛОЎ (П.С.), да каго далучыўся і прадстаўнік "К" Алег КЛІМАЎ (А.К.), а таксама музыканты: гітарыст гурта "Гаротніца" Аляксандр ФУНТ (А.Ф.), лідар гурта "Pomidor/Off" Аляксандр ПАМІДОРАЎ (А.П.) і вакаліст гурта "Цягні-Штурхай" Павел ТАРАЙМОВІЧ (П.Т.). Але гутарка выйшла за рамкі тэмы: удзельнікі дыскусіі закранулі "супрацьстаянне" музыкант — музычны журналіст наогул...

Падставай для чарговага "круглага стала" "К" стаў матэрыял пра дэбютны альбом гурта "Гаротніца". Рэцэнзію апублікаваў адзін з партаалаў і выклікаў у Сеціве абураную рэакцыю, перш за ўсё — прыхільнікаў калектыву. Вось пара пасажаў з гэтага артыкула: "…узнать вокалистку по голосу и манере в слепом тесте против десятка-другого выпускниц "кулька" будет достаточно проблематично"; "…судя по роликам на "Ютубе", вживую дела обстоят еще хуже… Это всё немного напоминает школьный дискач: звучит "Ace of Base", в центре спортзала ломается и кривляется сорокалетняя уборщица-алкоголичка, периодически подмигивая оцепеневшим от ужаса старшеклассникам…".

Сапраўдных мала

А.К.: — Шаноўныя музыканты! Дык што вы думаеце пра тое, як айчынныя журналісты асвятляюць падзеі, што адбываюцца ў музычным жыцці краіны? Ці задавальняе вас якасць іх матэрыялаў?

А.П.: — У мяне даўно склалася адчуванне, што такая штука, як наша музычная журналістыка, цытуючы "Новы Сатырыкон", "вмерла, некралогу не побачив". Цяпер яна замяшчаецца фанацкімі крыкамі — чым далей, тым больш. Калі раней можна было казаць пра з'яўленне новых імёнаў, пра спробы аналізу музычных з'яў, дык сёння тыя людзі па розных прычынах сышлі з названага поля. А змены бракуе. З такой тэндэнцыяй я сутыкнуўся яшчэ ў час працы на радыё: людзей, якія працуюць у інфармацыйным полі, не цікавіць кантэнт, іх цікавіць толькі ўласнае існаванне ў эфіры. Пра музыку яны таксама вяшчалі скрозь прызму ўласнага "я": "Вось Я сказаў!" Самавыяўленне за чужы кошт да журналістыкі не мае дачынення. Таму паўтаруся: хвароба — запушчаная. І такая інфантыльнасць нараджае інфантыльнасць і з боку музыкантаў: "Ах, мяне пакрыўдзілі!" У выніку мы маем канфлікты, якія перыядычна ўзнікаюць паміж журналістамі (і так званымі журналістамі) ды музыкантамі з іх прыхільнікамі, куды нярэдка ўмешваюцца і стороннія грамадзяне, тыя ж карыстальнікі Інтэрнэту. І ўзнікае камяк, які складаецца з тых, хто пакрыўдзіў, з пакрыўджаных ды выпадковых сведак.

На жаль, у Беларусі няма спецыялізаваных друкаваных музычных выданняў. Ёсць два-тры парталы, якія нейкім незразумелым для мяне чынам здабываюць сродкі на сваё існаванне. Маюцца яшчэ нейкія спробы электроннай музычнай журналістыкі. А інфармацыйныя рэсурсы чамусьці неахвотна пішуць пра беларускую музыку, дый месца ёй там адведзена вобмаль…

А.К.: — Дзіўна, што няма сайта, які піша пра нашу поп-музыку…

С.Б.: — Таму, што яна не цікавая. Таму, што нулявая, пустая, знаходзіцца па-за беларускім кантэкстам...

П.Т.: — Знаёмы падыход, калі поп-выканаўцаў агульна абвяшчаюць нецікавымі і пустымі. Так, шмат лухты, але пра ўсіх так казаць нельга. Я шмат у чым згодны з Сашам. Апошнім часам сучасная журналістыка трансфармуецца ў сеткавыя каментарыі. Яе мэта ў тым, каб не разабраць музыку, а "наехаць" на выканаўцу. Тое, што падабаецца такім журналістам, яны хваляць ці не чапаюць. Астатняе можна "паліваць" як заўгодна. Не падабаецца, што артыст не спявае на беларускай мове, — значыць, гэта дрэнны артыст; калі поп-музыка — жудасна! Хацелася б большай аб'ектыўнасці: занадта шмат суб'ектыўных меркаванняў, калі выпінаецца ўласнае "я".

А.Ф.: — Самавыяўленне сапраўды пераважае над музыкай. Але кожны вольны пісаць так, як лічыць патрэбным. Пытанне ў тым, ці варта меркаванне публікаваць, бо часам здаецца, што пішуць пра музыку не кампетэнтныя ў ёй людзі. Рэцэнзент можа не слухаць тую музыку, якую рэцэнзуе, альбо прадмет яму апрыёры не блізкі: чытаючы пра музыку, часта бачу, што чалавек "не ў тэме". Як музыканту мне цікавае меркаванне таго, нават калі ён крытыкуе, хто можа больш-менш з веданнем справы растлумачыць, чаму лічыць менавіта так. Дый рэцэнзіі сёння чытаюць толькі самі музыканты…

А.П.: — Віляць не станем: кожны, хто адчуў сябе артыстам, хоча быць прыгожым. І ён лічыць сябе такім, хоча, каб менавіта так яго ацэньвалі і іншыя, каб пахвалілі. Але пры гэтым у кагосьці ўключана галава, а іншы стане разносіць студыю, калі пытанні задаюцца не яму, а таму, хто побач сядзіць. Калі музыкант знаходзіцца ў творчым працэсе — падрыхтоўка канцэрта, запіс, — натуральна, ім марнуецца пэўная колькасць сіл. Хочацца зрабіць прыгожа, і ён лічыць, што зрабіў прыгожа. І вось аддае наш музыкант сваю працу на ацэнку. І з гэтага моманту трэба разумець, што цяпер яна належыць не толькі яму, а яшчэ і людзям. Для мяне важна, каб у першую чаргу прадукт задавальняў мяне, каб мне за яго не было сорамна. Але, безумоўна, хочацца, калі чытаеш водгук, каб ягоны аўтар выявіў акцэнты, якія я расстаўляю. У гэтым выпадку, калі я нават не згодны з пазіцыяй журналіста, адчуваю задавальненне. Калі не выявіў, усё роўна адчуваю задавальненне. І мяне не могуць засмуціць словы журналіста, што ў гэтым месцы я праспяваў лажова, калі я сам ведаю, што так яно і ёсць...

Працяг "круглага стала" — **на старонках 2 — 3.**

9 771994 478007 15008

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны мастак, намеснік старшыні Беларускага таварыства ў Малдове **Вячаслаў Ігнаценка**.

Акцэнт тыдня

Куды творы знікаюць?

Зайшоў у рэдакцыю мой сябра, скульптар Эдуард Астаф'еў. Пагаварылі пра тое-сёе. У прыватнасці, аб тым, што зараз вельмі цяжка жыць скульптарам, бо дзяржаўных заказаў амаль няма, дый прыватных мала. Вось і даводзіцца круціцца…

Барыс КРЭПАК

Аднак без творчасці нармальны мастак у любым выпадку не можа існаваць, і Эдуард зараз рыхтуе сваю выстаўку ў Светлагорску, бо ў майстэрні назбіралася вельмі шмат работ, якія хочацца паказаць гледачу. А потым раптам з горыччу сказаў: "Мяне даўно хвалюе праблема дастойнага захавання спадчыны мастака пасля яго смерці. Мабыць, яна ніколі не будзе вырашана…" І прывёў журботныя факты пра тое, як немаведама куды знікаюць з майстэрняў творы памерлых таленавітых скульптараў. І нікога гэта не цікавіць: ні Саюз мастакоў, ні Міністэрства культуры, ні іншыя ўстановы, ад якіх залежыць жыццё нашай культуры…

Я не здзівіўся: праблема гэтая, што тычыцца не толькі скульптараўнябожчыкаў, але і ўсіх іншых дзеячаў выяўленчага мастацтва, так бы мовіць, — вечная і, на мой погляд, амаль невырашальная. І на парадку дня дзейнасці Саюза мастакоў гэтае пытанне стаяла, мабыць, з дня заснавання. У свой час і ствараліся спецыяльныя камісіі па захоўванні той спадчыны мастака, якая заставалася ў майстэрні пасля яго смерці, і ўзніміліся такія пытанні на розных мастакоўскіх пленумах ды з'ездах, і былі звароты да дзяржаўных ды іншых музеяў з просьбай набыць хаця б частку (лепшую!) спадчыны мастака, але… Канешне, здараліся выпадкі, калі наш Мастацкі музей набываў штосьці, ці нейкі абласны купляў рэдкія творы сваіх землякоў, аднак гэта — кропля ў моры…

Так ці інакш, лёс спадчыны пасля смерці яе ўладальніка зведвае значныя метамарфозы ды мутацыі. І калі налажанага механізма на ўсе выпадкі і на Захадзе не існуе, то ў нас справы яшчэ горшыя. Сваякі ды сябры апынаюцца пасля смерці мастака нібы ў пустыні, бо тэрмінова трэба вызваляць майстэрню ад твораў нябожчыка. А якія спосабы асваення гэтай пустыні і, кажучы метафарычна, асаблівасці ды прыёмы яе меліярацыі? Ну, добра, калі майстэрня (разам з работамі памерлага) пераходзіць да яго сваяка, таксама мастака, і спадчына гэтая, хаця б часова, будзе там у цэласці ды захаванасці. А што потым? Напрыклад, што здарыцца з унікальнай спадчынай Аляксандра Кішчанкі ці Гаўрылы Вашчанкі, калі не з'явяцца пераемнікі? Трэба яшчэ разумець, што сваякі амаль ніколі не маюць магчымасці запоўніць свае ўласныя кватэры такімі творамі. А што ў "сухім астатку"? За капейкі прадаваць творы нейкім калекцыянерам — айчынным ды замежным? Ці проста дарыць музеям (калі тыя пажадаюць дар прыняць)? Ці проста (і такое бывае) махнуць на ўсё рукой — і тады творы апынаюцца на сметніку, як гэта ў свой час здарылася са скульптурамі Уладзіміра Хмызнікава і ў некаторых РДК, куды "на часовае карыстанне" перадаваліся работы з фондаў Саюза мастакоў ці Мастацкага музея "ў мэтах эстэтычнага выхавання насельніцтва".

Былі і шчаслівыя выпадкі, калі мастак яшчэ пры жыцці дарыў вялікія калекцыі сваіх работ рэгіянальным музеям, і дзякуючы гэтаму творы захаваліся. Так, Уладзімір Мінейка незадоўга да смерці падарыў 45 карцін Мазырскаму краязнаўчаму музею. А вось іншая гісторыя, менш радасная. Напрыканцы 1990-х сын вядомага жывапісца Івана Стасевіча — Уладзімір — перадаў на радзіму сям'і, у Старыя Дарогі, амаль сотню карцін бацькі, бо там абяцалі стварыць музей заслужанага дзеяча мастацтваў, удзельніка вайны, "сына палка" Івана Нікіфаравіча Стасевіча. Але музей яго імя так і не з'явіўся (адсутнасць фінансаў?), хаця каля дваццаці карцін выстаўлены ў экспазіцыі Гісторыка-этнаграфічнага музея, а астатнія творы — у сховішчы, чакаюць лепшых часоў. Затое сёння добра працуюць Галерэя імя лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, жывапісца і мастацтвазнаўцы, прафесара Леаніда Дробава ў пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці (у колішнім будынку аптэкі), Галерэя заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Гоманава на першым паверсе Гісторыка-краязнаўчага музея ў Сянне на Віцебшчыне, Музей-майстэрня Мікалая Пушкара ў Мазыры ды шэраг іншых імянных галерэй краіны, звязаных з радаводам мастакоў. Традыцыя, што заслугоўвае павагі…

Хацелася б даведацца, дзе сёння знаходзяцца (акрамя музеяў) творы такіх мастакоў, як Натан Воранаў, Альгерд Малішэўскі, Галіна Гаравая, Фёдар Бараноўскі, Іван Карасёў, Леанід Асядоўскі, Мікалай Якавенка, Фёдар Дарашэвіч, Валяр'яна Жолтак — спіс можна доўжыць... Дый справа не ў гэтым: проста не хацелася б, каб спадчына нашых творцаў, якія натхнёна будавалі нашу культуру, аказалася разбазаранай… Узгадайце хаця б, колькі твораў Віталя Цвіркі, Івана Дмухайлы ці Мікалая Селешчука аказаліся "згубленымі" ў прасторах блізкага і далёкага замежжа! А колькі можна назваць імёнаў "жывых" мастакоў, якія вымушаны і сёння прадаваць свае работы за мяжу прыватным калекцыянерам ды проста спекулянтам для далейшага перапродажу!.. Шмат… Але гэта зразумела: жыць трэба, сям'ю карміць, фарбы з палатном купляць ды за майстэрню плаціць…

А можа, варта паспрабаваць з зацікаўленымі асобамі і ўстановамі зладзіць у рэдакцыі "К" ці ў Саюзе мастакоў "круглы стол" на такую тэму, каб разгледзець пытанне стварэння ў сталіцы агульнагарадскога альбо рэспубліканскага сховішча для твораў мастакоў-нябожчыкаў?.. К

"Круглы стол" "К"

Музычная журналістыка: будзе толькі горш?..

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Гэта значыць, крытычная канкрэтыка мяне пакрыўдзіць не можа. Але якая гэта крытыка, калі журналіст піша, што альбом або песня — поўная каламута, і ўсё, але не абгрунтоўвае? Сумна мне тады становіцца. Я ж таксама пісаў рэцэнзіі, і мне таксама часам хацелася проста напісаць "поўная каламута". Ці не ведаў, што пісаць, але я паважаю і сябе, і прафесію журналіста, і чытачоў, і музыкантаў, таму знаходзіў словы, адшукваў довады.

П.Т.: — Мне таксама цікавая канкрэтыка: што думаюць аб песнях, што думаюць пра альбом наогул. Калі дыск выйшаў, ты сам як бы адстранёна яго ўспрымаеш: тут больш уклаў пачуццяў, тут — менш, гэтая песня больш падабаецца, тая — менш. А прачытаўшы рэцэнзію на наш апошні альбом, я здзівіўся: журналісты адзначылі тыя песні, якія я лічыў прахаднымі.

А.К.: — Што кажуць журналісты?

С.Б.: — Каб зразумець, які ўзровень нашай сённяшняй музычнай журналістыкі, дастаткова схадзіць на любую прэс-канферэнцыю, прысвечаную якой-небудзь музычнай падзеі. (Дарэчы, беларускія музыканты рэдка праводзяць прэс-канферэнцыі, што паказальна.) І тады становіцца ясна: гэтая сфера медыя практычна вычышчаная. Няма профільных выданняў, людзей, якія цікавяцца музыкай пастаянна, а ёсць вельмі павярхоўны падыход да яе. Тых, хто працуе ў галіне даўно, хто яшчэ застаўся ў ёй, як і маладых захопленых журналістаў, — адзінкі…

Наш партал існуе за грошы, якія мы здабываем усімі магчымымі шляхамі. А раз мы ўкладаем сваё, то і пішам толькі пра тое, што цікава нам. Я ніколі не разбіраю альбом такім чынам, што ды як там сыграна ды наколькі чыста праспявана. Але заўсёды разглядаю дыск у больш шырокім кантэксце — што з сябе ўяўляе творчасць канкрэтнага музыканта, які ягоны пасыл, — адштурхоўваючыся ад таго, што дадзены альбом зроблены менавіта тут і цяпер. Я люта ненавідзеў беларускую папсу, той ж гурт "Цягні-Штурхай": усё гэта кашмарнае, правінцыйнае і пластмасавае. Але я нават у такой музыцы навучыўся знаходзіць для сябе тое, за што яе можна пахваліць. Вучуся знаходзіць нейкія "плюсы". І не дазваляю сабе глядзець зверху ўніз, спрабую зразумець, чаму чалавек робіць менавіта гэта, з якой мэтай, спрабую раскусіць сутнасць, прытым што сам прадукт мне можа не падабацца. Кожны журналіст мусіць працаваць над сабой і, калі так здараецца, умець прызнаваць свае памылкі. Але пісаць пра беларускую поп-музыку, класічную музыку мне ўсё ж нецікава.

П.С.: — У нас стала усё нашмат горш не толькі з музычнай крытыкай, але і з самой музыкай. Варта толькі згадаць актыўнасць музыкантаў у 2003 годзе і параўнаць яе з цяперашняй актыўнасцю. Тое ж самае датычыцца і журналістыкі.

А.Ф.: — Наконт музыкантаў я не згодны.

П.С.: — Яркага — мала!.. Дзесяць гадоў таму ў нас былі два беларускія музычныя тэлеканалы, дзе ішлі перадачы пра айчынную музыку...

С.Б.: — Хапала праграм і на радыё...

П.С.: — ...на звычайных каналах паказвалі праграмы пра нашу музыку, а не проста круцілі песні. Былі рубрыкі ў газетах. Калі нават працэнтаў 70 складалі публікацыі і эфіры на "жоўтую" музычную тэму, то астатнія 30 — сур'ёзная музычная журналістыка, што таксама шмат. Сёння засталася адна "жоўтая" журналістыка, якая піша пра шоу-бізнес. Яна запатрабавана чытачамі і, адпаведна, СМІ. А на аналітыку, мне здаецца, цяпер і замовы няма. Зрэдку нешта для "рэліктавых зон" выдае, напрыклад, Тацяна Заміроўская. А ў Інтэрнэце яна піша пра жывёл (не ведаю, ці ёй гэта цікава, ці яна вымушана пісаць тое). Аналагічна і з астатнімі журналістамі, якія раней спецыялізаваліся на музычнай тэме. А маладыя там, дзе патрабуюцца публікацыі пра шоу-бізнес.

А.К.: — А ёсць каму прыходзіць у "сур'ёзную музычную журналістыку"?

П.С.: — Думаю, такія людзі знайшліся б, але няма ні друкаваных музычных СМІ, ні выданняў, якія запросяць журналіста з музычнай адукацыяй рабіць сур'ёзныя матэрыялы. У сувязі з апошнім цікава ўзняць тэму ролі музычнага журналіста ў нашым грамадстве. Саша Фунт дакладна заўважыў, што, дапусцім, крытык сёння піша толькі для музыкантаў. Гэта сумна, бо крытыка — "інструмент" масавага выхавання, яна можа дапамагчы ў трансляванні ідэй музыканта на больш шырокую аўдыторыю. І журналіст мусіць весці публіку, а не ісці за ёй. Атрымліваецца ж, што думкамі абменьваюцца толькі крытыкі з музыкантамі. З аднаго боку, гэта правільна: павінен быць чалавек, акрамя мамы, які здольны сказаць артысту, што той зрабіў нешта не так. З іншага — адсутнічае цэлы пласт, які раней мог заняць бок крытыка або музыканта ці застацца пры сваім меркаванні, і такія людзі таксама рухалі музычны працэс.

А.К.: — Дарэчы, пра адукацыю. Напэўна, кожнаму з прысутных тут журналістаў хто-небудзь з артыстаў адрасаваў такое пытанне: а ці ёсць у вас музычная адукацыя, каб пісаць пра нашы канцэрты, альбомы? Прысутныя тут музыканты салідарызуюцца са сваімі калегамі?

А.Ф.: — Для мяне важна, каб чалавек разумеў, пра што ён піша, каб ён валодаў нейкім багажом ведаў.

А.П.: — Можна не мець музычнай адукацыі, але ў музыцы разбірацца, цікавіцца тым, што адбываецца ў розных стылях… Ведаючы Сяргея, я больш чым упэўнены, што, пры ўсёй ягонай нелюбові да поп-музыкі, ён напісаў бы цалкам якасны агляд дыскаў беларускіх поп-выканаўцаў, каб задаўся мэтай. І не факт, што атрымаецца разгромны матэрыял. У Сяргея як мінімум ёсць досвед — і пазітыўны, і негатыўны, ён разумее, у якім поле існуе.

Складана патрабаваць ад Тані Заміроўскай агляду экстрэмальных метал-гуртоў, але калі певень дзяўбаў, яна выдатна тое рабіла, хай нават і набіваючы сваю рэцэнзію сцёбам на 80 працэнтаў, таму што ўмее пісаць такім чынам, што ў чытача ўзнікае вобраз таго, пра каго ідзе гаворка. А калі ўзнікае вобраз чалавека са стосам бутэрбродаў і колай, які ў перапынку паміж камп'ютарнымі танкавымі баямі накідаў 300 слоў, гэта засмучае…

П.Т.: — Далучаюся. Спецыяльная адукацыя — рэч не асноватворная. Эрудзіраванасць і зацікаўленасць — вось што, думаю, галоўнае.

А.П.: — У Пашы, дарэчы, ёсць музычная адукацыя. І ён небяспечны тым, што ў яго абсалютны слых.

П.С.: — Але пры напісанні рэцэнзій гэта не дапамагае…

А.К.: — Пра крэда Сяргея Будкіна мы даведаліся. А чым, у такім выпадку, кіруецца Павел Свярдлоў, калі піша пра музыку?

П.С.: — Я спрабую разгадваць задумы музыкантаў: навошта яны запісалі гэтыя песні і размясцілі іх у такім парадку. Заўсёды хочацца верыць, што музыканты запісваюць не выпадковыя песні: было ў іх дзесяць, столькі і запісалі. Такое бывае. І што там тады разгадваць? Хочацца згуляць з музыкантам у гульню, у якую ён ужо гуляе з табой, прапаноўваючы сваю творчасць ды чакаючы, што яе зразумеюць. Я выкладаю чытачам адзін з варыянтаў інтэрпрэтацыі гэтай творчасці, таго, на якую паліцу ў галаве яе паклас-

Сяргей Будкін.

Алег Клімаў.

Павел Тараймовіч.

Аляксандр Фунт.

Аляксандр Памідораў.

Павел Свярдлоў. / Фота Тацяны МАТУСЕВІЧ

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГА (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ,Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Аліна САЎЧАНКА; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Інга ЗЕЛЬГІС.
Сайт: **www.kimpress.by** E-mail: **kultura@tut.by** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 888. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 20.02.2015 у 18.00. Замова 719. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 80-годдзем народнага артыста Беларусі, кампазітара **Сяргея Картэса**.

Інфантыльнасць нараджае інфантыльнасць

ці, з якімі альбомамі звязаць. Пра музыку немагчыма пісаць аб'ектыўна, без суб'ектыўных ацэнак ці аўтарскага погляду. Іншая справа, што гуляць амаль няма з кім. Беларускія рок-альбомы сёння — справа рэдкая, а мне цікава разгадваць менавіта рок-музыкантаў, якія нясуць нейкае пасланне слухачу, тое, дзе ёсць змест…

Хто ўсе гэтыя людзі?..

А.П.: — Давайце пройдземся па персаналіях. Такія музычныя журналісты, як Дзмітрый Безкаравайны, Таццяна Заміроўская, Павел Свярдлоў, Дзмітрый Бурбуць, Сяргей Будкін, раслі ў мяне на вачах. З некаторымі з іх я неаднаразова высвятляў адносіны, але яны працуюць са словам, гэта — вучоныя людзі. Калі Заміроўская пісала пра тое, як некуды з'ездзіла, уплятаючы ў свой аповед іронію, сцёб, такое было цікава чытаць. Свярдлоў у сваіх матэрыялах проста анатаміраваў, часам залішне. Бурбуць "забіваў" інфарматыўнасцю, пралазячы ледзь не ў генеалогію Курта Кабэйна. Але тое, што яны напрацавалі — досвед і ўменне, — не перадаецца. А яны цалкам маглі б выкладаць музычную журналістыку (толькі Павел яе выкладаў), хоць бы вучыць слову, сярод гэтых гаджэтаў і "олбанскай мовы". Пакуль атрымліваецца тое, пра што сказалі: ісці публіцы няма за кім...

П.С.: — Пры лішку інфармацыі, зараз чытаюць таго, хто сам выклікае цікавасць як асоба. Таму сёння выданні запрашаюць пісаць, напрыклад, рэцэнзіі персон медыйных. Цікавасць фарміруюць не прафесійныя журналісты, а імёны. І цяперашняя генерацыя журналістаў вядзецца на тое ж самае: яны ствараюць уласны імідж "чоткага пацана", у тым ліку за кошт большай катэгарычнасці, чым патрабуе прадмет.

А.П.: — Гэта тое, пра што мы казалі раней: самарэалізацыя недажурналіста за кошт кагосьці іншага. "А потым, калі-небудзь, — ён думае, — я буду пісаць добра". А потым "а потым" не здараецца. Таму што і ад варон не адстаў, а да паваў не прыбіўся, і ў музыцы не разбіраецца. Але ён ужо — татальная зорка. Я такіх хлопцаў во колькі пабачыў!

А.К.: — Мы паступова падабраліся да таго, што стала прычынай нашай сустрэчы. Але спачатку я хачу спытаць Паўла Тараймовіча — удзельніка гурта, які пачынаўся як альтэрнатыўны, ператварыўшыся затым у поп-квартэт. Ты памятаеш, як змянялася стаўленне часткі журналісцкай супольнасці, што назірала вашы стылістычныя змены?

П.Т.: — Я не сказаў бы, што яно дыяметральна змянілася, трансфармаваўшыся, напрыклад, з нейтральнага ў негатыўнае, бо журналісты нас ніколі не любілі.

С.Б.: — А чаму, як лічыце?

П.Т.: — Можа, наша музыка для іх занадта простая? Або яны яе не лічаць наогул за музыку?.. Калі вам, журналістам, здаецца, што вельмі проста напісаць песню, якую будуць усё падпяваць, то вы памыляецеся.

А.К.: — Таварышы журналісты, якія ў вас ёсць прэтэнзіі канкрэтна да гурта "Цягні-Штурхай"?

П.С.: — Самая галоўная — разварот ад альтэрнатывы, ад нармальнага поп-панку.

С.Б.: — Жыць жа людзям трэба — так бы даўно распаліся. Ушчуваць іх за гэта не хацеў бы.

П.Т.: — Такі падыход мне падабаецца! Жывяце — і жывіце! А "гнабіць" таму, што нецікава? Навошта?

А.К.: — А вы хоць памятаеце, на якім інструменце граў Павел?..

П.С.: — Не.

С.Б.: — Гадаць не стану, не памятаю.

А.Ф.: — Дакладна не на басе.

П.Т.: — Я — на ўдарных... Задумаўся над вашымі словамі, што нам не было чаго есці, і таму мы вырашылі выконваць музыку, якая стане прыносіць шмат грошай. Вы, праўда, думаеце, што мы ў золаце купаемся?.. Проста мы выраслі, нам стала нецікава граць такую дурную музыку. І былі песні, якія можна спяваць пад гітару ў кампаніі. Сябры казалі: "Класныя ж! Чаго вы іх не запісваеце?" І запісалі. І пайшло. А сёе-тое са старэнькага мы плануем выканаць на канцэрце ў Палацы Рэспублікі. Будзе такі эксклюзіў.

П.С.: — Калі казаць аб прэтэнзіях не да гурта "Цягні-Штурхай", мне здаецца, што наша дзяржава фарміруе пэўны заказ на пэўную музыку. На афіцыйных мерапрыемствах і канцэртах выступаюць артысты, якія выконваюць толькі пэўную музыку. Гэта значыць, праблема заключаецца ў тым, што нібыта менавіта дзяржава замаўляе такую музыку — масавую, напаўтанцавальную, з вельмі простымі словамі. Правільную. І народ так яе і разумее: гэта — правільная музыка. І што мне з яе аналізаваць?

А.П.: — Ты не маеш рацыю. Неразумна патрабаваць, каб на нейкім забаўляльным мерапрыемстве гучала музыка са змястоўным тэкстам ды філасофскім пасылам. Людзі прыйшлі адпачыць, а ім пачнуць Бродскага спяваць. Не варта дзяліць артыстаў на правільных і няправільных.

А.К.: — Павел, а табе цікава чытаць свецкую хроніку, што гурт "Цягні-Штурхай" учора быў на вечарыне ў афігенных касцюмах, што Паўла Клышэўскага бачылі з прыгожай дзяўчынай, што Тараймовіч скінуў 20 кілаграм, Андрэй Заяц да гэтага імкнецца, а Кірыла Клішэвіч збіраецца папраўіцца?

П.Т.: — Пачытаю, чаму б і не? Для артыстаў карысна "свяцца": рэклама — рухавік гандлю! "Жоўтай" журналістыкі заўсёды больш, чым сур'ёзнай, як заўсёды больш поп-музыкі, чым року. І пры гэтым адно другое не выключае. Але я шчыра скажу: мне шкада, што сур'ёзнай музыкі становіцца менш, як і адпаведнай ёй журналістыкі…

Ледзь не забыліся...

А.К.: — І нарэшце — да тэмы, якая спарадзіла гэтую дыскусію. Музыканты "Гаротніцы" таксама без захаплення паставіліся да таго артыкула? Так?

А.Ф.: — Калі шчыра, мы засталіся задаволены артыкулам, таму што "выхлап" ад яго атрымаўся значна большым, чым ад хвалебнага матэрыялу. Мабыць, адзіная прэтэнзія заключаецца ў тым (пры разуменні таго, што гэта было суб'ектыўнае меркаванне), што хацелася б, каб чалавек данёс свае думкі да публікі ў больш карэктнай форме. Я на месцы нашай вакалісткі пакрыўдзіўся б. Але чалавек, які напісаў рэцэнзію, у музыцы разбіраецца. Напэўна, ён хацеў бы, каб яна выглядала некалькі па-дылетанцку, напэўна, разумеў, што яго матэрыял у такой форме дакладна справакуе рэакцыю. Я не магу паверыць, каб чалавек сур'ёзна пісаў, што Валерыя Валадзько спявае гэтак жа, як дзясятак выпускніц "кулька".

А.П.: — У гэтым матэрыяле мне падаўся дзіўным тэрмін "эстрада" — у негатыўным кантэксце. Не бачу ў ім нічога крыўднага. І я поп-музыкант, і гурт "Крама", і "N.R.M.", — гэта значыць, музыка, якая разлічана на масавага спажыўца. Узровень можа быць розным. Памятаеце, як у свой час з'явіліся Аляксей Хлястоў з Максам Алейнікавым? Так, папса, але цікавая, не тая, да якой мы прывыклі. Тое сталася вымярэннем новых стандартаў.

А што да пласцінкі "Гаротніцы" ў цэлым, то, каб я напісаў на яе рэцэнзію, на мяне многія пакрыўдзіліся б.

А.Ф.: — І я мог бы напісаць такую рэцэнзію.

А.П.: — Мне здаецца, што дадзеную рэцэнзію пісаў чалавек не надта прафесійны — ва ўсіх сэнсах... А артыст... Кожны артыст адчувае негатыўныя эмоцыі ад любой крытыкі.

П.Т.: — А я адчуў негатыў, прачытаўшы той матэрыял. Здалося, што яго аўтар ненавідзіць гурт ці кагосьці з яго асабіста.

А.П.: — Ён вырашыў папрактыкавацца ў "досціпе" на першым рэлізе…

С.Б.: — Насамрэч, былі моманты, калі "наезды" на сцэнічны вобраз вакалісткі хтосьці мог успрыняць як выпад у бок самой Валадзько.

А.К.: — Дык ці існуюць этычныя рамкі, за якія музычны журналіст не павінен выходзіць?

А.П.: — Як сказаў Саша, ён мусіць як мінімум ведаць тое, пра што піша. У адваротным выпадку можна трапіць у непрыемную сітуацыю, як гэта здарылася калісьці з адным журналістам, які пачаў апісваць выступленне Сяргея Манукян з яго знешнасці... Павел, дык ці існуе журналісцкая этыка? Усё залежыць ад выдання, з якім супрацоўнічае журналіст?

П.С.: — Пра тое, што чалавека нельга крыўдзіць, нам кажа, хутчэй, Крымінальны кодэкс, а не "звод" журналісцкіх норм, якія патрабуюць аб'ектыўнага падыходу. А якая можа быць аб'ектыўнасць, калі такі жанр, як рэцэнзія, мае на ўвазе суб'ектыўны погляд на рэчы?

П.Т.: — Я не здзіўляюся нічому, што пішуць. Хацелася б, вядома, каб і ў журналісцкім асяродку дзейнічалі маральныя законы ды абмежаванні. Скажам, не варта пісаць негатыў пра сям'ю героя публікацыі, калі першапачатковы матэрыял не патрабаваў згадкі пра яго жонку, дзяцей.

А.П.: — Многае залежыць ад унутранай культуры. Журналіст, безумоўна, нясе маральную адказнасць за напісанае.

А.К.: — Ну а меркаванне пра альбом гурта "Гаротніца" я выкажу ў рэцэнзіі на старонках "К"...

К

Віншаванне

Шаноўныя сябры, усе тыя, хто абараняў, абараняе і будзе абараняць нашу незалежную дзяржаву!

Дазвольце шчыра павіншаваць вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь! Сярод тых, хто сёння працуе ў сферы культуры, нямала асоб, што ў асабістым і творчым жыцці шчыльна з'ядналі свой лёс са старонкамі славы ды мужнасці сыноў нашай зямлі.

Беларусь мае шматвекавую гісторыю ды старадаўнюю самабытную культуру, якія мы здолелі захаваць, нягледзячы на шматлікія войны, што навалай праходзілі праз нашы мірныя землі. Цягам стагоддзяў мы пераадолелі шмат нягод, але не згубілі карані, унікальнае мастацтва, засталіся няскоранай нацыяй і нам ёсць чым ганарыцца. У першую чаргу — стойкасцю ды непахіснасцю абаронцаў, якія не шкадавалі жыццяў для таго, каб дзяржава квітнела і развівалася.

Мірнага неба і светлых дзён, дабра, плёну і здароўя кожнаму з вас!

Дзякуй вам і са святам напрадвесні, дарагія сябры!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

фотафакт

Міністр Барыс Святлоў і яго першы намеснік Ірына Дрыга.

Сустрэча з калектывам

Раман Матульскі (дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі), Эдуард Герасімовіч (кіраўнік Горкаўскага тэатра) і Павел Палякоў (дырэктар Тэатра імя Янкі Купалы).

18 лютага адбылася сустрэча калектыву рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" з кіраўніцтвам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама з дырэктарамі некаторых рэспубліканскіх устаноў культуры краіны. Прапануем некалькі здымкаў з гэтай сустрэчы ў сценах РВУ.

Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Слова ўзяў Алег Рыжкоў.

фотафакт

Развіртуалізацыя № 2

Сэнсавым цэнтрам "Развіртуалізацыі № 2" газеты "Культура", якая адбылася ў адсталічнай Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва, стаў майстар-клас мастачкі Ганны Гадзіравай. За досыць сціслы тэрмін нашы госці з розным узроўнем падрыхтоўкі ў маляванні паспелі стварыць цікавыя малюнкі. / **Фота Паўла ОСІПАВА**



У панядзелак у Магілёве стартуе рэспубліканская грамадска-культурная акцыя **"Мы беларусы — мірныя людзі"**.

Дзяжурны па нумары

Каб да суддзі не хадзіць…

Няхай даруе мне вакалістка мінскага гурта "Naka", творчасць якога я лічу годнай увагі, а саму Настассю Шпакоўскую — асобай, безумоўна, таленавітай і яркай, ды не буду пахаваны пад камянямі, якімі, відавочна, мяне закідаюць прадстаўнікі айчыннай рок-тусоўкі, бязмежна мною любімай, але ў той справе, пра якую зараз вам распавяду, я, падобна на тое, — на баку кампазітара Алега Молчана.

Алег КЛІМАЎ

Гісторыя пачалася летась, калі ў гонар 45-годдзя з часу заснавання ансамбля "Песняры" адзін з беларускіх музычных інтэрнэт-парталаў выпусціў альбом-трыб'ют легендарнаму калектыву. (Пра той праект "К" падрабязна пісала.) У рэліз павінна была ўвайсці і песня "Малітва" на вершы Янкі Купалы і музыку Алега Молчана ў выкананні гурта "Naka". Напэўна, многія з вас памятаюць кананічную версію пранізлівай, натхняльнай кампазіцыі, якая ўваходзіць у "залаты фонд" беларускага песеннага мастацтва.

"Naka" запісала свой варыянт трэка, які не спадабаўся не толькі мне — гэта было б амаль і не бядой, — але і аўтару музыкі Алегу Молчану. Зусім не апошні ў краіне музычны дзеяч, чыё імя ўжо дакладна ўвайшло ў аналы нашай культуры (хоць бы дзякуючы той самай вялікай песні), пачуўшы інтэрпрэтацыю, забараніў яе публічнае выкананне. На тое ён меў усе падставы, пра што і сведчыць Закон Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве і сумежных правах. У выніку кампазіцыя ў альбом не трапіла, але... была выканана гуртом "Naka" пад час канцэртнай прэзентацыі праекта.

Ведаючы прынцыповасць і педантычнасць Алега Уладзіміравіча ў пытаннях абароны аўтарскіх правоў, занадта доўга чакаць яго адназначнай рэакцыі на гэты "дэмарш" не давялося. Не выключана, што спачатку ішлі нейкія перамовы паміж тымі, хто правініўся (калектыў, арганізатары прэзентацыі, клуб), і аўтарам музыкі аб дасудовым урэгуляванні канфлікту, якія ў канчатковым выніку да вырашэння апошняга ў мірным ключы не прывялі. І вось 6 лютага Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь распачаў грамадзянскую справу па іску Алега Молчана да Настассі Шпакоўскай аб спагнанні кампенсацыі ў сувязі з парушэннем выключнага права на аб'ект аўтарскага права.

Пасля таго, як стала працаваць судовая машына, у музычнай супольнасці ўзнікла дыскусія аб нейкім маральным аспекце таго, што адбылося. Маўляў, з юрыдычнага пункта гледжання, ісціна, вядома ж, — на баку Молчана, але навошта масцітаму кампазітару патрабаваць грашовай "сатысфакцыі" з лідара гурта, які ну ніякім чынам не азалаціўся б з дапамогай "Малітвы", з фронтвумэн каманды зусім некамерцыйнай?

...У свой час і ў мяне з былым клавішнікам, аранжыроўшчыкам ды музычным кіраўніком "Песняроў" здарылася нязгода па творчых пытаннях. Але — нічога, пагаварылі (хай і горача), я папрасіў прабачэння за сапраўды праяўленую гарачнасць, прыйшлі да кансэнсусу, у цэлым — кожны застаўся пры ўласных поглядах. Гэта значыць, на мой погляд, чалавек гэты вельмі разумны, здольны чуць і прыслухоўвацца да чужога меркавання, якое можа разыходзіцца з ягоным меркаваннем. Так, як і ўсялякі творца, ён у чымсьці ўпарты, часам выбуховы і рэзкі, але з самапавагай. З ім можна размаўляць, не даводзіць працэс да рысы, перайшоўшы якую ходу назад не будзе. І, калі ўжо калізіі зайшлі далёка, то, мабыць, "каса" з "каменем" не дамовіліся…

Ведаеце, я шмат чую слоў ад нашых альтэрнатыўшчыкаў, якія, у прыватнасці, крыўдзяцца на "піратаў", што без дазволу распаўсюджваюць іх запісы. Пры гэтым самі артысты часцяком паводзяць сябе, як тыя ж "флібусцьеры", выконваючы на канцэртах каверы ды не пытаючыся ў аўтараў зыходных кампазіцый дазволу на тое. Дзіўнае такое далучэнне да цывілізаванага сусветнага музычнага кантэксту… Магчыма, разбіральніцтва стане прэцэдэнтам, і музыканты зразумеюць: парушыў закон — будзеш адказваць. Вось да суддзі не хадзіць!..

К

Ад перамены месца медалёў…

Піраты "расфарбавалі" класічны альбом "Песняроў" — і пасыл знік

Трыццаць гадоў таму Усесаюзная фірма грамзапісу "Мелодия" выпусціла ў свет вініл "Праз усю вайну" з запісам праграмы "Песняроў", прысвечанай 40-годдзю Перамогі. Сёння яго перавыдалі на тым жа вініле ў Расіі і, галоўнае, змянілі сэнсавы пасыл вокладкі альбома. Пры гэтым агульную канцэпцыю афармлення захавалі. Піраты (а так па факце і атрымліваецца, бо па дазвол да мастакоў ніхто не звяртаўся) "расфарбавалі" класічны вобраз. І ад перамены месца медалёў і візуальны вынік змяніўся.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Так трэба для вобраза

Двайны альбом 1984-га файна аздобілі два беларускія дызайнеры Павел Семчанка і Уладзімір Цярэнцьеў. Спадар Семчанка, які быў даволі блізка знаёмы з Уладзімірам Мулявіным, распавядае, што лідар "Песняроў" браў непасрэдны ўдзел у абмеркаванні канцэпцыі аздобы альбома. Менавіта ён вылучыў сярод прапанаваных эскізаў той, які лёг у аснову рэалізаванай распрацоўкі.

Павел Семчанка рабіў шрыфтавую частку аздобы, Уладзімір Цярэнцьеў — фатаграфічную. Рэч атрымалася густоўная, інфармацыйна насычаная і эстэтычна выразная. Гэта той выпадак, калі візуальны вобраз пасуе музычнаму. На вокладцы — чорна-белы фотаздымак узнагарод часоў Вялікай Айчыннай і надпіс "Через всю войну", зроблены адмысловым шрыфтам чырвонага колеру. Назва гурта на вокладцы прысутнічае, але ў вочы не кідаецца. Гэтым падкрэсліваецца, што ў дадзеным кантэксце галоўнае — тэма, а не выканаўца. Такая была савецкая традыцыя. Дыяганальнае размяшчэнне выяў і тэксту надае кампазіцыі дынамікі.

Прынцыпова тое, што ў аздобе першай старонкі вокладкі скарыстаны выявы менавіта салдацкіх узнагарод: ордэна Славы, медалёў "За адвагу", "За баявыя заслугі" і "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.". Фотаздымак чорна-белы — не ад жадання эканоміць на каляровым друку, а таму, што так трэба для вобраза. Названыя чыннікі прадстаўляюць вайну з непараднага боку (як у адной з песень праграмы: "Ведь смерть солдат необратима в букеты роз…"), служаць знакам франтавой, акопнай рэчаіснасці.

Перш чым маляваць, трэба думаць!

Дык вось, летась альбом "Праз усю вайну" быў перавыдадзены маскоўскім музычным выдавецтвам "Мирумир". Асабіста мне гэтая назва нічога не кажа. А ў Інтэрнэце высветліў, што і сапраўдныя меламаны пра тое выдавецтва не чулі. Паводле звестак, выкладзеных у Сеціва фанатамі "Песняроў", у "Мелодии", якая валодае аўтарскімі правамі на гэты дыск, "Мирумир" дазволу на перавыданне не пытаўся.

Тым не менш, гэтую падзею — выхад дыска — не абмінулі ўвагай прыхільнікі славутага гурта. Тое, што спадчына "Песняроў" — не забыта і запатрабавана на постсавецкай прасторы, што на ёй дагэтуль можна рабіць грошы, факт, безумоўна, станоўчы. А вось тое, як гэта зроблена, у якой абгортцы якасны культурны прадукт — песні "Песняроў", — пайшоў у народ, справа іншая. І тут паўстаюць пытанні…

Дызайнеры выдавецтва "Мирумир" хоць і захавалі некаторыя чыннікі аздобы альбома, вобразны лад змянілі цалкам: з брутальнага на гламурны. Чорна-белая выява ўзнагарод стала каляровай. З'явілася тое, чаго якраз і імкнуліся пазбегнуць дызайнеры беларускія, — параднасць. А далей — рэчы ўвогуле дзіўныя. У распрацоўцы нашых майстроў скарыстана выява ордэна Славы III ступені, пачатковай, а ў маскоўскай версіі — I ступені, вышэйшай. Так не можа быць, бо, паводле традыцыі савецкіх Узброеных Сіл, ордэн Славы I ступені насіўся разам з II і III, каб усе бачылі: ідзе, так бы мовіць, "поўны георгіеўскі кавалер" савецкага ўзору. Зразумела, што, з гламурнага гледзішча, золата (I ступень) прыгажэйшае за белы метал (III), але ўсё адно перш чым маляваць, трэба думаць. На гэтай тэзе дызайн і стаіць.

Медаль "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг." заменены на "За доблесную працу…", якім ганаравалі тых, хто, як прынята казаць, каваў Перамогу ў тыле. Гэта ўвогуле абсурд: не мог, паводле логікі, адзін чалавек (а падборка ўзнагарод сімвалізуе этапы баявой біяграфіі салдата) быць адначасова на фронце і ў тыле.

Я ўжо не кажу пра збіты маштаб, з-за чаго кампазіцыя страціла дынамічную ўраўнаважанасць, неахайнае выкарыстанне шрыфтавой кампазіцыі вокладкі беларускага арыгінала на ўнутранай старонцы, неадпаведны сэнсаваму кантэксту, стылізаваны "пад старыну" шрыфт слова "Песняры" на вокладцы…

Справа права

Мяркую, што справа тут не толькі ў недасведчанасці тых, хто працуе ў "Мирумир". Пераробкі не настолькі радыкальныя, каб аматары творчасці "Песняроў", гледзячы на новую версію, не згадалі б базавую. Такім чынам славуты брэнд асвятляе наватвор, працуе на яго рэкламу. Але пераробкі даюць падставу ў юрыдычным сэнсе трактаваць новую версію аздобы альбома як самастойную дызайнерскую распрацоўку. І — з'яўляецца аргумент супраць беларускіх дызайнераў, калі тыя нагадаюць пра сваё аўтарскае права.

Для тлумачэння — класіка з гісторыі аўтарскага права. Дзве фірмы з розных краін гандлявалі ў Афрыцы аднатыпнай прадукцыяй. І ў абедзвюх на абгортцы быў намаляваны вярблюд. Фірма, што прыйшла на рынак першай, абвінаваціла канкурэнта ў плагіяце. А ён адкруціўся ад штрафу, бо вярблюды — розныя: аднагорбы і двухгорбы. Неістотныя на першы погляд рэчы могуць мець вялікае значэнне, калі справа дойдзе да юрыдычнай спрэчкі…

Мы пацікавіліся ў Паўла Семчанкі і Уладзіміра Цярэнцьева, як яны ставяцца да згаданай сітуацыі, ці маюць намер абараняць свае аўтарскія правы? Абодва дызайнеры, нібыта ў адзін голас, адказалі, што займацца гэтай справай ім няма калі: працы шмат. Да таго ж не вераць яны, што здолеюць у Маскве чагосьці дамагчыся. Гэта ж трэба з юрыстамі кантактаваць, марнаваць час ды грошы… Не! Няма калі.

Дзмітрый Сурскі, старшыня Саюза дызайнераў, які ў свой час узнімаў пытанне абароненасці аўтарскіх правоў сваіх калег, лічыць, што ў гэтай сітуацыі дамагчыся справядлівасці, зрэшты, можна. Але ці будзе вынік варты намаганняў? Былі выпадкі, калі мастакі і дызайнеры, чые творы без іхняй згоды скарыстоўвалі на этыкетках, у рэкламе, адваёўвалі сабе грашовую кампенсацыю. Але тое ў Беларусі, а як будзе ў Маскве, сказаць цяжка.

Але — піяр…

Рысу ў гэтым сюжэце (а тэма — неабсяжная), лічы, падводзіць меркаванне мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры" Вячаслава Шарапава:

— Відаць, заняцца дадзеным пытаннем, прад'явіць нейкія прэтэнзіі згаданаму музычнаму выдавецтву маглі б спадкаемцы правоў на музыку і тэксты "Песняроў" — найперш сям'я Уладзіміра Мулявіна. Наконт жа той акалічнасці, што ў аздобе альбома брутальны вобраз вайны трансфармаваўся ў гламурны, дык гэта, я мяркую, не выпадковасць, а адлюстраванне пэўнай тэндэнцыі. Тут трэба ў корань глядзець. Сёння тыя або іншыя эпізоды ваеннай гісторыі, праявы ваеннай рэчаіснасці прадстаўляюць пакаленням, якія вайны не ведалі, не ў праўдзівым, брутальным абліччы, а ў прыхарошаным, гламурным. Есць на тое прычыны псіхалагічныя, сацыялагічныя, культурныя… Але гэта асобная тэма.

Сітуацыя вакол юрыдычных правоў на культурную спадчыну савецкай эпохі сёння даволі заблытаная, а гэта правакуе з'яўленне пірацкай прадукцыі. Вал пірацтва ў галіне культуры шматкроць перакрывае тое, што ствараецца ў адпаведнасці з законам, якасць чаго апошні гарантуе.

Можна сказаць, што мы ў Беларусі валодаем эталоннымі ўзорамі творчасці легендарнага ансамбля, рупімся пра захаванне ды ўмацаванне нацыянальнага брэнда, якім з'яўляюцца "Песняры", ахоўваем іх набыткі ад прафанацыі. Але трэба браць да ўвагі, што цікавасць да творчасці "Песняроў" сёння мае досыць вузкае кола меламанамаў з высокімі культурнымі запытамі. Каб выйсці на шырэйшую аўдыторыю, сённяшнім "Песнярам" трэба зрабіць нешта надзвычайнае, здзейсніць прарыў! Вось тады і будзе новы выбух цікавасці да ўсяго, што звязана з легендарным калектывам, у тым ліку да яго класічнай спадчыны. Тады ўжо мы будзем выбіраць, якая форма папулярызацыі нам пасуе, а якая — не. А пакуль любы піяр "Песняроў" нам на карысць…

■■■

У маёй журналісцкай практыцы быў выпадак, калі мне на вочы трапіў мой артыкул — крыху перароблены і пад чужым подпісам. Спачатку я, зразумела, быў абураны. Але, калі высветліў, што плагіят здзейсніў журналіст-пачатковец, вырашыў не рабіць шуму і нават у думках пашкадаваў маладога калегу: ён вымушаны сілкавацца чужымі думкамі. Можа, такой жа логікай кіруюцца і беларускія дызайнеры, даруючы маскоўскім калегам відавочнае парушэнне прафесійнай этыкі? Хаця, калі паглядзець з іншага боку, у іх скралі не толькі ідэі, але і грошы. Мяркую, спадары Семчанка і Цярэнцьеў, якія аздаблялі славуты песняроўскі альбом, што зараз выйшаў новым накладам, маюць законнае права на сваю долю ў гэтым маскоўскім праекце. Зрэшты, ім вырашаць, ці спрабаваць яе атрымаць… Толькі не стаў бы гэты прэцыдэнт тэндэнцыяй…

К

Учора ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі паказалі новую рэдакцыю спектакля **"Адвечная песня"**.

У чым "разбіраюцца ўсе"?

Што раздражняе ў сучаснай журналістыцы, дык гэта тое, што ёю можна займацца не выходзячы з кватэры. Радыё, тэлевізар і асабліва Інтэрнэт ператварылі ўсіх не проста ў сведкаў, знаўцаў, але і ў эрудытаў. Чалавек можа атрымаць доступ практычна да любой інфармацыі, якую дастаткова насыціць уласнымі эмоцыямі, і — вуаля: матэрыял гатовы! Асабліва гэта датычыцца так званай культурнай журналістыкі, дзе сустрэць прафесіянала — рэдкая ўдача…

ТЭКСТ

Ганна КІСЛІЦЫНА,
літаратурны крытык, супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Менавіта пра гэта думалася мне на сустрэчы рэдакцыі газеты "Культура" з чытачамі (яна ж — снежаньская "Развіртуалізацыя № 1 у Музеі Янкі Купалы"). Я даўно ведала імёны Барыса Крэпака, Пётры Васілеўскага, Надзеі Бунцэвіч, Яўгена Рагіна, Алега Клімава, Ільі Свірына… Не першы год чытаю іх тэксты, любуюся тым, як умеюць яны на старонках газеты ўзнімаць вострыя пытанні, застаючыся пры гэтым далікатнымі і аб'ектыўнымі, а цяпер вось пабачыла некаторых з іх на свае вочы. Кожны з іх гаварыў як быццам бы сваё і пра сваё, але на фоне іншых удзельнікаў сустрэчы яны вылучаліся агульнай ды непахіснай верай у тое, што газета робіцца не столькі для жыхароў сталіцы, колькі для тых, хто жыве ў невялікіх гарадах і вёсках. Трэба прызнаць, мяне гэта па-добраму ўразіла.

Перада мной аказаліся людзі, якія былі нібы пазбаўлены нейкіх амбіцый. Кожны раз, калі нехта з запрошаных гасцей прамаўляў слова "піяр", яны пачыналі махаць рукамі, быццам разганяючы нябачных надакучлівых мух… Затое з задавальненнем расказвалі, хто іх чытач, чаго ён хоча, на што спадзяецца. Яно і не дзіва: журналісты "Культуры" — ці не апошнія прафесіяналы, якія пішуць матэрыялы, абапіраючыся на рэальныя сустрэчы ды канкрэтныя падзеі! Шчыра кажучы, не ўяўляю, хто лепш за іх арыентуецца ў культурным жыцці краіны.

Я глядзела на іх і думала: а што, уласна, трымае іх у газеце? Працаваць тут даводзіцца шмат, як і ездзіць. і пры гэтым атрымліваць зусім не шыкоўны заробак бюджэтніка… Не сакрэт, што цяпер ганарары буйных парталаў нашмат большыя, чым у дзяржаўнай газеце. І чытачоў там у разы больш. Да таго ж ёсць магчымасць пісаць пад сотнямі псеўданімаў, выпускаючы ў дзень па дзясятку "інфармашак", абапіраючыся выключна на прэс-рэлізы. Нашто глядзець, аналізаваць, губляць час?

> "Працаваць у газеце даводзіцца шмат, як і ездзіць, і пры гэтым атрымліваць зусім не шыкоўны заробак бюджэтніка… Цяпер ганарары буйных парталаў нашмат большыя, чым у дзяржаўнай газеце. І чытачоў там у разы больш. Да таго ж ёсць магчымасць пісаць пад сотнямі псеўданімаў, выпускаючы ў дзень па дзясятку "інфармашак", абапіраючыся выключна на прэс-рэлізы. **Нашто глядзець, аналізаваць, губляць час?**"

Хочацца спадзявацца, такая пошасць датычыцца толькі сферы культуры, у якой, як і ў літаратуры, "разбіраюцца ўсе"! Пры гэтым, як справядліва адзначылі на сустрэчы з рэдакцыяй, у паловы сённяшніх тэлежурналістаў, якія распавядаюць пра культуру, праблема з ведамі выяўляецца ўжо хаця б у тым, што яны не ведаюць значэння элементарных слоў, не кажучы ўжо пра вымаўленне замежных імёнаў, якія павінны быць знаёмыя любому больш-менш адукаванаму чалавеку. Між тым, не раз бачыла, як людзі без аўтарытэту ды імені выстаўляюць у сацыяльных сетках свае рэзюмэ: "Пайду начальнікам, зарплата — ад 1000 у.а.". І самае смешнае, што яны знаходзяць працу, бо сучасныя рэдактары медыя-пляцовак любяць маладых-амбітных…

Нядаўна на сайце Mediakritika.by давялося прачытаць, што рэдактары "топавых беларускіх медыя чакаюць ад сваіх патэнцыйных працаўнікоў". І з сумам зразумела, што менш за ўсё рэдактараў цікавяць прафесійныя веды… Пацвердзілася і маё даўняе падазрэнне, што журналістаў цяпер знаходзяць не на падставе нейкіх цікавых апублікаваных матэрыялаў, а праз знаёмых ці сацыяльныя сеткі. Чытала прызнанні рэдактараў і думала пра тое, што цяпер мне больш зразумелыя паводзіны некаторых маладых журналістаў, якія рассыпаюцца ў кампліментах у сацыяльных сетках перад кожным, хто мае больш-менш адказную пасаду ў СМІ. Аказваецца, такая палітыка "аблізвання" рэальна спрацоўвае! Тым больш, што тым, хто ездзіць па камандзіроўках ды яшчэ і сур'ёзна падыходзіць да апрацоўкі і падачы матэрыялу, няма часу на "акучванне" патэнцыйных працадаўцаў. Прафесіяналы ніколі не будуць хваліцца, што пішуць па дзесяць матэрыялаў у дзень. Яны працуюць удумліва і адказна… Аднак наколькі іх хопіць, гэтых місіянераў культуры?..

Вось каб без паблажлівасці…

Ёсць у мяне думкі з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага. Мо крыху незвычайна чуць развагі пра мову ад мяне, які не быў "заўважаны" ў яе актыўным выкарыстанні. І ўсё ж...

меркаванне

Уладзіслаў МІСЕВІЧ,
заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь

У вагоне цягніка "Масква — Мінск" снежаньскім днём 1962 года я пабойваўся, што не зразумею беларускай мовы, але хутка разабраўся: менавіта на гэтай мове, па сутнасці, і размаўляла мая арэнбургская бабуля, ураджэнка беларускіх краёў. Але ўдзельнікаў "Песняроў" так ці інакш у Беларусі папракалі (прынамсі, гуманітарыі) у індыферэнтнасці да беларускай мовы па-за сцэнай. Так, у маім выпадку, напэўна, можна казаць хіба аб уяўленні пра яе асаблівасці. А ці змог бы я сёння (ці раней) вывучыць беларускую мову? Мяркую, свабодна загаварыў бы праз колькі дзён практыкі. Але што павінна стаць стымулам? Зручна размаўляць на той мове, на якой думаеш, усведамляючы, калі, дзе і з кім тое рабіць. З часам моўнае пытанне я вырашыў для сябе так. У Нарвегіі або Швецыі мне дастаткова англійскай мовы для побыту і працы. А на якой мове падаецца большасць песень на "Еўрабачанне"? А ўдзельнікі шоу кшталту расійскага "Голасу" з бліскучымі ўзорамі сусветнай музыкі ў асноўным на якой мове працуюць? Паўсюль — англійская ў поп-культуры! Калі б беларуская мова заняла хоць частку такой прасторы... Але яе там няма — з гістарычных прычын.

Безумоўна, "Песняры" стварылі каштоўнасць менавіта ў прасторы беларускай мовы, самі адбыліся і дзякуючы мове, на якой спявалі. Але гэта ўсё ж такі першы крок, хаця не кожны крок у культуры захоплівае жыхароў адной шостай часткі сушы. Ды я пастаўлю сустрэчнае пытанне пра беларускую мову на адрас тых, хто агучвае праблему яе выкарыстання ў нашым грамадстве. Што сёння на ёй ствараецца ў навуцы, культуры, мастацтве такога, каб зацікавіць англічаніна, кітайца, немца? І ў чым прычына такога стану рэчаў? У нас саміх. Бо мы нярэдка рэагуем на беларускую мову, скажам так, з паблажлівасцю. Але ж трэба, каб яна гучала нароўні з іншымі мовамі з вуснаў кожнага беларуса, дзе б той ні знаходзіўся.

Вось я сабраў неяк на дыск новыя беларускамоўныя песні ансамбля "Беларускія песняры" (той жа джазавы "Ручэй" на вершы Якуба Коласа) і выправіўся па радыёстанцыях. Мне наўпрост казалі: нам гэта не патрэбна. Вось і прасоўванне беларускай мовы і песні на FM-станцыях… Цікава, што з такім жа стаўленнем сутыкнуўся наш Аляксандр Кацікаў, калі выдаў альбом "Жывём!" на вершы Ларысы Геніюш. Прынёс ён у адну з беларускамоўных арганізацый паўсотні дыскаў, каб бясплатна распаўсюдзілі сярод "неабыякавых", зацікаўленых людзей. Але клерк нават не прыняў дыскі: маўляў, іншых спраў хапае...

Праўда, у адказ на мае развагі лагічна пачуць заключэнне кагосьці з чытачоў: вось вы, музыканты, а менавіта — музыканты "Песняроў", "Беларускіх песняроў", і павінны ствараць, несці гэтыя каштоўнасці, у тым ліку праз мову. Я ўпэўнены: абодва ансамблі зрабілі ўсё, што маглі. На піку вядомасці "Песняроў" можна было палову Савецкага Саюза навучыць беларускай мове! Але ў самой рэспубліцы, нават у "залатыя" гады "Песняроў", усплёск музычнай папулярнасці, па сутнасці, так і не прывёў да маштабнай цікавасці саміх жыхароў да мовы. Момант упушчаны, і новага такога на сваім веку і не згадаю...

Так, не гаворым мы па-беларуску. Вініцца тут няма ў чым, але і парадокс відавочны. Праўда — з усёй тымі ж гістарычнымі абставінамі. А спрабаваць змяніць штосьці ў такой сітуацыі — марная трата часу, якога, па сцэнічных мерках, у нас не так ужо і шмат. Але для мяне і сёння прыклад няўдачы ў "заляцанні" з мовай — "песняроўская" песня на вершы Валянціна Тараса "Дзве мовы ў мяне" з макаранічнымі радкамі: па-руску і па-беларуску. Пры ўсёй музычнай і вакальнай прыгажосці выдатнага твора, для слухача спалучэнне аказалася неарганічным.

На сольным канцэрце "Беларускіх песняроў" з аркестрам у мінскім Палацы Рэспублікі з усіх выкананых кампазіцый вялікая частка (па асабістым выбары маладога дырыжора Аляксандра Ліпніцкага, дарэчы, і без якога-небудзь дыктату "зверху" або з нашага боку) складалася з нумароў перыяду апошніх пятнаццаці гадоў. І нават тут палова была — беларускамоўныя песні. А цяперашняя сітуацыя, у тым ліку — патрабаванні пэўнай часткі публікі, схіляе ансамбль да старога "песняроўскага" і праверанага "постпесняроўскага" рэпертуару, дзе такіх работ у суме будзе менш. Проста ўжо не маем адпушчанага нам часу на сцэне, каб змяніць сітуацыю. Хоць у рэпертуар ансамбля беларускамоўных песень прапануецца больш, ды не ўсе яны ўваходзяць у праграму выступленняў. Таму гэтае ўмоўнае "менш", што ацэньваецца па запісах і канцэртах, — не нашмат прынцыповае. Больш сумленна казаць не пра мову, а пра мастацкую вартасць кампазіцыі. Вось вам і баланс, вось і спосаб адбору, захаваны з "песняроўскіх" часоў.

Мы настолькі ж сур'ёзна ставімся да беларускай тэмы, як і раней, у "Песнярах", а можа, больш сур'ёзна. Таму, што нас ацэньваюць ужо па крыху іншых крытэрыях, сярод якіх, на жаль, і далёка не музычныя. Таму, што самі даследавалі гэтае пытанне, разважалі, шукалі шляхі. І такія падыходы прыносяць плён. Да прыкладу, маскоўская публіка, як гэта ні дзіўна, просіць выконваць песні нацыянальнага рэпертуару, што вызначае ансамблі ("Песняры" і "Беларускія песняры"). "І — больш на беларускай мове!" — дадаюць арганізатары канцэртаў у суседзяў…

Занатаваў Сяргей ТРАФІЛАЎ

Пра спазнанне сябе

Любы час нельга ахарактарызаваць адназначна, нават пражыты табой, пра які, здаецца, усё вядома. Ты так думаеш, а ён падкідвае новыя закавыкі. І змяняе цябе, прымушае задумацца, паглядзець інакш на прадметы, падзеі... На цябе самога, урэшце. І ёсць тут рацыя, інакш — стоп, машына, прыехалі...

меркаванне

Надзея ГАРКУНОВА,
кінарэжысёр

Думаецца, што кожны час дае чалавеку магчымасці для ажыццяўлення мары і для самарэалізацыі, а таму добры па-свойму. Мы ж былі выхаваны на пераадоленні вечных "нельга", "непрыстойна": Булгакава чыталі ў самвыдаце, рэпрадукцыі Далі гарталі пры зачыненых дзвярах... А прайшлі гады — і глядзіш на ўсё праз іншыя акуляры...

Але чаму тады зараз творчыя людзі ўсё часцей кажуць пра тое, што яны не могуць рэалізавацца? Урэшце, гэта гучала, я думаю, ва ўсе часы, бо па-сапраўднаму творчы чалавек, які думае, ніколі не акажацца задаволены сабой, і бурчанне — адзін са складнікаў ягонай натуры. А эксперыменту заўсёды ёсць час.

Ну, пачыналі ж мы відэаавангард у старой літдраме (літаратурна-драматычнай рэдакцыі) на Беларускім тэлебачанні, калі галоўныя рэдактары палохалі і літаральна вытраўлівалі дустам усё ім не зразумелае... Але ж мы выжылі! Да гэтага часу ў фондах ляжаць мае работы на вершы ды апавяданні Дзмітрыя Строцава. І гэта тады, калі вершы з экрана чыталі толькі з выражэннем... Тады за яго "вершаспеў" ды шапку валасоў на галаве мяне пясочылі калегі на лятучцы, а сёння яны ж у таго самага Дзімы ў сябрах на Фэйсбуку. Мяне гэта вельмі забаўляе. Неяк бачыла фрагменты сваёй "Пралескі" — тэленавелы па навеле ж Строцава. Яго і сёння некаторыя дзеячы спрабуюць выкарыстоўваць ды прысвоіць сабе, тыражуюць. І гэта, па шчырасці, замілоўвае. Значыць, калісьці нешта атрымалася… Але калі ў чалавека і зайшло далёка з немагчымасцю самарэалізацыі, я параіла б спыніцца ды зазірнуць у сябе, нешта змяніць ва ўласнай натуры. Папрацаваць над сабой — гэта як перагледзець гардэроб у перапоўненай шафе, калі "няма чаго апрануць", паставіцца да сябе з гумарам, адхіліцца ад "забранзавеласці" натуры...

Ну а калі сур'ёзна, дык неабходна навучыцца кіраваць сваімі амбіцыямі. Без іх ніяк, але і той выпадак, калі яны завышаны, — гэта пачатак хваробы саманезадавальнення. Неабходна вучыцца аб'ектыўна ацэньваць сябе, перастаць слухаць пустую пахвальбу ды спыніць удзел у міжсабойчыках. Лепш адасобіцца і паглядзець на ўсё збоку. Гэта сапраўды выцвярэжвае. Ва ўсім мусіць існаваць мера, хуткіх вынікаў не бывае.

Разам з тым я не думаю, што на кіно моцна ўплывае час. Кіно па-ранейшаму робяць людзі, а значыць, яно калі і змяняецца, то — разам з намі, з нашымі жыццём ды падзеямі, якія атачаюць і хвалююць. Ці — не хвалююць аніяк. Я зараз не маю на ўвазе ўкід новых тэхналогій. Тое, што яны з'яўляюцца з хуткасцю святла, — гэта выдатна. Але мне не хапае мастацкасці ў кіно, і калі яе здараецца ўбачыць — не так страшна становіцца за заўтрашні дзень. Асабліва ў сувязі з тэндэнцыяй у аўтарскім кіно здымаць па прынцыпе "што бачу — пра тое і спяваю". Гэта мяне не задавальняе. Мне вельмі шкада, што менавіта гэткае кіно карыстаецца цяпер попытам ды папулярнасцю і атрымлівае ацэнку крытыкаў. На такую пошасць стала пакутаваць і мастацкае кіно. Калькіраванне рэчаіснасці — гэта зусім не годная доля для мастацтва.

А яшчэ, на мой погляд, нас псуе тое, што мы пачынаем ставіць сабе ў заслугу тое, што цяпер беларуская пляцоўка з'яўляецца для многіх месцам постпродакшна. На гэтым цяпер шматлікія прадзюсары пачынаюць спекуляваць. Вымываецца пачуццё самадастатковасці ў маладых. Вось у гэтым я бачу небяспеку — у страце аблічча беларускага кіно, якое так і не можа такім, сфарміраваным ды пазнавальным, пахваліцца. А школа ж была, зачын меўся... Ды нешта ўсё разгубілася. Не даражылі, думалі, запас акажацца вечным. Ды не, крыніцы вечнымі бываюць толькі ў казках…

Занатавала Кацярына ЛЯОНАВА

Персанальная выстаўка Аляксандры Бернштэйн **"Альбомы"** працуе ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.

Эканамічныя цяжкасці, якія ахінулі наш рэгіён планеты, безумоўна, даюцца ў знакі і ў галіне культуры. Аднак дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, народны артыст краіны, прафесар Міхаіл ФІНБЕРГ не падзяляе песімістычных настрояў. Наадварот, ён перакананы, што крызіс стане тым выпрабаваннем, якое загартоўвае і аддзяляе зерне ад пустазелля.

Гэты год для аркестра багаты на юбілеі. Самы важны з іх — 200-ы (!) па ліку фестываль у малых гарадах, які пройдзе ўжо неўзабаве. А найстарэйшаму з такіх фэстаў — "Музы Нясвіжа" — сёлета споўніцца 20! Але ж мы гутарым не пра святы, а перадусім пра творчую "кухню" легендарнага калектыву.

Ілья СВІРЫН

Антыкрызісны менеджмент



Фота Юрыя ІВАНОВА

Досвед Міхаіла Фінберга

— Бачу ў вашым кабінеце графік імпрэз на гэты год. Нешта незаўважна, каб ён хоць трохі скараціўся параўнальна з папярэднім...

— Дык ён і не скараціўся. Усе тыя канцэрты, фэсты, праграмы, якія мы планавалі яшчэ год-паўтара таму (а плануемся мы заўсёды загадзя, бо гэта — залог поспеху), сёлета абавязкова адбудуцца. І як іначай, калі іх ужо чакае слухач? На ягоным стаўленні да нашага калектыву крызіс, на шчасце, ніяк не адбіўся. Год яшчэ толькі пачаўся, а мы ўжо можам пахваліцца нядрэннымі фінансавымі паказчыкамі. Прыкладам, на сакавік білеты на сем нашых канцэртаў поўнасцю распрададзены, прытым што цэны на іх часам дасягаюць 200 тысяч рублёў. Ну а ў тым, што джазавы фестываль збярэ аншлаг, ніхто нават і не сумняваўся.

На маю думку, цяжкасці, якія мы цяпер перажываем, — гэта каласальны стымул для многіх кіраўнікоў у сферы культуры перагледзець свае падыходы да справы, да такіх яе аспектаў, як трата бюджэтных сродкаў і заробак уласных. Млявай працы ў "вакуум", што не прыносіць ніякай аддачы, быць не павінна.

— Але ж ёсць тыя фактары, якія, на жаль, не залежаць ад кіраўнікоў...

— Угэўнены: многія праблемы ўзнікаюць ад недапрацоўкі канкрэтных людзей, ад іх няўмення эфектыўна дзейнічаць у тых або іншых варунках. Калі лідар будзе па-сапраўднаму перажываць за свой калектыў, ён здолее дасягнуць належных вынікаў. Але калі разлічваць толькі на чужы глузд ды счакаць загадаў "зверху" — нічога не будзе, усё спыніцца.

Яшчэ адзін вечны закон: пастаянна вучыцца. Так, усе мы даўно атрымалі дыпломы, і многія гэтым вельмі ганарацца. Я вось, напрыклад, увогуле прафесар — між іншым, адзіны на эстраднай сцэне. І што, гэта нагода, каб высока задзерці нос? Ды ні ў якім разе! Сістэматычна засвойваць новыя веды трэба пастаянна, як і працаваць над сабой. Калі ты думаеш, што ўжо ўсё ўмееш, — гэта дакладная прыкмета твайго асабістага крызісу. А ён куды страшнейшы за нейкі эканамічны…

Так, многія з кіраўнікоў у галіне культуры — людзі творчыя. Але хоцькі-няхоцькі яны ўсё адно мусяць засвойваць і эканамічныя законы, і тую ж бухгалтэрыю. Бо іначай нічога ў іх не атрымаецца. Кожны калектыў — гэта прадпрыемства, хай сабе і творчага кшталту. Адпаведна, яго трэба ацэньваць і па эканамічных паказчыках. А толькі патрабаваць фінансавання "зверху" — гэта, як мне падаецца, паразітычнае стаўленне...

— Але ці не існуе небяспекі, што ўвага да эканамічных пытанняў прывядзе да "перакосу" не на карысць творчасці?

— Вядома, такая небяспека ёсць. Вось, напрыклад... Як у нас ацэньваюць фінансавую дзейнасць? Дзяржава выдаткавала дзесяць рублёў — пяць ты патраціў, а пяць засталіся. Значыць, малайчына! Але ж задача творчых калектываў — не эканоміць бюджэтныя сродкі, а асвойваць іх з максімальнай эфектыўнасцю для ўсяго грамадства. Зразумела, той, хто менш працуе, той мае і меншыя выдаткі, адпаведна — і лепшыя эканамічныя паказчыкі ды большыя прэміі. Але ці аптымальная гэтая схема, ці правільна расстаўлены тут акцэнты?..

— У той самы час многія перакананы, што вашаму калектыву дастаецца ад дзяржавы значна больш выгод, чым іншым...

— Сапраўды, дзяржаве мы вельмі ўдзячныя за пастаянную ды эфектыўную падтрымку, за няспынную ўвагу і павагу да нашай дзейнасці. Але... Агучу вам толькі адну лічбу (тыя "многія", якіх вы згадалі, пэўна, яе не ведаюць): 65% ад нашага бюджэту (а ён, як вы разумееце, і сапраўды немаленькі) мы зарабляем самі. Шэсцьдзясят пяць працэнтаў! Далей, мне здаецца, можна нічога ўжо і не казаць. Што да ўмоў... Мяркуйце самі: ад пачатку гісторыі калектыву мы працуем у нейкіх паўпадвальных памяшканнях і нават не марым пра тыя шыкоўныя кабінеты ды студыі, якія маюць іншыя аркестры. Але, заўважце, не плачамся з той нагоды ў камізэльку.

— Такія фінансавыя паказчыкі сапраўды здзіўляюць, калі ўлічыць, якое месца ў дзейнасці аркестра займаюць даследчыцкія і папулярызатарскія пачыны, а яны ж, напэўна, грошай не прыносяць...

— Так, не прыносяць! Робячы праграму з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння Барыса Райскага, мы не ставілі сабе за мэту нешта зарабіць. Перадусім гэта даніна павагі да легендарнага музыканта, у аркестры якога ў гады маладосці давялося папрацаваць і мне. На жаль, яго імя сёння прызабыта, і я нават не ведаю, ці згадае хтосьці пра ягоны юбілей, апрача нас…

— А вось тут у вашым графіку насупраць адной даты пазначана "СПА". Гэта што, сярод аркестрантаў пройдуць вучэнні па супрацьпаветранай абароне?

— Ды не, якія вучэнні… Мы змагаемся за чысціню паветра нашай Бацькаўшчыны сваімі метадамі... А тут маецца на ўвазе адзін са шматлікіх шэфскіх канцэртаў. Аркестр ладзіць іх 27 гадоў запар, заязджаючы проста ў вайсковыя часткі той жа СПА. Апякуемся такім чынам і іншымі абаронцамі Айчыны, а таксама — прадпрыемствамі, сельскімі гаспадаркамі... І, падкрэслю, усё гэта — на філантрапічных пачатках! Але трэба ўмець спалучаць некамерцыйныя праекты з тымі відамі дзейнасці, якія прыносяць прыбытак. Бо як іначай у цяперашніх варунках? Чакаць, што нехта "зверху" прыйдзе і ўсё дасць? Ізноў жа, гэта — паразітызм...

— А ці лёгка зарабляць грошы "білетнымі" канцэртамі?

— Не сказаў бы. Вось глядзіце: мы прыязджаем з канцэртам у горад N, а там адначасова гастралюе купа выканаўцаў з суседняй краіны… Рыхтуем сур'ёзныя праграмы, заснаваныя менавіта на нацыянальным матэрыяле, а сёй-той прыязджае да нас проста халтурыць — і пры гэтым здымае "вяршкі"...

— Але ж гэта — звычайны рынак, які ў наш век не магчымы без канкурэнцыі...

— Я, вядома, не супраць канкурэнцыі. Аднак... умовы ў нас, на жаль, няроўныя. Калі тое ж расійскае тэлебачанне раскручвае сваіх зорак, дык пра айчыннае гэтага, на жаль, не скажаш. Здараецца, я прашу кагосьці з тэлевізійшчыкаў: вы ўжо, калі ласка, хоць паведамце гледачам, што Міхаіл Якаўлевіч Фінберг яшчэ не памёр... А каб выпусціць у эфір рэкламу той або іншай нашай падзеі, трэба заплаціць такія грошы, што за галаву хапаешся! І ніякіх паніжальных каэфіцыентаў ці іншых прэферэнцый!

На Беларусі працуюць філармоніі ды іншыя дзяржаўныя канцэртныя арганізацыі, але чаму ж тады яны запрашаюць з гастролямі пераважна замежных выканаўцаў? Пры гэтай схеме мы банальна субсідзіруем эканоміку іншых краін. Хаця ёсць жа і ў нашым краі выдатныя, праслаўленыя калектывы — не адзін і не два... Але ж пакуль тут усё — як у той байцы пра лебедзя, рака ды шчупака. А каб мы працавалі супольна, дык я б ведаў, што калі еду ў пэўны горад, мяне ўжо там сустракаюць…

— А што, не сустракаюць?

— Сустракае нас зазвычай удзячная публіка. А каб было наладжана ўзаемадзеянне паміж калектывамі, арганізатарамі канцэртаў, тымі ж сродкамі масавай інфармацыі, узаемавыгадны для ўсіх нас вынік, я ўгэўнены, не прымусіў бы сябе чакаць і сумнае пытанне "Як выжыць?" адпала б…

— У той самы час самі тэлевізійшчыкі сцвярджаюць: папулярнасць многіх беларускіх артыстаў наўпрост залежыць выключна ад "блакітнай скрыні". А як толькі іх паказваюць радзей, яны адразу ж знікаюць і "з памяці народнай"...

— Яно і сапраўды так. У нас многія артысты не маюць нават паўнавартаснай канцэртнай праграмы. Зрабіў пару песенек — і хай іх круцяць па ўсіх каналах з ранку да вечара. А больш і паказаць няма чаго…

— А ці няма ў вас праблем з кадрамі? Бо ратацыя ў вялікім калектыве — непазбежная…

— Пакуль няма, але — у хуткім часе будуць. Конкурс у Акадэмію музыкі ды профільныя вучылішчы сёння пакідае жадаць лепшага, а па многіх спецыяльнасцях навучанне, наколькі мне вядома, увогуле ўжо не вядзецца. І калі тыя ручаінкі перасохнуць... Праз нейкі час гэта моцна дасца нам у знакі.

Зусім нядаўна ў рамках фестывалю ў Заслаўі (ужо пятнаццатага, дарэчы, па ліку) мы зладзілі конкурс навучэнцаў музычных школ па спецыяльнасці "Духавыя інструменты". Вынік мяне папраўдзе здзівіў: паўтара дзясятка зусім юных саксафаністаў з усёй Міншчыны! І вось пытанне: чаму на гэты конкурс не прыехалі прадстаўнікі нашых навучальных устаноў, каб паслухаць таленавітую дзятву ды ўжо ведаць, што ў тым або іншым раёне вучыцца таленавіты хлопчык ці дзяўчынка? Новую змену музыкантаў трэба рыхтаваць змалку і думаць пра гэта ўжо зараз. Але, на жаль, узаемадзеяння паміж намі ды тымі ж адукацыйнымі ўстановамі пакуль амаль няма. І, пэўна, не мая справа яго наладжваць…

— Ваш аркестр — "кузня кадраў", дзе моладзь пачынае сваю кар'еру, а потым выпраўляецца ў вольнае плаванне… Ці не крыўдна?

— Ні каліва не крыўдна! Сапраўды, многія з тых, хто за апошнія гады "засвяціўся" на нашай сцэне — тыя ж Дзмітрый Калдун, Тэа, іншыя паспяховыя ўдзельнікі буйных міжнародных конкурсаў, — без перабольшвання, "выпускнікі" аркестра. Лічу гэта немалаважным фактарам, што сведчыць пра нашы заслугі. Бо як ацэньваць, якой меркай мераць дзейнасць таго ж выкладчыка музычных дысцыплін? Думаю, цалкам дарэчы было б яго спытаць, колькі ён за час сваёй працы падрыхтаваў лаўрэатаў міжнародных конкурсаў. І калі вынік нулявы, можна задацца заканамерным пытаннем...

— Урэшце, закрану і такую балючую цяпер тэму, як заробкі...

— Аклады ў нас вельмі маленькія, але асноўная частка заробку — гэта менавіта прэміі. У свой час такую формулу падтрымаў Прэзідэнт краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. На жаль, большасць калектываў па ёй не працуе, бо ў такім выпадку трэба, каб быў прыбытак, а атрымаць яго вельмі складана.

І дарэчы... Не думайце, што ў іншых краінах музыканты жывуць бы ў раі. Наколькі мне вядома, паўсюль ёсць свае цяжкасці. Лічу, гэта нармальна, бо без пераадольвання цяжкасцей не будзе і высокага творчага выніку…

К

Паралелі: Польшча

Полька Агата Этмановіч — адзін з запатрабаваных спецыялістаў у сферы еўрапейскай культуры. За яе плячыма работа ў Міністэрстве культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы, у Савеце Еўропы па праграме "Culture". І сёння яна цесна ўзаемадзейнічае з гэтай сферай. Беларускай публіцы Агата Этмановіч, якая наведала мінскую "Школу супергерояў" пры падтрымцы Польскага інстытута, распавяла пра досвед пераўтварэння заводскіх памяшканняў у паўнавартасныя арт-пляцоўкі на сваёй радзіме.

Аліна САЎЧАНКА

Заводскі варыянт

— Распавяду пра стварэнне першых культурных цэнтраў новага тыпу ў Польшчы. Нейкі — у добрым сэнсе! — вар'ят, кампазітар вырашыў, гледзячы штодня на адзін з закінутых заводаў Варшавы, што хоча тварыць тут. Набыццё гмаху запатрабавала каласальных інвестыцый — ён прадаў абсалютна ўсё, каб атрымаць будынак. Да сёння не вядома, ці вярнуліся яму грошы. І — пачалося аднаўленне вялізнага заводскага будынка. На дзіва, многія прыйшлі туды і пабачылі сябе ў той прасторы. А цяпер праект "Fabryka Trzciny" налічвае больш як дзве тысячы ўдзельнікаў.

І я да яго далучылася па першым часе. Мы з асаблівым трапятаннем падышлі да рамонту і афармлення прасторы. Многія дэталі глядзяцца як дызайнерскія рашэнні, хаця насамрэч яны выконваюць пэўныя функцыі.

Агата Этмановіч пад час лекцыі ў Музеі Заіра Азгура.

Шчыра кажучы, каманда гэтая аказалася лепшай з тых, з якімі даводзілася працаваць: вельмі зладжаная ды таленавітая. Нашай перавагай было валоданне кожным з нас рознымі ведамі і здольнасцямі.

А вось досвед прамысловага горада Лодзь. Некалькі чалавек з дзяржаўнай дапамогай (у першым выпадку гаворка ішла пра цалкам прыватны праект) сабраліся і стварылі муніцыпальную ўстанову — таксама на аснове заводскага будынка. Такія велізарныя памяшканні трэба было тэрмінова ўключаць у якія-небудзь маштабныя праекты. Так, мы правялі ў Лодзі самы папулярны на сёння ў Польшчы Фестываль дызайнераў, а ў яго рамках — і Тыдзень моды. Гэта паспрыяла раскрутцы месца і павелічэнню пазнавальнасці горада.

Мы заўважылі, што людзі лёгка дзеляць сябе на творчыя групы ды займаюцца сваімі распрацоўкамі, далучаючы да працэсу і мясцовых жыхароў. Колькі гадоў таму ўзнімалася нават пытанне аб азеляненні некаторых тэрыторый горада, чым мы ўсе ахвотна і заняліся. Жыхары, у сваю чаргу, часта дапамагаюць нам з размяшчэннем прыезджых гасцей: уявіце, як эканомяцца сродкі, калі не трэба карыстацца гатэлем!

Усё гэта выдатна, але мы ўвесь час мелі патрэбу ў грошах, таму было вырашана здаваць частку памяшканняў для офісаў, а таксама для маладых творцаў і бізнесменаў: дызайнераў, швачак, праграмістаў, рамеснікаў... Такім чынам і быў створаны "арт-інкубатар" у адным з карпусоў вялізнага завода.

К

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы запусціў новую версію **афіцыйнага сайта**, пашырыўшы блок мультымедыя.

Вам рэжуць слых тэксты асобных песень некаторых нашых артыстаў? І нам таксама. З "асобнымі" нават пагарачыліся: у наш час трэба здолець пачуць такую кампазіцыю, словы якой не выклічуць у вас жадання знайсці нумар тэлефона выканаўцы і выказаць яму ўсё, што думаеце пра яго творчасць — у негатыўным ключы. Гэта датычыцца і рускамоўных твораў, і, на яшчэ большы жаль, беларускамоўных. Таму гаворка ў дадзеным матэрыяле пойдзе пра апошнюю катэгорыю. Многія спевакі ды спявачкі сёння самі пішуць сабе тэксты. З розных прычын. І таму, што няма патрэбы дзяліцца аўтарскімі адлічэннямі, і таму, што адчулі ў сабе дар рыфмаваць, і таму, што не знаходзяць вершы, якія задавальняюць іх. Ёсць і такія, хто ў якасці суаўтараў "запрашае да супрацоўніцтва" класікаў беларускай паэзіі. "К" звярнулася да вядомых кампазітараў і музыкантаў — аўтараў музыкі розных жанраў з просьбай даць ацэнку айчыннаму песеннаму мастацтву ў яго тэкставай частцы ды распавесці пра тое, якому вершаванаму матэрыялу яны аддаюць перавагу.

Алег КЛІМАЎ, Надзея БУНЦЭВІЧ

Ля-ля-фэ?..

Дыскутуем пра цяперашнія беларускія песенныя тэксты. Частка I

Калі няма паэта, і калі ён ёсць...

— Пра стан цяперашніх песенных тэкстаў лепш маўчаць — журботна, тужліва, як на пахаванні, — адразу кажа Эдуард Зарыцкі, народны артыст Беларусі, намеснік старшыні Беларускага саюза кампазітараў. — Не, я не супраць таго, каб адораны чалавек сам пісаў музыку, сам складаў тэксты, сам рабіў аранжыроўку (хаця тут часцей звяртаюцца да прафесіяналаў), сам спяваў. Але ў рэальнасці творцаў, здольных рабіць усё гэта на высокім мастацкім узроўні, не так і шмат: таго або іншага складніка (і часта найперш паэтычнага), здараецца, не стае. Вось і атрымліваецца тое, што я называю словам "самапал" — гэткі набор слоў пад пэўны рытм. Шукаць там сэнс, прабачце за каламбур, не мае сэнсу. Таму і пераважаюць гэткія "аднаразовыя" кампазіцыі, усё прызначэнне якіх — апраўдваць так званы фармат, адпавядаць яму. Але што такое гэты самы "песенны фармат"? Устойлівага азначэння, якое можна было б змясціць у энцыклапедыі, яму няма. Прапаную сваё ўласнае — аўтарскае, калі можна так сказаць: фармат — гэта музычная "пракладка" паміж двума рэкламнымі блокамі. Хіба ж не так? Але такі шлях развіцця песеннага жанру — тупіковы.

Мне могуць запярэчыць: маўляў, зірніце на замежную эстраду. Ды не на расійскую, а на заходнюю — там таксама тэксты бываюць не самыя "высокапаэтычныя". І слухаючы замежныя кампазіцыі, мы ў апошнюю чаргу звяртаем увагу на тэксты, а

> Эдуард Зарыцкі: "Вось і атрымліваецца тое, што я называю словам "самапал" — набор слоў пад пэўны рытм. Таму і пераважаюць "аднаразовыя" кампазіцыі, прызначэнне якіх — апраўдваць так званы фармат, адпавядаць яму. Але што такое "песенны фармат"? Прапаную ўласнае — аўтарскае, калі можна так сказаць, вызначэнне: **фармат — гэта музычная "пракладка" між двума рэкламнымі блокамі.** Але такі шлях развіцця песеннага жанру — тупіковы".

найперш — на музыку, шыкоўную аранжыроўку, на музычны арэол, дзе словы (асабліва для тых, хто не ведае замежнай мовы дасканала) становяцца часткай гукавай прасторы, "фанасферы", як яе называюць у навуковых колах. У гэтым і справа! У Еўропе, як я неаднаразова пераконваўся, вялікую ўвагу надаюць самому гучанню песенных тэкстаў, фанетыцы слоў, спалучэнню літар, якія пры маўленні-спяванні надаюць пэўны настрой, выклікаюць неабходныя падсвядомыя асацыяцыі — адным словам, утвараюць атмасферу. Гэткая мелодыка мовы (вядома, разам з уласна музычнымі мелодыяй, гармоніяй, аранжыроўкай, спалучэннем тэмбраў) моцна ўплывае на стылістыку твора. Таму, дарэчы, замежныя песні ў перакладзе на рускую мову часта страчваюць сваю стылёвую аўру, становяцца ніякаватымі. А ў нас (як, дарэчы, і ў Расіі) на гэта амаль не зважаюць — як і на тое, што словы прачытаныя ды словы праспяваныя часта ўспрымаюцца абсалютна па-рознаму. Наш слых, як у гульні ў сапсаваны тэлефон, падкідвае нам "незапланаваныя" сэнсы ці поўную бязглуздзіцу.

Мне ў свой час, лічу, пашанцавала, бо я з самага пачатку працаваў з добрымі паэтычнымі тэкстамі. І прытрымліваюся такога прынцыпу дагэтуль. Ну як музыканты не могуць уцяміць, што добры тэкст у стане "выцягнуць" нават не самы лепшы музычны бок? У гэтым і быў феномен бардаўскай песні тых жа 1960-х! З музычнага пункта гледжання, мелодыкі — няма, голасу — таксама, а ўражанне — неверагоднае! Бо словы там — самадастатковыя, музыка ж — толькі частка іх "афармлення".

Пашчасціла мне і з тым, што я працую ў Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестры Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Фінберга. І Міхаіл Якаўлевіч бярэ ў рэпертуар менавіта беларускамоўныя песні, заклікае перакладаць на беларускую нават рускамоўныя. Па яго ініцыятыве з'явіўся шэраг маіх песенных цыклаў на словы паэтаў-класікаў: не толькі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, але і Адама Русака, Уладзіміра Караткевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Паўлюка Багрыма ды іншых. Да творчасці кожнага з іх даводзілася знаходзіць ключык. Бо ў таго ж Русака што ні верш — мелодыя: толькі пачынаеш чытаць — мелодыя сама з'яўляецца. А ў Караткевіча — наадварот, паэзія зусім, здавалася б, не песенная. Але такая праца "на пераадоленне" мне як кампазітару таксама была на карысць. Таму маладым дзеячам нашай эстрады я параіў бы працаваць толькі з прафесіяналамі. Хтосьці скажа: маўляў, той жа Шуберт напісаў паводле Гётэ літаральна адзін свой шэдэўр, а паводле нейкага Пітэра Мюлера, якога сёння ніхто не ведае, — процьму песень, два самыя знакамітыя цыклы. Але, прабачце, той Мюлер, хаця і не стаў класікам, быў прафесіяналам сваёй справы! І пісаў простыя, ды вельмі якасныя тэксты...

— У 2010 годзе выйшаў мой сольны альбом "Белая яблыня грому" з кампазіцыямі на вершы Барадуліна, Куляшова, Міцкевіча, Коласа, Купалы ды іншых беларускіх класікаў, — прыгадвае з нагоды тэмы нашага абмеркавання лідар гурта "Крамбамбуля" Лявон Вольскі. — Сёння ў тандэме з Паўлам Аракелянам мы выконваем дзве песні на вершы Анатоля Сыса і Уладзіміра Караткевіча. Ёсць задумка падрыхтаваць праграму з твораў менш вядомых нашых паэтаў мінулага стагоддзя, многіх з якіх, у ліку іншых дзеячаў беларускай культуры, расстралялі ў адну кастрычніцкую ноч 1937 года… Гэта была дэкадэнцкая паэзія, цікавая, сучасная для таго часу, без усялякіх "бярозак" ды "бедных зямелек". І калі "Белая яблыня грому" аказалася работай эклектычнай (найперш у яе вершаванай частцы), то новую хочацца зрабіць больш канцэптуальнай у гэтым плане.

Што да тэкстаў, якія я сёння чую са сцэны і ў запісе (не бяру ў разлік поп-музыку, дзе тэксты па большай частцы проста жудасныя — нейкі хаатычны набор слоў), то ў іх знаходжу нешта арыгінальнае ды нават дзіўнае. Адчуваецца, што людзі думаюць цікава. Але не заўсёды атрымліваецца гэта належным чынам выказаць. А ёсць каманды, якія ў сілу свайго статусу не павінны дазваляць сабе такую сумнеўную лірыку, якую яны спяваюць. Не атрымліваецца самім нешта небанальнае напісаць — звярніцеся да тых жа класікаў або цяперашніх паэтаў. У нас жа мора выдатнай паэзіі! Вайцюшкевіч знаходзіць яе — і сярод мінулага, і сярод цяперашняга. Я думаю, што любы сучасны паэт мог бы дапамагчы пры складанні адэкватнага тэксту — Андрэй Хадановіч (у яго дык наогул каласальны досвед працы з перакладамі замежных рокераў і бардаў), Віктар Жыбуль, Анатоль Івашчанка, Усевалад Сцебурака, Віка Трэнас, Таццяна Нядбай... Ну а калі так хочацца самім, то варта звярнуцца хоць па параду да профі. Ці пашукаць падказку ў Інтэрнэце. Я ўжо ў шаснаццаць лічыў сябе паэтам, які адбыўся, але калі бацька пачаў разбіраць памылкі ў маіх тэкстах, аналізаваць іх ды рэдагаваць, я зразумеў, што яшчэ "пахаць і пахаць" да паэзіі. Хаця, быццам бы, асноўным правілам вершаскладання да таго часу я ўжо быў навучаны. Пачаўшы граць у 1981-м у "Мроі", памылкова пачуваўся падрыхтаваным у гэтым сэнсе. І напісаў шмат таго, за што калі не сорамна, дык і няма чым ганарыцца…

Чапляе — не чапляе

— Я не лічу, што песенныя тэксты апошнім часам рэзка сапсаваліся, як пра гэта прынята казаць, — зазначае кампазітар Алег Елісеенкаў. — Трэба размяжоўваць класіку, якая прайшла сістэму адбору, і непасрэдны гістарычны працэс, што адбываецца ў сучаснасці, дзе такога адбору пакуль не адбывалася. Агульны зрэз — заўсёды сярэдні. Так што лепшыя — падкрэслю, лепшыя цяперашнія песенныя тэксты — зусім не горшыя за ранейшыя. У мінулыя гады таксама хапала бязглуздзіцы, ды на тыя песні папросту забыліся, што абсалютна нармальна.

Увогуле ж, трэба разумець, што ўзровень песенных тэкстаў, як і любой жыццёвай з'явы, якая развіваецца цыклічна, не мае пастаяннай велічыні. Чалавеку заўсёды ўласціва чакаць чагосьці незвычайнага, спадзявацца на хуткі прагрэс: маўляў, чым далей, тым лепш. Але мастацтва развіваецца па сваім графіку. Змена стыляў і кірункаў узнікае не таму, што ўсё ранейшае дрэннае, а таму, што хочацца, зноў-такі, чагосьці новага, незвычайнага — нейкага выкіду энергіі, таленту. Дарэчы, такія творчыя "выбухі" бываюць заўсёды, у любую эпоху, незалежна ад абставін ды нашых пажаданняў. Як бы ні крытыкавалі савецкія часы, але ўвага да слова, што ўзнікла тады, распаўсюдзілася і на цяперашнюю постсавецкую прастору. Невыпадкова такой папулярнасцю карыстаюцца песні-рамансы, мелодыі кіно, кампазіцыі на класічныя вершы. Для нашай ментальнасці вельмі важна, каб твор меў высокую гуманістычную скіраванасць. Мы звяртаем увагу найперш на тое, пра што ён, а не як ён зроблены. Хаця, у сваю чаргу, удалыя хіты заўсёды ўтрымліваюць паэтычную аснову.

> Алег Елісеенкаў: "Звярнуцца да добрага паэта — не панацэя. Бо песенны жанр скараўся не ўсім вялікім творцам. Бывае, верш сам па сабе добры, усё зроблена прафесійна, няма да чаго, як кажуць, прычапіцца. А ў выніку — не чапляе! І ведаеце, **калі нейкі паэт радасна запэўнівае, што гатовы прадаставіць больш за тысячу шыкоўных песенных вершаў, гэта мяне насцярожвае**".

Звярнуцца да добрага паэта — не панацэя. Бо песенны жанр мае сваю спецыфіку і скараўся не ўсім вялікім творцам. Бывае, верш добры, усё на месцы, зроблена прафесійна, няма да чаго, як кажуць, прычапіцца. А ў выніку — не чапляе! Усё гладка, як па накатанай, — іскра не прабягае. А бывае, з-за аднаго радка, удалага словазлучэння, за якім крыецца яркі, нечаканы вобраз, і атрымліваецца добрая песня…

Адзначу і тое, што публіка насамрэч рэагуе адэкватна. Сёння знікае розніца паміж перыферыяй і сталіцай, бо расійская папса не грэбуе выступаць у райцэнтрах, а ў Мінск прыязджаюць зоркі сусветнага маштабу, якія раней і ў Маскву не завітвалі. Таму, на мой погляд, назіраецца паварот да змястоўнага мастацтва. І сведчаннем — ужо сама ўзнятая вамі тэма. Звычайнымі эстраднымі выступленнямі ўсе ўжо, што называецца, наеліся — і цягне да ежы духоўнай, якаснай. Побытавыя паралелі тут апраўданы: у жыцці ж таксама, наталіўшы першы голад, мы імкнёмся да здаровага харчавання, ды яшчэ, пажадана, добра аформленага. Таму давайце не будзем глядзець на ўсё песімістычна. Ведаеце, калі нейкі паэт радасна запэўнівае, што гатовы прадаставіць больш за тысячу шыкоўных песенных вершаў, гэта мяне насцярожвае. І наадварот, калі той жа Алесь Бадак сумна прызнаецца, што, маўляў, нічога няма, я дакладна ведаю: будзе! Трэба пачакаць: іскра не прабягае па замове…

— Сённяшнюю беларускую музыку я спецыяльна не слухаю, ніякую, хіба выпадкам, — адзначае рок-князёўна па выніках фестываля "Рок-каранацыя", спявачка Кася Камоцкая. — Напэўна, таму, што музыкі ўсялякай і шмат мне хапіла ў той час, калі я працавала на радыё, больш актыўна канцэртавала, запісвала песні. Але нешта з песень міма мяне не праходзіць. Напрыклад, Міхалок, калі раптам стаў шмат спяваць на беларускай мове. Гэта выдатна, вядома, ён выбірае высокую паэзію, але... Як бы дакладней выказацца... Нібыта чалавек упершыню адкрыў для сябе школьную праграму па беларускай літаратуры і навыбіраў з яе вядомыя вершы, тое, што ляжала на паверхні. Разумею, што ён не вучыўся ў беларускай школе, і, тым не менш, адчуванне дзіўнаватае. Але ў яго выпадку ўжо вядомага музыканта, што аднойчы адкрыў для сябе цэлы пласт нашай вялікай паэзіі, — гэта варта павагі…

К

ф о т а ф а к т



#Mastacki

Міжнародны фотарух #EMPTYMET 17 лютага дэбютаваў у Беларусі — у сценах Нацыянальнага мастацкага музея. Сутнасць мерапрыемства — паказ музейных пляцовак праз Instagram. Вынікі праекта можна шукаць у Сеціве пад хэштэгамі #EmptyMastacki і #Mastacki. / **Фота Аліны САЎЧАНКА**

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванні да 80-годдзя народнаму артысту Беларусі і СССР **Генадзю Аўсяннікаву**.

Космас штрыхоў Аўсяннікава

Юбілей

Пазаўчора, акурат у дзень свайго 80-годдзя, народны артыст Беларусі і СССР Генадзь АЎСЯННІКАЎ прымаў віншаванні са славутым юбілеем. Дый сам на падарункі гледачам не забыўся: цягам больш як тыдня — з 11 да 19 лютага — ён літаральна штодня выходзіў на сцэну Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, у якім працуе без малога шэсць дзясяткаў гадоў. І кожны са спектакляў бягучага рэпертуару, незалежна ад працягласці ролі, успрымаўся своеасаблівым бенефісам Майстра.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Генадзь Аўсяннікаў пад час урачыстасцей з нагоды ягонага юбілею.

Тацяна МАТУСЕВІЧ



...і ў адной з найлюбімых яго ролей у дуэдзе-аўсяк "Вечары".

Ўсе разбурэнні — як у наваколькім свеце, так і ў чалавечай свядомасці. А што значыць вёска для вас? Нарадзіліся вы, наколькі вядома, у Магілёве, але амаль усё дзяцінства правялі ў сялянскай атмасферы...

— Я жыў з цёткай, а яе ўвесь час накіроўвалі з адной вёскі ў другую. Яна была настаўніцай ды яшчэ і завучам, узнімала пасляваенную школу. Вось я з ёй і папаездзіў па вёсках. Не было анічога! Ні сшыткаў, ні алоўкаў, не кажучы пра падручнікі. Усё рабілі самі, нават чарнілы. Крыху сажы з печы, да яе вады — вось і будуць чарнілы. А ўлетку яшчэ лепш: можна сокам крушыны пісаць. Не на паперы, вядома, а на старых газетах. Дый пёры самі прымайстроўвалі — на палачку якую, на капсуль ці стары запал. Што знойдзецца, тое і добра. Ніколі не забуду, як адзін хлапец перабльтаў запал з такой самаробнай ручкай. А запал аказаўся не пустым, а дзеючым. Як выбухне!.. І дагэтуль страшна ўзгадваць... А ўжо ў каго сапраўдная ручка была — у-у-у, гэта ж заможны чалавек! Чаго толькі вяскоўцы ні перажылі... Я ж і акупацыю памятаю: у школу яшчэ прыехалі немцы пайшоў.

Але ж ніякія выпрабаванні, ніякія жыццёвыя негоды не зламілі сапраўднага народнага характару. Я такіх вясковых дзядкоў пабачыў — што ні чалавек, то свая асаблівая гаворка, рухі, звычкі...

— Нешта пераймалі?

— Наўпрост пераймаць — нецікава. У акцёрскай справе важны жыццёвы досвед. І ўменне яго выкарыстоўваць, трансфармаваць у залежнасці ад ролі.

— Навучыць гэтаму можна? Вы, дарэчы, ніколі не выкладалі — хіба парады, можа, моладзі давалі, калі пра тое прасілі...

— Не маё гэта! Прафесія настаўніка, а тым больш у творчых спецыяльнасцях, — надта спецыфічная. Калі вучыш, галоўнае — заўважыць у кожным выхаванцы тое, што ён яшчэ і сам пра сябе не ведае. Для гэтага патрэбны не толькі веды, не толькі ўменне іх перадаваць (ды яшчэ так перадаваць, каб "уязлі", а не кінулі), а яшчэ і нейкае ўнутранае пачуццё — інтуіцыя ці штосьці іншае. Заўважыць сапраўдную адоранасць, гэткую іскрынку — таксама не кожнаму дадзена. Проста навучыць, натрэніраваць, "выдрэсіраваць" можна і мядзведзяў! Паглядзіце, яны ж і на веласіпедах катаюцца, і ў футбол гуляюць. Але гэта — іншае. Раней было такое амплуа — рэзанёр. Акцёр гаворыць вельмі правільныя рэчы: маўляў, трэба рабіць так, гэта будзе добра, а калі гэтак — дрэнна. Дый сам ён робіць усё правільна — усё, як трэба. І пафасу хапае, і ўзнёсласці, і запал быццам ёсць! А нутро ў акцёра пры гэтым — спакойнае. І нічым не ўскалыхнуць. Ён працуе. Сапраўдны ж артыст заўсёды пачынае з сябе: знаходзіць нешта, што дапаможа яму зрабіць ролю "сваёй", унесці ў яе разыначку, "ажывіць" героя. Не ведаю, ці можна гэтаму навучыць, бо кожны павінен шукаць сам. Навучыць можна хіба прыёмам. Але выкладчык павінен ад пачатку бачыць, ці здольны чалавек да далейшай самастойнасці.

Мне пашанцавала: я вучыўся ў народнага артыста Беларусі Канстанціна Саннікава. Вось дзе быў майстар! І ў яго было беспамылковае чуццё на адшукванне тэатральна адораных юнакоў. Ляпер усе захапляюцца КВЗ — Клубам вясёлых і знаходлівых, а ў тыя часы рэгулярна праводзіліся разнастайныя агляды самадзейнасці: мясцовыя, рэгіянальныя, раённыя, абласныя, нарэшце, рэспубліканскія. Саннікава звычайна запрашалі ў журы, шмат гадоў ён быў старшынёй рэспубліканскай камісіі. Вядома, самадзейныя артысты выступалі як умелі. Але ён беспамылкова бачыў магчымыя перспектывы. Так ён "адкрыў" двух будучых народных артыстаў Беларусі: Лілію Давідовіч (між іншым, яна да гэтага спрабавала паступіць у Тэатральна-мастацкі інстытут, але не прайшла), Міхаіла Пятрова — абаіх ужо няма з намі... З Ліліяй мы вучыліся на адным курсе, потым яна таксама працавала ў нашым тэатры. А Міхаіл быў зоркай ТЮГа, без яго амаль ніводны спектакль не абыходзіўся.

— Што вы параілі б моладзі?

— Хадзіць у тэатр.

— А тым, хто ходзіць туды на працу — тым жа артыстам?

— Шукаць у сабе "сваё". Але "хадзіць на працу", "адпрацоўваць" — гэта не пра сапраўдных артыстаў... К

Бамонд: опера, балет

У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі — чарговая пастаноўка "Паяцаў". Менавіта гэтай прэм'ерай адкрываўся Мінскі міжнародны Калядны оперны форум, і мы ўбачылі два паказы новага спектакля запар: адзін — з цалкам беларускім складам, другі — з запрошанымі салістамі.

Розныя рэчы з доляй іроніі

"Паяцы": "пераехалі" ў тэатр

Надзея БУНЦЭВІЧ

Да гэтай оперы Руджэра Леанкавала наш тэатр ужо звяртаўся. І перанос дзеі бліжэй да сучаснасці таксама быў — у мінулай пастаноўцы Сусанны Цырук. Калі ў іншых творах ён часам выглядае недарэчным, дык тут — у самы раз. І гэтаму ёсць тлумачэнне! Верысцкія оперы, да якіх належыць і гэтая, засноўваліся пераважна на рэальных фактах. Таму, у пэўнай меры, іх можна лічыць своеасаблівымі прадвесніцамі цяперашняга "дакументальнага" тэатра з яго тэхнікай вербацім. Але рэальнасць больш як 120-гадовай даўніны і цяперашняя — розныя рэчы. Рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ пераносіць тагачасныя сюжэтныя перыпетыі ў сённяшні дзень — і замест вандроўных камедыянтаў, якія прыязджаюць на сваім фургоне ў вёску, перад намі з'яўляюцца славутыя майстры сцэны, што даюць спачатку прэс-канферэнцыю, а потым прадстаўленне на сцэне нейкага тэатра (як тут не згадаць "залётных зорак" таннай антрэпрызы, а мяркуючы па бліскаўках на сцэнічных строях — і эстрады таксама).

Нечаканасці, пакліканыя заінтрыгаваць гледача, пачынаюцца яшчэ да адкрыцця заслоны. Бо Тоніа, які саліруе ў Пралогу, з'яўляецца не на авансцэне, а... у аркестравай яме, на месцы дырыжора, спраўна кіруючы музыкантамі. І толькі потым перадае эстафету Віктару Пласкіне, пераходзячы да спеўных абавязкаў. "У ролі" колішняй вёскі, паўторымся, выступае вялізная канцэртна-тэатральная пляцоўка, дзе толькі што скончылася, мяркуючы па элементах сцэнаграфіі, опера "Аіда" (між іншым, добры піяр-ход, калі адзін спектакль рэкламуе другі — таго ж самага, дарэчы, рэжысёра). Адпаведна, Сільвіа — хтосьці накшталт рабочага сцэны. Хор і статысты ўвасабляюць усюдысных журналістаў з натоўпам прыхільнікаў, якія сустракаюць свайго куміра. Развязка яшчэ больш крывавая — трупаў паболела. Гэтага і трэба было чакаць, бо ў руках сучаснага Каніа апынуўся не нож, а пісталет. Таму ў фінале забітыя не толькі Нэда і Сільвіа, але і Бэпа — дый усе, хто пад гарачую руку трапіў.

Новая пастаноўка атрымалася сапраўды кідкай, шмат у чым "наўмысна альтэрнатыўнай", звернутай не адно да оперных эстэтаў, а найперш да самай шырокай публікі з яе відовішчна-эстрадныміпрыярытэтамі (заўважым, што ўсім відовішчным блокам, уключаючы афармленне сцэны і светлавую канцэпцыю, займаўся сам рэжысёр, і гэта пайшло спектаклю на карысць). Але адметнасць прэм'еры — не столькі ў гэтых "вонкавых" дэталях, колькі ў тым, што практычна ўсе вобразы аказаліся пераасэнсаванымі. Каніа цяпер не столькі раз'юшаны рэўнасцю, даведзены да адчаю муж, колькі сапраўдны тыран з усімі прыкметамі зорнай хваробы ў апошняй стадыі. Пра характар ягонага саперніка Сільвіа гаворыць адна быццам бы другасная дэталь: упершыню той з'яўляецца на сцэне ў атачэнні дзятвы — як яе сапраўдны завадатар, негалосны лідар. Маўляў, калі ён так дзяцей любіць, значыць, і пра ўласных нашчадкаў, пра сям'ю марыць. Што яшчэ жанчыне трэба? Тым больш, міжволі ўзнікае параўнанне двух куміраў — уяўнага і... няўжо сапраўднага?

Але ў спектаклях Міхаіла Панджавідзэ вельмі частым становіцца тыпаж жанчыны-разбуральніцы, "ваяркі" па натуры, якая зусім не ахоўвае-стварае. Вось і Нэда ў хлопца не закаханая — так, галаву яму дурыць. Асаблівых высілкаў тут не трэба, бо той паводле сваёй псіхалогіі — сам яшчэ дзіця, таму і з'явіўся сярод "сабе падобных". Нэда ж — злосная, неўраўнаважаная, сапраўдная "другая палова" свайго супруга, з такімі ж прыступамі жорсткасці. У час "спектакля ў спектаклі" яна не стрымлівае Каніа, аслепленага жарсцю помсты, не намагаецца перавесці ўсё ў клаўнаду, а, наадварот, здзекуецца з яго, імкнецца развянчаць ягоную славу, з'едліва прадэманстраваўшы публіцы і мас-медыя цёмныя бакі яго натуры.

Так што спектакль атрымаўся, адпаведна з эстэтыкай свядомай дэрамантызацыі рэчаіснасці, без цалкам станоўчага, "бела-пухнатага" героя, затое з доляй іроніі ды парадыйнасці — класічны постмадэрн. Не прэтэндуе на ролю "прыкладу для пераймання" і агульнавядомы "вобраз народа", — замест яго ўзнікае драгны да сенсацый ды відовішчаў натоўп. Але з якім непадробным пачуццём гумару пастаноўшчык вырашае масавыя сцэны! Асаблівы калі артысты з'яўляюцца ў глядзельнай зале і не проста праходзяць праз яе, а на пэўны час цалкам пераносяць туды дзею (вось умее Панджавідзэ "абжываць" усю тэатральную прастору!).

Надае спектаклю "масавасці" і, галоўнае, відовішчнасці ўдзел у ім вялікай групы згаданых юных артыстаў, якія пазней увасабляюць выхаванцаў балетнай школы пры тэатры (праўда, амаль усім ім для гэтага варта крыху больш "цягнуць насочкі", а не трымаць ступак сякеркай). Два выхады сольнай балетнай пары, адносіны ўнутры якой складаюць і паралель, і альтэрнатыву перыпетыям оперных герояў спектакля, вымушае прызнаць, што пастаноўка працягвае традыцыі не толькі італьянскай оперы, да якой належаць "Паяцы", але і французскай (а разам з ёй і рускай), дзе опера без балета немагчымая. Удала ўпісваецца ў асучасненую канцэпцыю харэаграфія Вольгі Костэль. Відовішчны эфект мае выкарыстанне элементаў лялечнага тэатра: побач з Нэдай-Каламбінай з'яўляецца магутная, вышэй за яе, курыная тушка, якая яшчэ і нібы "прытанцоўвае".

А што ж уласна музыка? Гасцявы склад салістаў, хаця і сляваў на другі дзень прэм'еры, быў відавочна першым. І справа не ў тым, што там усе, маўляў, вакалізавалі лепш за сваіх калег, а ў тым, што там і запраўды куды больш дакладна ды вывераны быў расстаўлены сэнсавыя акцэнні. Народны артыст Грузіі Эймураз Гугушвілі палюбіўся беларускім прыхільнікам оперы яшчэ ў час сваіх ранейшых прыездаў. Увасабляючы Каніа, ён знайшоў тую неадназначнасць вобраза, якая ў канфлікце з Нэдай без усялякіх сумневаў пакідала галасы гледачоў на яго баку. Больш ярка акрэсліваўся і дадатковы канфлікт — унутры гастрольнай групы: калі Тоніа меў планы на яго жонку, дык Бэпа — на яго творчае прызнанне. У такім атачэнні фігура Каніа набывала панраўдзе трагедыйны ўхіл, укладзены ў музыку кампазітарам.

У беларускім складзе акцэнты былі іншыя. Асноўным вытокам зла станавіліся не ўяўныя "паплечнікі" талента, а сам Каніа: як не цяжка было здагадацца, ён "прыцісканы" калег, каб тыя не замінялі ягонаму "ззянню". Калі Бэпа ў наўмысна шаржыраваным выкананні Яноша Нялепы ўспрымаўся зайздроснікам Каніа (Тэймураз Гугушвілі), дык Юрыю Гарадзецкаму з ягоным бельканта, колькі ягоны Бэпа ні крыўляўся б, павінны зайздросціць астатнія. Колькі ні намагаўся б далікатны Уладзімір Пятроў "ачарніць" свайго Тоніа, той усё роўна ўспрымаўся прыродзканым інтэлігентам, а зусім не пачварай. Затое ў Сяргея Маскалькова (Расія) на першы план выходзілі заганы душы героя. Ніна Шарубіна аказвалася больш "сцярвознай" па імпульсах Нэдай, чым Кацярына Галаўлёва, якая відавочна вагалася, "біць ці не біць" Тоніа нагой у боце. Добрымі, спагадлівымі атрымаліся абодва Сільвіа. Але герой Ілы Сільчукова — больш кранальны, бельканоны, — у параўнанні з упэўненым Уладзімірам Громавым.

Аркестр і асабліва хор, ад якога патрабуюцца разнастайныя спеўныя ды акцёрскія ўменні, — на вельмі высокім узроўні. Хаця, на вялікім рахунку, ад аркестра можна было б чакаць і больш вытанчаных фарбаў, яшчэ большага стылёвага кантрасту паміж асноўнай дзеяй і "спектаклем у спектаклі". Застаецца спадзявацца, што надалей пастаноўка не страціць прэм'ернага імпэту, а толькі ўзбагаціцца — не столькі дзякуючы ўдзелу ўсё новых запрошаных салістаў (не маючы той колькасці рэпетыцый з рэжысёрам-пастаноўшчыкам, як гэта было напярэдадні форуму, госці могуць і не данесці новую канцэпцыю), колькі праз шліфоўку назапашанага.

І ўсё б добра, ды застаецца "вечнае" пытанне: хто будзе спяваць Каніа ў адсутнасці гасцей? Існуе адно Сяргей Франкоўскі? Так, з драматычнымі тэнарамі ў нас, што называецца, "не разгонішся". Дык, можа, наспеў час шукаць не толькі спевакоў, неабходных для даўно вядомага рэпертуару, але і новы рэпертуар, прыдатны для таго складу трупы, які маем?..

Што ж да "Паяцаў", дык напаўканцэртную версію іх можна будзе ўбачыць і пачуць у сталічнай філармоніі 10 сакавіка — з салістамі з Італіі і Расіі, Дзяржаўным камерным хорам пад кіраўніцтвам Наталлі Міхайлавай, Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам і дырыжорам Аляксандрам Анісімавым, які і ладзіць праект. К

Сцэна са спектаклю: у ролі Каніа — Сяргей Франкоўскі, Тоніа — Уладзімір Пятроў.

Сёлетні магілёўскі Міжнародны маладзёжны тэатральны фестываль **"М.@rt.кантакт"** адмовіўся ад працы прафесійнага журы.

Мастыхін

У Нацыянальным мастацкім музеі — пасмяротная выстаўка жывапісу і графікі народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стэльмашонка пад назвай "Летапіс часу".

"У будучыні — нашы крылы..."

Барыс КРЭПАК

Гэтае імя добра вядомае не толькі на прасторах нашай краіны, але і далёка за яе межамі: на радзіме продкаў жывапісца ў Асіповічах існуе мастацкая галерэя яго імя, шмат манументальных твораў упрыгожваюць эксцэр'еры і інтэр'еры гарадоў Мінска ды Салігорска, крымскага Міскхора і нямецкага Патсдама; ён быў ганаровым грамадзянінам горада Трэнтан штата Нью-Джэрсі (ЗША), і ў свой час — старшынёй Камітэта Вярхоўнага Савета СССР па культуры, дзе прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы Закону аб культуры. А яшчэ двойчы выбіраўся старшынёй Праўлення Саюза мастакоў БССР. Але, канешне ж, мастацтва заўсёды было ў яго на першым месцы. Прага "ахапіць неахопнае" прымушала яго працаваць і ў станковым жывапісе, і ў мазаіцы, і ў вітражы, і ў графіта, і ў акварэлі ды малюнку, і ў сцэнаграфіі. Наогул, ён быў чалавек вельмі шырокага дыяпазону — не толькі як творца, але і як грамадзянін, для якога ў аснове асноў заўсёды былі стратэгічныя праблемы развіцця нацыянальнай культуры ды эстэтычнага выхавання моладзі.

Так здарылася, што ён, народжаны 7 лютага 1928-га, шасці месяцаў не дажыў да свайго 86-годдзя... І вось зараз, праходзячы па музейнай галерэі з яго цудоўнымі творамі, мы зноў успамінаем Уладзіміра Іванавіча — гэтага нястрымнага, турботнага чалавека, які імкнуўся ў сваёй творчасці знайсці нешта новае і ў тэматыцы, і ў вобразна-стылістычнай пластыцы, і ў спалучэнні жывапісу з разьбой па дрэве, аплікацыяй, калажам, народным арнаментам і нават з выкарыстаннем тэксту ў сюжэтна-фігуратыўнай ды партрэтнай кампазіцыі.

Памятаю, як гадоў дзесяць таму ў музеі з вялікім поспехам працавала яго персанальная выстаўка. Здаецца, тое быў люты 2004-га. На вернісажы мастак хутчэй без выключэння наведвальнікам дарыў свае акварэлі ды малюнкі. І было вельмі прыемна глядзець, як у вестыбюлі, ад увахода да парадняй лесвіцы, выстройвалася чарга, каб займець рукатворны кавалачак "душы" мастака з яго аўтографам. Больш такіх выпадкаў цесных сувязей творцы і гледача ў час вернісажаў я ніколі не сустракаў...

У экспазіцыі палову месца займаюць палотны Стэльмашонка 1960 — 70-х гадоў, а другую частку — акварэлі ды малюнкі, створаныя ў асноўным на радзіме і ў час вандровак па краінах свету. Гэта быў той прыхільны, добразычлівы час, калі, нягледзячы на ідэалагічных прэсінг, нараджалася новае беларускае нацыянальнае мастацтва ў выглядзе "новай хвалі" — шасцідзясятнікаў. Сённяшнім чытачам "К", асабліва маладым, гэта важна ведаць, інакш не зразумеем таго, што сёння адбываецца ў нашым мастацтве, што мы набылі новага і што страцілі. А страцілі, асабліва ў духоўным плане, шмат чаго... Тады ж у культурную прастору першай "адлігі" ўварваліся параўнальна маладыя, дужыя, шпаркія, нецярплівыя, задаволеныя тым, што рабілі, мастакі, якія не сумняваліся ні ў сваім таленце, ні ў сваёй слушнасці, ні ў прызначэнні ды верылі ў сваю зорку. Міхаіл Савіцкі, Леанід Шчамялёў, Гаўрыла Вашчанка, Віктар Грамыка, Май Данцыг, Аляксандр Кішчанка, Іван Стасевіч, Георгій Паплаўскі, Арлен Кашкурэвіч, Анатоль Анікейчык — вось толькі некаторыя імёны тагачасных "парушальнікаў спакою", якія, па сутнасці, і зрабілі "залатую" гісторыю нашага сучаснага мастацтва. І ў гэтай кампаніі ён, па якой належаць "Паяцы", але і французскай (а разам з ёй і рускай), дзе опера без балета немагчымая. Удала ўпісваецца ў асучасненую канцэпцыю харэаграфія Вольгі Костэль. Відовішчны эфект мае выкарыстанне элементаў лялечнага тэатра: побач з Нэдай-Каламбінай з'яўляецца магутная, вышэй за яе, курыная тушка, якая яшчэ і нібы "прытанцоўвае".

Уладзімір Стэльмашонак. "Радавод Мікалая Радзівіла Сіроткі".

Кароткія нататкі з выстаўкі Уладзіміра Стэльмашонка

Уладзімір Стэльмашонак быў тады ці не на галоўных ролях. Першая вядомасць прыйшла да яго, канешне ж, з напісанем паясного партрэта Якуба Коласа. Гэты жывапісны вобраз песняра-сейбіта трывала ўвайшоў у хрэстаматыю беларускай выяўленчай культуры. Пра твор шмат сказана і напісана, таму не буду на гэтым засяроджвацца. Скажу толькі, што падрыхтоўчыя малюнкі да будучага партрэта малады мастак яшчэ студэнтам "Рэпінкі" рабіў на пачатку 50-х, у час прыезду на канікулы з Ленінграда ў Мінск. Рабіў з натуры, калі, незадоўга да смерці, яму пазіраваў сам аўтар "Новай зямлі"...

Але наступная карціна "ВХУТЕМАС. 1921 год", створаная ў тым жа годзе, нарабіла столькі шуму, што яшчэ доўга выклікала ў мастакоўскіх ды ідэалагічных колах шалёныя спрэчкі і дыскусіі. Як можна, абураліся "правільныя", так "псаваць вобраз вялікага правадыра Леніна"?! Гэта ж "прамая карыкатура", "паклёп на нашага дарагога Ільіча"! Ну, вобраз Крупскай — гэта яшчэ сяк-так. А вось Ленін... Тут мастаку трэба задумацца... Нагадаю, гаворка ў карціне ішла пра наведанне 21 лютага 1921 года Леніным з Крупскай студэнтаў-камунараў інтэрната Вышэйшых дзяржаўных мастацка-тэхнічных майстэрняў (ВХУТЕМАС) на чацвёртым паверсе дома № 21 па вуліцы Мясніцкай. Мастак у дэкаратыўна-яркім рамантычным ключы паказаў групу вясёлых маладых людзей з такімі ж вясёлымі Леніным і ягонай жонкай — без усякай пафаснасці, без прагінання перад аўтарытэтам. Ён ліквідаваў той "п'едэстал", без якога ніхто з мастакоў тады не абыходзіўся, калі звяртаўся да Леніняны.

Менавіта з гэтага палатна пачалася новая стылёвая эвалюцыя ў мастацтве Стэльмашонка. Яна грунтавалася на глыбокіх традыцыях беларускай народнай творчасці, нацыянальнага арнаменту, на духоўным асэнсаванні спадчыны ды гісторыі грамадскай думкі. І гэта яскрава выявілася ў карцінах "Свята ў камуне", "Сыны Радзімы", "Успаміны", "Слова пра Беларусь", "Славутасці Беларусі", "Акцябрыны — чырвоныя хрэсьбіны", "Народныя камісары БССР", "Родны дом", серыі партрэтаў, у тым ліку Рыгора Шырмы, дзеда Талаша, Максіма Гарэцкага, "Мужчынскі партрэт. Зона. Чарнобыль", Максіма Багдановіча. І калі ідзеш па выстаўцы — такое адчуванне, быццам увачавідкі "чытаеш" ды наноў асэнсоўваеш у фарбах і вобразах нашу вялікую гісторыю...

У экспазіцыі прадстаўлена частка серыі жывапісных партрэтаў магнацкага роду Вялікага Княства Літоўскага — Радзівілаў. Над імі мастак працаваў больш за дзесяць гадоў. З дадзенай фаміліі паходзілі дыпламаты ды ваяры, пісьменнікі і кампазітары, драматургі ды мецэнаты, апекуны мастацтва і рамёстваў. З соцень прадстаўнікоў гэтай славутай дынастыі яго ўвагу прыцягнулі тыя, хто зрабіў заўважны ўклад у гісторыю айчыннай і еўрапейскай культуры. Сярод іх — Вайшунд, родапачынальнік Радзівілаў, а карціна "Радавод Мікалая Радзівіла Сіроткі" — нейкая пластычная квінтэсэнцыя галоўных вобразаў гэтай унікальнай у гісторыі Беларусі сям'і. Калісьці Уладзімір Іванавіч расказваў мне, што да роду Радзівілаў меў нейкае дачыненне... Джон Кенэдзі! Ён быў хросным бацькам пляменніцы сваёй жонкі Жаклін. А гэтая пляменніца, даклада вядома, належыла да роду Радзівілаў. Вось такія дзіўныя метамарфозы бываюць у гістарычных хітраспляценнях...

І — "Аўтапартрэт" 1993 года, можна сказаць, духоўны "ключ" экспазіцыі. Створаны тэмперай партрэт вельмі цікавы, напоўнены эмацыйнай выразнасцю ды філасофскай глыбінёй думкі. Гэта сапраўдны вобраз-сімвал. Вобраз-рэальнасць. Бег часу. Стан душы. Прастора вечнасці. Вобраз адкрытых магчымасцей. Ахматаўскае "Как в прошедшем грядущее зреет, так в грядущем прошлое тлеет..." — паслясловуе да расповеду пра жыццё аўтара. Тут — мастацтва са складанай структурай, дзе важную вобразную ролю адыгрывае і нязвычнае дэкаратыўнае афармленне падвойнай драўлянай рамы з прымяненнем натуральных бярозавых стваловуў...

Аднойчы, на пачатку 2006 года, я спытаў у Уладзіміра Іванавіча, што ён думае пра будучыню Беларусі. І мастак адказаў: "Мы, беларусы, рушылі ў вялікую ды нялёгкую дарогу, каб пабудаваць незалежную дзяржаву. На кожным шляху шмат прыпынкаў і паваротаў, бар'ераў ды ўхабаў, і мы павінны іх пераадольваць. Ёсць, ёсць маякі, што асвятляюць нам дарогу. Яны перш за ўсё — у духоўнай прасторы. Яны выпраўляюць нас у далейшы шлях, умацоўваючы сілы. У будучыні — дабро. У будучыні — магніт. У будучыні — рэальнасць. У будучыні — нашы крылы. Але трэба ведаць і любіць сваю мінуўшчыну, калі яна з'яўляецца з пражытых глыбінь. Інакш — нельга..."

Мінула амаль дзесяцігоддзе, але словы мастака і сёння гучаць вельмі надзённа... Дый усю сённяшнюю выстаўку Стэльмашонка можна смела лічыць "маяком", які асвятляе нам дарогу ў духоўную прастору дня заўтрашняга... К

Ерэванскі кінафестываль "Залаты абрыкос" прывязе ў Мінск **праграму армянскага кіно "Ніколі больш"**.

У пошуках асоб, вопыту і логікі: варыянты размяшчэння і замяшчэння Дома культуры

У дзясяты па ліку аўтапрабег адправіліся 11 лютага. Цягам некалькіх "невыязных" зімовых месяцаў засумавалі, шчыра кажучы, па выбітных асобах, па не менш яркіх творчых праектах ды новым досведзе развіцця рэгіянальнай культуры. За тры дні камандзіроўкі пабывалі ў Барысаўскім і Крупскім раёнах Міншчыны, а таксама ў Талачынскім ды Сенненскім раёнах Віцебшчыны. Як і заўжды, убачылі шмат цікавага і не вельмі. Як і заўжды, пастараліся быць аб'ектыўнымі ў асвятленні з'яў, падзей ды тэндэнцый.

Яўген РАГІН, Кастусь АНТАНОВІЧ
Мінск — Барысаўскі і Крупскі раёны Міншчыны — Талачынскі і Сенненскі раёны Віцебшчыны

Калі клуб у... класе

Акцыя "К": журналісцкі аўтатур па СДК і не толькі

"Сваё" і "наша"

Першым прыпынкам нашай аўтавандроўкі абралі **вёску Вялікая Ухалода**, што на **Барысаўшчыне**. Зрабілі гэта невыпадкова, бо даўно хацелі пазнаёміцца з мясцовым бібліятэкарам Надзеяй Мацюшонак. Уважлівы чытач памятае яе леташнюю публікацыю на старонках "К" пад загалоўкам "Тэрапія літаратуры". Зрэшты, на гэтую шчырую споведзь цяжка забыцца. Аўтарка да драбніц распісвае адзін дзень з жыцця сваёй сельскай бібліятэкі. І не толькі распавядае, але і аналізуе. Вось каб такіх артыкулаў — ды пабольш! Лічым яго цудоўным дапаможна-метадычным матэрыялам для іншых энтузіястаў бібліятэчнай справы. І ўвогуле бібліятэкары Барысаўскага раёна, на наш погляд, — адны з першых у краіне. І ў велавандроўкі да калег рэгулярна скіроўваюцца, і сайты сельскіх устаноў складаюць, і не саромяцца падзяліцца досведам. Дый ці варта тут казаць пра нейкі сорам? Прыдумаў, "абкатаў" — пайшоў у пошуках далей. І як тут не падзяліцца карысным набыткам хаця б з нагоды карпаратыўнай еднасці? Маўляў, навошта калегам час губляць, калі ўжо гатовае ёсць? А хтосьці штосьці іншае прыдумае і таксама праз "К" падзеліцца. Гэта, напэўна, і ёсць здаровая кансалідацыя сіл. Між тым, як наша практыка паказвае, далёка не ўсе так думаюць. Вось адна з "альтэрнатыўных" пазіцый, якую час ад часу даводзіцца чуць ў аддзелах: "Мы не дзеля справаздач працуем". Згодны, час пустых справаздач беззваротна мінуў. Але дзелавы дыялог аўтара крэатыву з чытачамі "К" — не толькі піяр роднай установы (што само па сабе ўхвальна!), але і сведчанне прафесіяналізму. Інакш кажучы, Надзея Мацюшонак лічыць за гонар *сваё* зрабіць *нашым*.

"...Бібліятэка любіць мяне"

І мы тут зусім не адхіліліся ад тэмы, бо Надзея Мацюшонак і гэтым разам падзялілася з намі (а значыць, і з чытачамі) чарговым бібліятэчным крэатывам. Па-першае, дзеля самаадукацыі яна выкарыстоўвае Сеціва па максімуме: дзелавыя кантакты з бібліятэкарамі, скажам, Самары і Новасібірска, адзначаны нават дыпломамі. Спецыяліст, які не саромеецца параіцца, — прафесіянал.

Па-другое, з мэтай развіцця і падтрымкі чытання Надзея Уладзіміраўна ўвяла такі від кніжнай рэкламы, як бук-трэйлер: анонс запісаны на дыску і агучаны бібліятэкарам. Ды так, што попыт на такую рэкламу не меншы, чым на саму літаратуру!..

Бібліятэка ў Вялікай Ухалодзе знаходзіцца ў школе — вынік інтэграцыі. Ёсць асобны ўваход. У памяшканні па-хатняму ўтульна. Абслугоўвае ўстанова 731 чытача, з іх 222 — дзеці. За дзень тут бывае ў сярэднім па 40 наведвальнікаў. Лічба вялікая, але цалкам рэальная: пад час нашага візіту ва ўстанову на Надзеі Уладзіміраўне літаральна "вісеў" ці не ўвесь беларускамоўны 4 "Б". І кожнага са сваіх чытачоў — і маленькіх, і дарослых — бібліятэкар імкнецца "лячыць" кнігамі. А што такая духоўная тэрапія неабходная, мы пераканаліся, калі сустрэліся з мясцовым святаром — айцом Аляксандрам. Але пра гэта — пазней.

Можна доўга шукаць і бясконца ўдасканальваць фармулёўку бібліятэчнаму прафесіяналізму. Але хто больш дакладна выкажацца, як не сам спецыяліст? Надзея Мацюшонак, да прыкладу, часта паўтарае: "Я люблю бібліятэку, а бібліятэка любіць мяне". Лепш і не скажаш...

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Прыгадваецца, летась на старонках "К" разгарэлася нежартоўная дыскусія, прысвечаная будучыні бібліятэк. Давялося атрымаць нямала гнеўных лістоў на маю пазіцыю, якая заключалася якраз у тым, што бібліятэка будучыні — гэта не столькі пункт кнігавыдачы, колькі месца (у тым ліку і віртуальнае), дзе можна атрымаць рэкамендацыю, якую цікавую кнігу можна спампаваць з Інтэрнэту для свайго рыдэра. Прыемна, што бібліятэка ў Вялікай Ухалодзе пацвердзіла слушнасць маёй думкі, а заадно з катэгорыі "бібліятэка будучыні" стала "бібліятэкай сучаснасці".

Састарэлы даўгабуд і...

Дзіўная рэч: на ўсе нашы пытанні, дзе ў Вялікай Ухалодзе клуб знаходзіцца, маладзёны толькі пасмейваліся. А адна кабета зазначыла не без іроніі: "Ды бліжэйшы, відаць, у Барысаве". Што за дзівы: вёска з паўтаратысячным насельніцтвам, з жывой школай — ды без СДК? Не можа быць! Пытаемся, шукаем і зноў вяртаемся да школы, побач з якой — недабудаваны гмах, які звычайна называюць "гаргарай" і які мы прынялі спачатку за нейкае прамысловае безаблічнае збудаванне. "Вось вам і клуб", — падказвае мінак і з прыкрасцю маша рукой. А мясцовая бабуля распавядае, што будаваць "культурны" палац распачалі... ці не трыццаць гадоў таму. За гэты час новае пакаленне вялікаўхалодцаў вырасла. Але "недафінансаванне", відаць, — слова ўстойлівае і далёка не архаічнае.

Больш за тое: даўгабуд (ці недабуд?) за гэтыя гады стварыў для вяскоўцаў немалую праблему. Па іх словах, будынак пакрысе развальваецца, не ахоўваецца, а паколькі знаходзіцца паблізу школы, дык уяўляе з сябе немалую небяспеку для дзяцей, якіх сюды як пішчом цягне. Сапраўды праблема... Распавялі нам і пра тое, як калісьці нейкі ахвотны і разваротлівы прапанаваў мясцовым уладам будынак выкупіць ды зрабіць тут нешта кшталту цэнтра адпачынку з кавярняй. І нават гатовы быў выдзеліць месца для СДК. Не атрымалася. Неаспрэчна, рэстарану з казіно — не месца ля школы. Але і сённяшняя "гаргара" пейзаж ніяк не ўпрыгожвае. На жаль, з такімі праявамі нам давядзецца сустракацца і ў іншых раёнах. Але пра гэта — у свой час.

...Вера непахісная

"Пачакайце, — пераб'е наш расповед неабыякавы чытач, — дык што, у вёсцы сапраўды клуба няма?" Ёсць. Але гэта чарговая і вельмі таямнічая ды парадаксальная гісторыя. Справа ў тым, што клубная ўстанова, як высветлілася, займае ў школе... адзін з класаў. Тут нават шыльдачка захавалася: "Клас ігры на баяне". А вось працоўнага раскладу клуб-

На людным месцы

Юныя лаўраты з педагогамі.

Чатыры прэміі — лаўрэатам года

На выніковай калегіі Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта адбылося ўручэнне штогадовых прэмій. Чатыры з іх прысуджаны выхаванцам Аршанскай дзіцячай школы мастацтваў № 3 (г. Барань) — лаўрэатам міжнародных конкурсаў фартэпіяннай музыкі, гісторыі музычнай творчасці і выяўленчага мастацтва Настассі Калінінай, Вадзіму Максімаву, Кірылу Атрошчанку і Дзіяне Рудаковай.

БАРАНЬ

Падтрымка адоранай моладзі — дзяржаўная маладзёжная палітыка, дзякуючы якой назапашваецца магутны кадравы патэнцыял у творчым асяродку: будучыя кампазітары, музыканты, мастакі...

Вучыць такіх дзяцей — няпроста, бо ад выніковасці гэтай працы залежыць наш заўтрашні дзень. Педагогі ДШМ № 3 цудоўна разумеюць ускладзеную адказнасць. Гэтымі днямі наш калектыў віншуе выкладчыкаў дзяцей-пераможцаў Кацярыну Ігнацьеву, Вікторыю Грыцук і Галіну Высоцкую!..

Прэміі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў прысуджаюцца з 2009 года. Імі ўзнагароджваюць навучэнцаў устаноў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы мастацкага профіля ў сферы культуры і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (музычныя каледжы, Каледж культуры і мастацтваў). Уладальнікамі прэмій становяцца пераможцы заключных этапаў міжнародных, рэспубліканскіх, абласных творчых конкурсаў, алімпіяд па навучальных прадметах.

Наталля ЛАТЫШАВА, настаўнік Аршанскай ДШМ № 3 горада Барань

Роднай мовы пералівы

У Чавускай дзіцячай бібліятэцы вучні СШ № 1 сустрэліся з паэтам, сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі Міколам Салаўцовым. Падзея прысвячалася Міжнароднаму дню роднай мовы, што адзначаецца ў свеце 21 лютага.

Удзельнікі вечарыны сфатаграфаваліся з паэтам.

ЧАВУСЫ

Сустрэчу распачала загадчык бібліятэкі Таццяна Філіпенка. Яна распавяла, як 21 лютага 1952 года загінулі пяць студэнтаў, што змагаліся за наданне мове бангла статуса дзяржаўнай у тагачасным Пакістане, усходняя частка якога пазней стала незалежнай дзяржавай — Бангладэш. Свята было заснавана ў лістападзе 1999-га і з 2000 года адзначаецца ва ўсім свеце. Генеральная Асамблея ААН падтрымала рашэнне пра абвяшчэнне Міжнароднага дня роднай мовы і заклікала са-

Не паўтараць памылак

У Сухопальскім СДК прайшоў вечар-адкрыццё "Духоўныя святыні Пружаншчыны".

ПРУЖАНЫ

Падзею арганізавалі супрацоўнікі сельскай бібліятэкі і Дома культуры. Сабраліся розныя па ўзросце людзі — ад вучняў мясцовай школы да сталых жанчын і мужчын. Аповед аб знішчаных і наноў адбудаваных праваслаўных святынях Пружаншчыны, падмацаваны слайд-прэзентацыяй ды вершамі духоўнай тэматыкі, не мог не крануць душу. А яшчэ ў зале гучалі песняспевы ў выкананні вакальнага ансамбля "Амафор" Рудніцкага сельскага дома культуры пад кіраўніцтвам Наталлі Карсанюк.

Падобныя мерапрыемствы выхоўваюць і засцерагаюць ад паўтарэння памылак. Як у выпадку з праваслаўнымі храмамі, створанымі рукамі ды розумам продкаў, аб якіх цяпер з сорамам пішам: "Не захаваліся"...

24 лютага Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа прадстаўляе вечар, прысвечаны **Аляксандру Блоку**.

най установы нам адшукаць не ўдалося. Калі гэты клуб працуе? І што ўвогуле можна арганізаваць у невялічкім пакоі? Хіба заняткі аднаго гуртка? Актавая школьная зала, як клубная і дыскатэчная, не выкарыстоўваецца. Прынамсі, пра гэта нам школьнікі ды сталыя вясковыя жыхары паведамілі. Сітуацыя, пагадзіцеся, — нелагічная ды парадаксальная. Дык хіба ў Вялікай Ухалоды ніякіх перспектыў? Ну не стала гэтая вёска аграгарадком! Няўжо адсутнасць такога статуса — прысуд для вяскоўцаў?

Але, як кажуць у народзе, святое месца пустым не бывае. У гэтым пераканаліся, калі, блукаючы па вёсцы ў пошуках клуба, завіталі ў мясцовую царкву, дзе пазнаёміліся з настаяцелем храма айцом Аляксандрам Пачобкам. Філолаг па першай адукацыі, член Біблейскай камісіі Беларускага Экзархату, якая займаецца перакладам Бібліі на беларускую мову, ён штодня прапаведуе Слова Божае на роднай мове.

Хапае часу яму і актыўна супрацоўнічаць з мясцовай школай, бібліятэкай ды нават работнікамі культуры раёна, якія неаднаразова запрашалі айца Аляксандра паўдзельнічаць у абрадах зажынак і дажынак: асвяціць палеткі ды сабраны ўраджай.

Ва ўмовах адсутнасці Дома культуры багата моладзі прыходзіць да Аляксандра Пачобкі на заняткі ў нядзельную школу, дзе акрамя ўласна вывучэння Закону Божага дзеці і падлеткі ўдзельнічаюць і ў мастацкай самадзейнасці. Так, да мінулых святаў у мясцовай школе яны прадставілі літаратурна-вакальную праграму пад назвай "Святло Зоркі".

На думку святара, праблема нашага грамадства ў тым, што яно надзвычай меркантылізуецца. Людзей ужо мала цікавяць кнігі, бібліятэкі, а нізкі ўзровень культуры азначае, у тым ліку, і адсутнасць веры… Толькі пакрысе, карпатліва працуючы з людзьмі, можна дамагчыся ў іх пазітыўных змен, у першую чаргу — любові да бліжняга і да роднай культуры. Мо таму і адбываецца такое актыўнае супрацоўніцтва наста-

Надзея Мацюшонак з наведвальнікамі бібліятэкі ў Вялікай Ухалодзе.

Даўгабуд у той жа вёсцы.

Айцец Аляксандр з прыхажанкамі.

Працяг матэрыялаў чарговага, дзясятага па ліку, аўтатура "К", што ахапіў раёны Міншчыны і Віцебшчыны, **чытайце ў наступных нумарах "К".**

яцеля храма і з ухалодаўскай бібліятэкай? Тыя ж духоўныя сустрэчы ды чытанні, прымеркаваныя да ўшанавання падзвіжнікаў беларускай зямлі, сталі ўжо рэгулярнымі. Што і казаць, калі ў самой царкве дзейнічае, мяркуючы па ўбачаным, някепская прыхадская бібліятэка. Поруч з царкоўнай літаратурай маецца там і класіка: Антон Чэхаў, Янка Купала, факсімільныя выданні Францыска Скарыны, цікавая дзіцячая літаратура на беларускай мове. І, паверце кнігалюбам са стажам, некаторым выданням пазайздросціць нават публічная бібліятэка!

Імпануе нам і яшчэ адна рыса айца Аляксандра, якая мусіць быць у кожнага работніка культуры: шанаванне народных традыцый. Завітваючы ў храм, трапляеш нібы на выстаўку ў этнаграфічным музеі: кожная ікона ў храме аздоблена тканым ручніком. Захоўвае прыход і памяць пра знішчаны ў мінулым стагоддзі храм у ваколіцах Вялікай Ухалоды, клапатліва даглядаючы святую крыніцу, да якой штогод адбываецца хрэсны ход. Думаецца, калі ўсё ж з'явіцца ў Вялікай Ухалодзе СДК, то той жа гурток па краязнаўстве мог бы ўзначаліць менавіта айцец Аляксандр, які хоць і нарадзіўся на Глыбоччыне, але цудоўна ведае гісторыю навакольных вёсак Барысаўшчыны. Чым не прыклад для культасветработнікаў?..

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Айцец Аляксандр доўга тлумачыў мне, што такое подзвіг зямнога жыцця. Збольшага гэта — перамога над уласнай абыякавасцю. Так, культуры без веры не бывае. Як і веры без культуры. У што веру я? У святую жыццядайнасць беларускай вёскі. І не хочацца ўяўляць, што праз лічаныя гады ў нас застануцца толькі аграгарадкі, якія горадам не здолелі пакуль стаць, а вёскай ужо перасталі быць. Вёскай, дзе ніводнага падобнага дома, вёскай, дзе ліштвы на аканіцах у кожнага гаспадара — розныя. Дзе свойскі статак — бязмежны. Не будзе гэтага, дык неўзабаве знікнуць школа ды крама, а потым — і сама вёска. Няўжо такі ж лёс чакае і Вялікую Ухалоду? Хочацца верыць, што, пакуль там робяць сваю справу Надзея Мацюшонак ды айцец Аляксандр, гэтага не здарыцца…

Сустрэнемся ў галерэі!

Пад музыку ўкраінскага гурта "Скрабін" не заўважаем, як трапляем да чарговага нашага прыпынку — у горад **Крупкі**. Прыпаркаваўшыся каля мясцовага кінатэатра, запыталіся ў першых сустрэчных пра месцазнаходжанне ўстаноў культуры горада. Цікавіла, у першую чаргу, раённая бібліятэка. Як патлумачылі нам мінакі, ужо некалькі гадоў як ЦБС месціцца ў адным невялічкім будынку разам з дзіцячай бібліятэкай і немаведама колькі часу збіраецца пераехаць… "К" пісала пра гэтую сітуацыю неаднаразова, таму мы вырашылі не вярэдзіць раны, а спачатку скіравацца ў мясцовы Палац культуры. Паблукаўшы ў адзіноце будзённага дня па першым і другім паверхах будынка, ужо было сабраліся сыходзіць, як заўважылі лесвіцу, што вядзе ці то на мансарду, ці то на трэці паверх. Як аказалася, месціцца там мастацкая галерэя.

Якія цікавосткі мы ўбачылі ў галерэі, у чым адметнасць філарманічнай пляцоўкі ў Крупскай ДШМ, што з сябе ўяўляе аптымізацыя бібліятэк у Бабры і якім гэты гарадскі пасёлак бачаць у недалёкай (а мо і далёкай) будучыні мастакі, — пра гэта і не толькі чытайце ў наступным выпуску аўтатура "К".

Агульнае (не)лірычнае адступленне

Хочацца ездзіць па Беларусі і адно толькі радавацца. З'явам, людзям, падзеям, нечаканым адкрыццям… Хочацца аналізаваць толькі станоўчае. Пакуль не атрымліваецца. Іншым разам даводзіцца шукаць логіку парадаксальных учынкаў і з'яў. Шкада: занадта шмат часу гэта ўсё вымагае. Для розуму — карысна, для агульнай справы — не вельмі…

Фота аўтараў К

дзейнічаць абароне ды захаванню ўсіх моў свету. Як кожны народ, вялікі ці маленькі, мы таксама маем сваю родную мову. Большасць тых, хто жыве на Беларусі, лічыць беларускую мову роднай.

Затым адбыўся конкурс чытальнікаў вершаў беларускіх паэтаў аб роднай мове, прагучалі загадкі з "Чароўнага куфэрка". На вечарыне гучалі і вершы Міколы Салаўцова аб роднай мове, аб Беларусі.

Выступіў і сам Мікола Салаўцоў — аўтар такіх зборнікаў вершаў, як "Азбука зорнага неба", на якім пакінуў свой аўтограф лётчык-касманаўт СССР Віктар Афанасеў, калі наведваў Чавусы ў 2004 годзе, а таксама "Жыцця акорды", "Вясёлка лёсу", "Сінія валошкі". Прысутныя атрымалі памятныя падарункі ад паэта і ад Дзіцячай бібліятэкі.

Мікола ЧАВУСКІ,
сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі

У аддзеле бібліятэчнага маркетынгу Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Міколы Засіма створаны Банк інфармацыі па духоўным выхаванні. Тут могуць дапамагчы ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў на згаданую тэму. А на сайце бібліятэкі можна азнаёміцца са сцэнарыямі імпрэз, якія ладзяцца для жыхароў горада.

Ніна ШАБУНЯ,
галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Міколы Засіма

Праекты і перамога

Дзіцячая музычна-мастацкая школа мастацтваў № 1 Мінска налета адзначыць 35-годдзе. Гэтую падзею мастакі ўжо цяпер падтрымліваюць выстаўкамі, музыканты — канцэртамі. І самае галоўнае — вучні ўдзельнічаюць ды перамагаюць ц прэстыжных конкурсах.

МІНСК

Вучаніца ўстановы Аляксандра Шыманская заваявала другое месца і атрымала дыплом II ступені на штогадовым Міжнародным калядным конкурсе-фестывалі дзіцячай выяўленчай творчасці "Віфлеемская Зорка" ў Маскве. Педагог дзяўчыны і загадчык філіяла мастацкага аддзялення школы Ларыса Зарубіна лічыць, што ўдзел у такіх конкурсах дапамагае не толькі засвоіць навыкі ды раскрыць свае магчымасці, але і пашырыць веды па гісторыі, літаратуры, экалогіі, дазваляе даведацца пра звычаі ды традыцыі іншых народаў і краін. Таму вучні мастацкага аддзялення штогод — і вельмі паспяхова! — удзельнічаюць у "Віфлеемскай Зорцы".

Ужо васямнаццаць гадоў гэты конкурс носіць статус міжнароднага. У ім бяруць удзел юныя мастакі з Расіі, Беларусі,

Ларыса Зарубіна з вучаніцамі.

Украіны, Сербіі і Балгарыі. З вялікай колькасці дзіцячых работ вельмі цяжка выбраць 30 прызавых…

І вельмі важна, што выхаванцы Музычна-мастацкай школы цудоўна ўсведамляюць: у прыродзе мастацтва закладзена сіла, якая гуртуе народы свету, умацоўвае ўзаемаразуменне. У выхаванні гэтых маральных каштоўнасцей, эстэтычных ідэалаў і бачыць сваё прызначэнне дырэктар школы Жанна Куеўда. Менавіта на гэта працуюць пленэры, конкурсы, выстаўкі, творчыя праекты ўстановы.

Таццяна МАЛЫШАВА,
член Беларускага саюза мастакоў

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на

facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby

---

Бяспека жыцця

Каб не было бяды

Для папярэджання пажараў і гібелі людзей з 2 па 27 лютага праходзіць рэспубліканская акцыя "Бяспека — у кожны дом!". Яна складаецца з чатырох этапаў і ладзіцца на прадпрыемствах ды ў арганізацыях, дашкольных і агульнаадукацыйных установах, ВНУ, каледжах, а таксама — у месцах масавага знаходжання людзей.

Асноўнымі прычынамі ўзнікнення надзвычайных сітуацый у жылым сектары па-ранейшаму застаюцца неасцярожнае абыходжанне з агнём, парушэнне правілаў эксплуатацыі пячнога ацяплення і электраабсталявання, дзіцячае свавольства. Таму папярэджанне небяспечных выпадкаў — аснова згаданай акцыі.

Работнікі МНС даводзяць, што кожны год у краіне ўзнікае больш за сем тысяч надзвычайных сітуацый. Гіне каля тысячы чалавек. Практычна 90 працэнтаў загінулых знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення. Акурак цыгарэты, трапляючы на пасцельныя рэчы, праз пятнаццаць хвілін становіцца прычынай пажару. Смяротную дозу чаднага газу чалавек атрымлівае менш чым праз тры хвіліны.

Калі перагружаць электрычную сетку, пакідаць электрапрыборы (ды яшчэ няспраўныя) у рэжыме "чакання" на доўгі час, дык рана ці позна прыйдзе бяда.

З агнём гуляюць дзеці, а вінаватыя — бацькі. Запалкі ці запальнічка, пакінутыя на бачным месцы, непазбежна апынаюцца ў дзіцячых руках. І колькі ні папярэджвае МНС бацькоў, дзеці застаюцца без нагляду. Летась на пажарах загінула 14 дзяцей, сёлета — ужо адзін…

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС г. Мінска

Персанальная выстаўка мастачкі Ядзвігі Сянько **"Свет іконы"** з 2 сакавіка працуе ў Музеі тэатральнай і музычнай культуры.

Тактыка культурнага развіцця

Дык вось, пра бібліобус...

У Бярозаўскай ЦБС падводзяць вынікі леташняй дзейнасці. Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ Ала Драган асабліва адзначае бібліятэкара бібліобуса Таццяну Кулініч. Паказчыкі 2013 года па дзейнасці "кнігаперасоўкі" аказаліся значна перавыкананымі. Усё як у тым выслоўі: хтосьці гуляе пад дажджом, а хтосьці пад ім мокне. Інакш кажучы, для бібліятэкараў Бярозаўшчыны атрыманне задавальнення ад працы — праява прафесійнай годнасці.

Яўген РАГІН

Дык вось, пра бібліобус. У мінулым годзе наведаў ён 29 вёсак, абслужыў 400 карыстальнікаў, выдаў больш за 11 тысяч дакументаў, сярод якіх — 47 найменняў часопісаў і газет. У сярэднім аўтабібліятэка пабывала ў адной канкрэтнай вёсцы два разы на месяц. Разумею, для кагосьці гэты паказчык — як для быка чырвоная анча. Аднак прафесіяналы раўзумеюць, што праца з людзьмі вымагае поўнай аддачы сіл. Тады і людзі адказваюць тым жа.

Сярод жыхароў 29 вёсак чытачамі з'яўляюцца больш за 63 працэнты. І гэта не толькі пенсіянеры — 38,5%, — але і работнікі вытворчасці — 37%. Пагадзіцеся, лічбы вельмі красамоўныя. І самі па сабе яны не ўзніклі…

Трыццаць гадоў мінула з моманту выхаду кнігі "Памяць. Бярозаўскі раён". Не дзіва, што вырашана было яе перавыдаць. У тым ліку і для таго, каб пашырыць звесткі пра ўстановы культуры. Цяпер кніга ўтрымлівае падрабязныя звесткі пра ўсе 36 бібліятэк раёна. Значна павялічылася колькасць каляровага фотаматэрыялу. Словам, аддзелу бібліятэчнага маркетынгу давялося ў чарговы раз папрацаваць у звышнапружаным рэжыме.

Па выніках леташняга Рэспубліканскага агляду-конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" трэцяе месца сярод сельскіх устаноў у намінацыі "За пошукавую і даследчую працу" заняла Вайцяшынская СБ. Кіруе ёй Лідзія Рудзьман.

Бібліятэка сапраўды незвычайная. Тут дзейнічае зала этналогіі сялянскага побыту. Лідзія Іванаўна разам з чытачамі сабрала па навакольных вёсках Пескаўскага сельскага савета больш за тысячу экспанатаў, што распавядаюць пра вясковую традыцыю: жыццё і працу мясцовых сялян. Лідзія Рудзьман разам з дзецьмі ладзіць у гэтым антуражы самыя розныя этнагульні.

У той зале можна пазнаёміцца і з рэканструкцыяй сядзібы графоў Пуслоўскіх, якую выканалі студэнты Брэсцкага педагагічнага ўніверсітэта. Ёсць таксама экспазіцыя, прысвечаная мясцовым ветэранам вайны і працы.

І гэтага хапіла б, каб надоўга задумацца, а як вайцяшынскі бібліятэкар паспявае спраўляцца яшчэ і з абслугоўваннем чытачоў. Але ж у дадатак да ўсяго дзейнічае ва ўстанове другая зала, дзе працуе лясная школа, створаная па ўзоры колішняй партызанскай. І тут таксама заўжды шмат дзяцей.

Зразумела, што настаўнікі раёна лічаць сельскую бібліятэку вёскі Вайцяшын своеасаблівым школьным філіялам. Тут можна і літаратуру выкладаць, і гісторыю з матэматыкай. І не бяды, што замест лічыльнага матэрыялу — лясныя шышкі. Галоўнае, што любое мерапрыемства ў такім атачэнні праходзіць цікава ды займальна, без бюракратычнага фармалізму, які ў аснове нішчыць любую справу.

Думаю і без статыстычных доказаў зразумела: калі ў дзвюх "музейных" залах бібліятэкі заўжды людна, дык і на абанеменце наведвальнікаў хапае. Спрадвечны закон: колькі ўкладзеш, столькі і займееш.

Хтосьці з вялікіх сказаў, што бібліятэкі — вокны, праз якія бачна душа і бібліятэкара, і чытача. У Бярэзінскім раёне хапае вокнаў, дзе не згасае прывабнае для ўсіх святло… К

Музычная школа: бачанне дырэктара

Што ў аснове дадатковай?

"Рух — гэта жыццё", — казаў старажытнагрэчаскі філосаф Арыстоцель. Але ці магчымы гэты рух у цішыні, без прыгажосці гукаў і мелодый? Рухацца ў правільным кірунку вучаць у Музычнай школе № 1 Баранавічаў. Больш як 700 дзяцей тут навучаюцца на бюджэтнай аснове, каля 130 — на платнай.

— Такая вялікая школа ёсць толькі ў Мінску, — кажа дырэктар установы Алена КУЗЬМІЧ. — Тут маюцца фартэпіяннае, струннае, струнна-народнае, духавое, тэарэтычнае, харавое, эстраднае аддзяленні, а таксама кірункі падрыхтоўкі канцэртмайстраў і агульнага фартэпіяна.

Эстрада — гэта складана

— Нашым вядучым напрамкам застанецца класіка: фартэпіяна, струнныя, народныя інструменты, — адразу зазначае дырэктар школы, чые развагі і сталі асновай дадзенага матэрыялу. — Акрамя таго, мы развіваем эстрадны кірунак, які многім здаецца надзвычай простым. Але сапраўдная эстрада, менавіта прафесійная, — гэта вельмі складана. Да ўсяго, знакамітыя эстрадныя вакалісты ці інструменталісты прайшлі як мінімум класічную школу. Якасных метадычных дапаможнікаў па такім напрамку няма, таму мы вучымся разам з дзецьмі, спазнаючы новае, выпраўляем памылкі. А будаваць штосьці разам — вельмі цікавы працэс.

Алена КУЗЬМІЧ.

Для сучасных дзяцей

— Зараз прыярытэт для дзяцей — агульнаадукацыйная школа (хаця дзеці ўсё больш стамляюцца там: адна з маіх вучаніц прыбягае ў музычную школу ўся счырванелая, а, супакойваючыся, амаль засынае), а наша забяспечвае дадатковую адукацыю. І, урэшце, мы акурат пашыраем кругагляд дзіцяці. А калі ў музычнай школе на занятках па спецыяльнасці два-тры разы на тыдзень настаўнік застаецца самнасам з вучнем, тады ён цалкам можа аддаваць яму сваю энергію, пражываць разам з дзіцем яго жыццё. Да ўсяго, мы стараемся, каб вучні не толькі працавалі ў музычнай школе, але і адпачывалі. Я назвала б музычныя школы ды школы мастацтваў школамі радасці, напрыклад. Вось таму настаўнікам і варта будаваць заняткі так, каб праз музычную працу атрымлівалася радасць ды асалода…

Але нам цяжка не столькі з сучаснымі дзеткамі працаваць, колькі з мамамі і татамі: часам зусім няпроста пастлумачыць дарослым усю важнасць музычнай адукацыі. Няхай дзіця не стане прафесіяналам, але навучыцца працаваць, у яго з'явіцца пачуццё адказнасці, музычны густ, пачне развівацца цярплівасць. Ну, і час без камп'ютара таксама мае значэнне…

Музычная школа здольная зацікаўліваць сваіх вучняў новымі падыходамі ў адукацыйным працэсе. Напрыклад, у дзяцей ёсць магчымасць граць пад суправаджэнне фанаграмы, і ім тое падабаецца, нібыта яны выступаюць з аркестрам. У гэтым выпадку фанаграма дысцыплінуе, вучыць працаваць у камандзе, а дзеці праз тое самі просяць паяднаць іх у ансамблі: трыа, квартэты. Прычым нярэдка прыносяць фанаграму, якую знайшлі ў Інтэрнэце, ды жадаюць пад яе граць...

■ Алена Кузьміч: "Да нас прыходзіць працаваць даволі шмат моладзі. Раней гэта былі незацікаўленыя маладыя людзі. Але сітуацыя змянілася. **Збольшага прымаем тых, хто свядома зрабіў свой выбар прафесіі**".

Народны камерны аркестр "Arco" Баранавіцкай ДМШ № 1.

Што пяюць фінансы?

— За час дзеяння Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" істотна павялічылася фінансаванне. На яе сродкі мы можам набыць добрыя інструменты для лепшых вучняў. Сёлета, напрыклад, купілі шэсць скрыпак, акардэон, які каштуе, як пісалі ў адной газеце, "больш за гараж" — каля чатырох тысяч долараў, — духавыя інструменты, апаратуру. Таксама школа зарабляе грошы праз платныя канцэрты. За кошт такіх сродкаў купляем мэблю і кнігі, жалюзі. Але на дарагі інструмент школа не заробіць самастойна…

Пра дасягненні

— У апошнія гады ганарымся народнікамі (баяністамі, акардэаністамі) праз іх поспехі — ад дыпломаў да першых месцаў — як на гарадскіх, так і на міжнародных конкурсах. Зараз дзеці рыхтуюцца да чарговага Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўча-народных інструментаў імя Іосіфа Жыновіча. Наш колішні вучань-віяланчэліст Сяргей Ніколін прымаў удзел у Рэспубліканскім конкурсе "Музыка надзеі", прайшоўшы ў другі тур. Зараз ён займаецца ў Санкт-Пецярбургу. Саксафаністы таксама дастаткова прыносяць нам "дывідэндаў", як і калектывы — дзіцячыя ды дарослыя. Не магу не згадаць лаўрэатаў спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі: акардэаніст Даніил Мартынчык, баяніст Ілья Барбарыч, саксафаніст Кірыла Кастыка. Аляксандра Адаська — пераможца мінулага сезона конкурсу "Я пяю!". Прыблізна 5 — 10% выпускнікоў працягваюць пасля музычнай школы навучацца музыцы далей…

Маладыя кадры

— Да нас прыходзіць працаваць даволі шмат моладзі. Раней гэта былі незацікаўленыя маладыя людзі, якія хутка сыходзілі. Але сітуацыя змянілася. Збольшага прымаем тых (за апошнія гады — дзесяць чалавек), хто свядома зрабіў свой выбар прафесіі. Аддаём перавагу асобам з вышэйшай адукацыяй, таму што мы — цэнтральная школа, якая мае права выбіраць сваіх будучых профі. Тым жа, хто працуе, але не мае такой адукацыі, раім павышаць кваліфікацыю. Канешне, маладыя настаўнікі яшчэ не ўсё ўмеюць, але — стараюцца, і моладзь любіць сваю працу. Школа — гэта не проста праца, а яшчэ і месца, дзе ёсць сябры, калегі, якія могуць дапамагчы. Калі ў маладога настаўніка ёсць такая падтрымка, ён і да вучняў ставіцца інакш.

Я пераканана: чалавек, які хоча прафесійна займацца якой-небудзь справай, асабліва калі гэта выкладчыцкая дзейнасць, павінен разумець, што мусіць аддаць ёй усё жыццё. І лічу няпраўдай сцвярджэнне, што беларуская культура вымірае. Час сведчыць: у нас дастаткова моладзі, якой цікава займацца мастацтвам. Але зараз, канешне ж, мы перажываем няпросты час у культурным працэсе: людзі думаюць, як зарабіць грошы... Але без культуры не будзе чалавека...

Студыя і нюансы

— Мы прапаноўваем ахвотным займацца ў нашай студыі. Бывае так, што некаторым дзеткам цяжка адолець усе музычныя прадметы: спецыяльнасць, сальфеджыа, музычную літаратуру, аркестр. А ў студыі яны могуць выбіраць, якія прадметы ім неабходны. Так і дарослыя могуць прыйсці і займацца. Кошт аднаго прадмета чатыры разы ў месяц — 180 тысяч беларускіх рублёў. На бюджэтнай аснове пры музычнай школе — ад 75 да 90 тысяч беларускіх рублёў у месяц. Адзначу, што ў музычную школу на бюджэтную аснову могуць паступаць дзеці да 12 гадоў. Калі прыходзяць пазней — атрымліваюць адукацыю на платнай аснове.

Тыя, хто скончыць нашу студыю, таксама атрымае пасведчанне. Але больш значны дакумент, канешне ж, — пасведчанне аб заканчэнні музычнай школы. Урэшце, летась быў выпадак. Прыйшоў хлопец, які захацеў паступаць ва Універсітэт культуры. А там, каб яго дапусцілі да іспыту, патрабавалася паказаць які-небудзь дакумент, што звязваў бы яго з музыкай. У нашай студыі ёсць курс паскоранага навучання, які ён паспяхова прайшоў за год, пасля чаго атрымаў пасведчанне.

Ведаеце, так хацелася б, каб музычная школа дапамагала дзецям у іх нялёгкіх буднях. Мы — не проста дадатковая адукацыя, а яшчэ тое месца, дзе дзеці развіваюць чалавечыя якасці і шмат чаму вучацца…

Вікторыя ГОМЗА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

ф о т а ф а к т

У случчакоў і...

Такія паясы папулярныя ў турыстаў і случчакоў, расказалі карэспандэнту "К" у Квасыніцкім цэнтры рамёстваў Слуцкага раёна. Чым жыве ўстанова і ўся сфера культуры краю, мы распавядзём у адным з наступных нумароў.

Выстаўка **"Адлюстраванне позірку"** адкрылася на гэтым тыдні ў Мемарыяльным музеі-майстэрні З.І. Азгура.

Выключна горад

Археалагічны музей Мінска: канцэпцыя з улікам падмуркаў

Археалогія — навука, пакліканая адказваць на гістарычныя пытанні і раскрываць сакрэты. Тым часам Археалагічны музей у Мінску з'яўляецца пакуль не самай зведанай кропкай для гараджан і гасцей нашага старажытнага горада. Пра тое, што адбываецца ва ўстанове культуры па адрасе вуліца Кірылы і Мяфодзія, 6, які курс абраў малады музей і па якім прынцыпе ён працуе, апавядае вядучы навуковы супрацоўнік Музея гісторыі горада Мінска Лідзія МАРКОВІЧ.

Аліна САЎЧАНКА

Месца і прадметы

— Насамрэч, музей сябе яшчэ шукае. Пакуль падрыхтавана само памяшканне. А ўнікальнай асаблівасцю з'яўляюцца аўтэнтычныя падмуркі, выяўленыя археолагамі Інстытута гісторыі НАН, у прыватнасці, Юрыем Каласоўскім, у 2007-м годзе пад час вывучэння гарадскога квартала ў Верхнім горадзе і непасрэдна — на тэрыторыі колішняга мужчынскага бернардзінскага манастыра.

Мы ведаем, што выяўленыя мураваныя падмуркі — адна з манастырскіх гаспадарчых пабудоў, якія змяшчаліся на камянях і цэгле. Тады, відаць, для эканоміі матэрыялаў скарыстоўвалася арачная тэхналогія, здольная ўтрымаць лёгкую пабудову. Але (да такой высновы прыйшлі археолагі) праект так і не завершылі. Больш за тое: ён не нанесены ні на адзін план манастыра! Вось так знаходка падштурхнула праекціроўшчыкаў да ідэі забудовы квартала на дадзенай тэрыторыі. Было вырашана стварыць тут музей, прывязаўшы яго да гістарычнай мясціны і напоўніўшы прадметамі раскопак, якія маюць дачыненне да наваколля. Таму самае цікавае наперадзе: напаўненне вітрын экспанатамі.

Сярод апошніх — прадметы, наўпрост звязаныя з побытам гараджан Мінска (асабліва — XVI — XVIII стагоддзяў), тыя рэчы, што калісьці выкарыстоўваліся ва ўжытку. Калі гэта абутак, то стане відавочна, хто і як яго насіў, дзе на ім ставілі латы. Калі гэта дрэва, то мы прадставім незвычайныя культурныя і побытавыя прадметы. Напрыклад, нашым рэстаўратарам удалося сабраць дзверы пабудовы з культурнага пласта XVII — XVIII стагоддзяў, а таксама асобныя драўляныя ёмістасці (кадушкі, бочку). Маем і вялікую калекцыю драўлянага посуду (лыжкі, талеркі). Ёсць нават драўлянае верацяно. Калі казаць аб прадметах са скуры, гэта могуць быць накладкі, з металу — ключы, замкі, нажы, нажніцы, а таксама дэкаратыўныя элементы. Пахваліцца можам і вялікай калекцыяй керамічных вырабаў: посудам, кафляй, цэглай.

Тэма і крыніцы

— Тэма даследаванняў — Верхні горад Мінска. Да ўсяго, сучасны Верхні горад амаль перадае тое, як Мінск выглядаў у эпоху свайго росквіту — на пачатку XIX стагоддзя. Адпаведна, вялікі тэматычны блок, што закранае музей, — забудова дадзенага гарадскога квартала і манастыры, якія рабілі ўнікальным аблічча Верхняга горада цягам стагоддзяў. Калі адчуем недахоп археалагічных прадметаў, будуць выкарыстаны планы або макеты будынкаў, якія не захаваліся. Маю на ўвазе той жа Дамініканскі кляштар. Урэшце, захаваны, няхай і нязначныя, фрагменты пліткі з манастырскай падлогі: можна выкласці нейкі сюжэт з частак, і ён будзе адгадвацца. Дзесьці нам дапамогуць пісьмовыя крыніцы. Хутчэй за ўсё, іх копіі або муляжы закажам у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі.

Пры гэтым музей сёлета адзначыць першую круглую дату — пяцігоддзе, але яго калекцыя ўжо шырокая. Асноўную частку фонду перадаў археолаг Сяргей Тарасаў, які праводзіў работы на Нямізе, дзе сёння размешчаны гандлёвы цэнтр (Няміга, 3). Невялікую колькасць прадметаў з раскопак тэрыторыі мужчынскага бернардзінскага кляштара атрымалі на часовае захоўванне ад Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Прычым на працяг супрацы з апошнім мы вельмі спадзяёмся: яго спецыялісты праводзілі раскопкі і на гэтай плошчы. Магчыма, яны таксама перададуць свае калекцыі, што будуць прадстаўлены ў Археалагічным музеі. Дый першапачатковая ідэя праекта палягала ў тым, што выяўленым прадметам не месца ў запасніках, — іх варта дэманстраваць у музеі, тым самым паказваючы гісторыю як канкрэтнага месца, так і засяроджваючы ўвагу на гісторыка-культурных аб'ектах, каштоўнасцях сталіцы.

Лідзія МАРКОВІЧ.

Самыя "дарослыя" экспанаты адносяцца да старажытнарускага перыяду. Матэрыялы ж XII стагоддзя былі знойдзены і проста вось тут. І адкрыццё паслужыла падставай для маштабных археалагічных даследаванняў.

Выстаўка і аб'ём

— Паколькі музей сябе шукае, прынялі выстаўку, каб ужо можна было знаёміцца з гэтым месцам. Таму мы падбіралі сённяшнія экспанаты не выпадкова, хацелі: каб яны ўпісаліся ў гэтыя падмуркі, ва ўнутраную архітэктуру ды інтэр'еры музейнага памяшкання. Таму і спыніліся на выстаўцы даспехаў ваяроў XVI стагоддзя еўрапейскіх армій. Гэта, канешне ж, рэканструкцыі, але вельмі дакладныя, зроблены майстрам з Магілёва Сяргеем Нурматавым, які прадаставіў нам дзесяць камплектаў кераціраў і рэйтараў, воінаў-наймітаў. Налічвалася іх па Еўропе каля сямі тысяч. Цікава, што пазней сяляне, што жылі непадалёк ад месцаў баёў, з замкаў і равоў бралі дэталі даспехаў і выкарыстоўвалі для вырабу сельскагаспадарчых прылад…

Экспазіцыя дапоўнена фрагментамі даспехаў: сабатонамі, якія абаранялі ногі, латнымі рукавіцамі, копіямі ды рэканструкцыямі зброі — і той, што коле, і той, якая сячэ. Цэнтральнае месца ў экспазіцыі займаюць два "чорныя" коннікі — рэйтары, якія атрымалі сваю назву з-за даспехаў. Яны стаяць у два шэрагі — так, як калісьці выступалі і ішлі ў бой. Тактыка называлася "слімак", або "карусель". Асаблівасцю гэтага роду войскаў было тое, што яны скарыстоўвалі агнястрэльную зброю. Вага даспеха чорнага вершніка была каля 50 кілаграмаў — з-за патаўшчэнняў, якія палягчалі ўдары.

Вядома, думаем і над новым выставачным праектам: тут павінна быць аб'ёмная альтэрнатыва, бо памяшканне — вялікае. Ну, і каб усё ўпісвалася ў руіны ды не ўступала ў дысананс з архітэктурай будынка.

Праменад і чарга

— Наш музей з'яўляецца структурнай адзінкай, адной з экспазіцый Музея гісторыі горада Мінска. А вялікі музей сёння пайшоў па шляху выяўлення кропак, звязаных з канкрэтнымі падзеямі ў летапісе горада: розныя храналагічныя этапы ды старонкі гісторыі ў будынках і помніках. І таму музей, з аднаго боку, прыцягвае ўвагу да пэўнага аб'екта, а з іншага — знаёміць з яго мінуўшчынай, кантэкстам ды антуражам.

Паколькі мноства помнікаў знаходзіцца тут, у Верхнім горадзе, атрымліваецца музейны праменад, які можна здзейсніць, пачаўшы знаёмства ў Ратушы, найбольш старажытнай па звязаных з ёй гістарычных падзеях, потым можна прайсці да "Карэтнай", нашай экспазіцыі, далей на шляху — сядзіба XVIII стагоддзя (цяпер — Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага). Ну, і выставачная зала на вуліцы Рэвалюцыйнай. Яшчэ адзін аб'ект, які чакае сваёй чаргі на рэалізацыю, — Музей мінскай конкі. Паколькі адзін складнік экспазіцыі мы ўжо зрабілі (гаворка — пра "Карэтную", што знаёміць з гісторыяй коннага прыватнага транспарту жыхароў Мінска XIX — XX стагоддзяў), лагічным працягам стане разгляд грамадскага транспарту.

Элемент экспазіцыі "Доблесць і слава. Даспехі і ўзбраенне XVI — XVII стст.".

Адзін з экспанатаў выстаўкі.

Наведвальнік і мультымедыя

— Абавязковае патрабаванне да кожнага музея — гэта цікавасць гледача любога веку і падрыхтоўкі. Скажам, наша бягучая выстаўка — прывабная нават для маленькіх наведвальнікаў. Яны не складаюць асноўны кантынгент гасцей, але, тым не менш, за кошт магчымасцей прымерыць нейкія прадметы, сфатаграфавацца на фоне даспехаў увага дзятвы гарантавана! Урэшце, самі даспехі для многіх — гэта нешта рамантычнае, таму на іх заўсёды хочацца паглядзець. І асноўны наведвальнік нашага музея зараз — сем'і: і дарослым цікава, і дзецям падабаецца.

Мы здзіўлены прытокам гасцей, якія сюды завітваюць. Месца цудоўнае, але, на дзіва, малавядомае. Многія прыходзяць і кажуць: жывём у Мінску, а ўпершыню бачым гэтыя мясціны праз прызму гісторыі… Немалы наплыў і турыстаў, магчыма, дзякуючы гатэлям вакол...

Фота аўтара

К

Што ў вас новага?

Праект за праектам

Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Івана Каладзеева

Летась аўтарскі блог "Сельская бібліятэка" вядучага метадыста аддзела бібліятэчнага маркетынгу Барысаўскай ЦРБ Алены Капыток заваяваў Першую прэмію XXII Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" ў намінацыі "За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы". Вынік, на мой погляд, прадказальны: крэатыву ў бібліятэкараў заўсёды хапала. Да слова, спадарыня Алена не спыняецца на дасягнутым, а актыўна працуе над новымі праектамі. Але і ў 2014 годзе, па словах бібліятэкаркі з Барысава, разнастайных акцый у яе ўстанове ладзілася больш чым дастаткова.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Як зазначыла Алена Капыток, летась бібліятэкі горада і раёна штодня наведвала ў сярэднім больш за тысячу чытачоў. Жыхарам Барысаўшчыны сёння прадастаўляюць 44 віды платных паслуг, прыбытак ад якіх склаў у мінулым годзе звыш 135 мільёнаў рублёў. Яшчэ адзін немалаважны факт: цяпер 23 бібліятэчныя ўстановы раёна камп'ютарызаваны, у тым ліку ўсе 13 бібліятэк аграгарадкоў. У раёне створаны 12 мультымедыйных цэнтраў, працуюць тры цэнтры прававой інфармацыі.

Самая станоўчая тэндэнцыя апошніх гадоў заключаецца ў тым, што сельскія бібліятэкі раёна пачалі прымаць удзел у розных міжнародных праектах. Так, дыпломамі ўдзельнікаў Міжнароднага сеткавага праекта "Калядныя гісторыі" Новасібірскай абласной дзіцячай бібліятэкі імя Горкага ўзнагароджаны супрацоўнікі і чытачы сельскай бібліятэкі вёскі Вялікая Ухалода.

Згадала Алена Капыток і тое, што напярэдадні Дня бібліятэк у Барысаўскім раёне ўпершыню адбыўся Рэспубліканскі бібліятэчны велапрабег "На ровары па бібліятэках", арганізаваны ў рамках дзейнасці грамадскага аб'яднання "Беларуская бібліятэчная асацыяцыя". Пра гэтую цікавую акцыю, дарэчы, пісалі і журналісты "К".

Летась, пад час святкавання 90-годдзя Барысаўскага раёна, у ЦРБ урачыста адкрыўся Музейна-выставачны комплекс "Партнёры. Сябры. Пабрацімы", прысвечаны гарадам-пабрацімам Барысава. Сёння на карце музея — 22 гарады з Расіі, Украіны, Эстоніі, Латвіі, Балгарыі, Сербіі, Арменіі, Малдовы, Кітая. Як кажа Алена Капыток, у музеі прадстаўлены памятныя сувеніры і карціны, падораныя Барысаву прадстаўнікамі розных міжнародных дэлегацый.

■ Самая станоўчая тэндэнцыя апошніх гадоў заключаецца ў тым, што **сельскія бібліятэкі раёна пачалі прымаць удзел у розных міжнародных праектах**.

Таксама цягам года ў бібліятэцы быў зладжаны шэраг іншых акцый. Да прыкладу, прайшлі мерапрыемствы ў рамках некаторых рэгіянальных асветніцкіх праектаў "Вяртанне памяці. Першая сусветная вайна", "І памяць подзвігу нам кніга ажыўляе" (да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне), "Чыстаму гораду Барысаву — чыстае слова" (супраць брыдкаслоўя) ды іншыя. Да таго ж, з 2009 года ў ЦРБ рэалізуецца ўласны праект "Інтэграваная бібліятэка" па стварэнні бібліятэчных устаноў, якія аб'ядноўваюць фонды школьнай і публічнай бібліятэк у сельскай мясцовасці. І гэта толькі малая частка таго, над чым летась шчыравалі бібліятэкары Барысаўшчыны…

К

Увесну плануецца завяршыць распачатыя летась раскопкі на **Замкавай гары ў Мсціславе** і перайсці да стварэння музея.

Вяртаючыся да надрукаванага

Бамбардзіроўшчык ДБ-3 (Іл-4).

Дзмітрый Клімачэнкаў.

У "К" № 6 быў змешчаны матэрыял онлайн-канферэнцыі з нагоды 70-годдзя Вялікай Перамогі пад назвай "Знайсці, захаваць, увекавечыць". У перад'юбілейным музейным марафоне прыняла ўдзел і дырэктар Клічаўскага краязнаўчага музея Наталля Храмянкова, якая распавяла, што ў раёне дзейнічае пошукавая група "Ольса" Магілёўскага абласнога цэнтра гісторыка-патрыятычнага клуба "Віккру". Ля вёскі Мяжное, у балоце, група адшукала і 29 — 30 студзеня выцягнула рэшткі савецкага самалёта часоў Вялікай Айчыннай вайны ды астанкі пілота…

Натуральна, мы паабяцалі чытачам прадоўжыць гэтую тэму. На момант першай публікацыі "К" было вядома толькі тое, што на рухавіку самалёта выбіты нумар, па якім можна адшукаць у архівах звесткі пра лётчыка. Меркавалася, што гэта знішчальнік. Супрацоўнікі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Клічаўшчыны распавялі, як колішнія сведкі тых ваенных падзей расказвалі, што над Мяжным быў няроўны паветраны бой. Адзін лётчык нібыта выратаваўся з дапамогай парашута. Значыць, другі наш знішчальнік трапіў у балота разам з пілотам? Днямі пошукавікі і высвятлялі гэтыя пытанні.

Член пошукавай групы Лілія Счыслёнак, метадыст Клічаўскага цэнтра дзіцячай творчасці, падтрымліваючы сувязь з нашай рэдакцыяй, паабяцала трымаць нас у курсе спраў. І вось да нас прыйшоў артыкул, дзе расстаўлены амаль усе кропкі над "і".

К

Гісторыя адной атакі

"Да 3 лютага лічыліся прапаўшымі без вестак…"

Савецкі самалёт, пра які вядзецца гаворка, быў збіты ля вёскі Мяжное восенню 1943 года. Добра захаваліся цыліндры рухавіка і прапелер. На цыліндрах заўважаны нумары, па якіх з дапамогай расійскіх калег з пошукавага форуму "Трызна" быў устаноўлены і нумар самога самалёта — 11013. Такім чынам, толькі праз семдзесят з лішнім гадоў адкрыліся абставіны гібелі савецкага бамбардзіроўшчыка і двух членаў яго экіпажа.

Так, у балота трапіў не знішчальнік, а менавіта бамбардзіроўшчык. Як высветлілася, 27 кастрычніка 1943 года пяць экіпажаў Іл-4 17-га гвардзейскага бамбардзіровачнага авіяпалка авіяцыі дальняга дзеяння вылецелі з аэрадрома "Адуева" (паўднёва-ўсходняя частка горада Мядынь (тады — Смаленская, сёння — Калужская вобласць) з баявым заданнем бамбардзіроўкі чыгуначнага вузла "Мінск". Сярод іх быў і экіпаж гвардыі малодшага лейтэнанта Клімачэнкава.

Пад час пошукавай аперацыі.

Ва ўзнагародным лісце на камандзіра, які адшуканы на сайце "Мемарыял", пра гэты вылет гаворыцца наступнае:

"27.10.43 г. пры налёце на чыгуначны вузел "Мінск" і пасля праходжання лініі фронту самалёт быў атакаваны нямецкім знішчальнікам. Пры гэтым стралок і радыст былі забіты, машына згарэла, сам гвардыі малодшы лейтэнант Клімачэнкаў са штурманам Гваздоўскім спусціліся на парашутах на тэрыторыю, занятую праціўнікам. Пасля многіх намаганняў камандзір і штурман дабраліся да партызанскага атрада, адкуль былі перакінуты праз лінію фронту. 25.01.44 г. Клімачэнкаў вярнуўся ў часць і зноў увайшоў у строй баявых лётчыкаў…"

Пацвярджэнне таго, што савецкі бамбардзіроўшчык ДБ-3 (Іл-4) быў збіты 27 кастрычніка на вышыні 4 600 м у квадраце "Мяжное", было знойдзена ў фашысцкага лётчыка. Яго група начных знішчальнікаў восенню 1943 года базіравалася ў Оршы. Дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву з расійскімі даследчыкамі ўдалося ўстанавіць падрабязнасці трагедыі ў Клічаўскім лесе і лёсы лётчыкаў. Усе яны — 20-25-гадовыя хлопцы, служылі ў 17-м авіяпалку.

Камандзір экіпажа **Дзмітрый Клімачэнкаў,** — 1922 года г. н., ураджэнец Калінінскай (сёння — Цвярской) вобласці — выскачыў з парашутам з палаючага самалёта. Трапіў да партызан, потым вярнуўся ў сваю часць. Працягваў па-геройску ваяваць. Здзейсніў 134 баявыя вылеты, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Пасля вайны даслужыўся да генерал-маёра. Памёр у Палтаве ў верасні 2012 года.

Штурман самалёта гвардыі старшына **Аляксей Гваздоўскі** — 1918 г. н., ураджэнец Варонежскай вобласці — выскачыў разам з камандзірам і з дапамогай партызан вярнуўся ў свой полк. 9 ліпеня 1944 года ў складзе іншага экіпажа быў збіты і з баявога задання не вярнуўся…

Стралок-радыст — начальнік сувязі авіяэскадрыльі гвардыі старшына **Вячаслаў Хайлаў** (1919 г. н., ураджэнец Масквы) і стралок-радыст, малодшы сяржант **Хакім Музафараў** (1923 г. н., ураджэнец Ташкента) загінулі над Мяжным. Да 3 лютага 2015 года лічыліся прапаўшымі без вестак. Цяпер Магілёўскі пошукавы атрад "Віккру" расшуквае родзічаў загінулых.

Група "Ольса" працягвае пошук. Перазахаванне астанкаў Вячаслава Хайлава і Хакіма Музафарава плануецца правесці 9 мая 2015 года.

Лілія СЧЫСЛЁНАК,
член пошукавай групы "Ольса" Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба "Віккру", метадыст Клічаўскага цэнтра дзіцячай творчасці

З працягам: да 70-годдзя Перамогі

З гадоў вайны…

Радыё у барацьбе з фашызмам

У сувязі з акупацыяй Беларусі дзяржаўная радыёстанцыя спыніла сваю работу. Аднак на тэрыторыю рэспублікі працягвалі трансляваца радыёперадачы з Масквы.

З першых дзён вайны радыё вяло тэматычныя перадачы: "Слухай фронт!", зводкі Савецкага інфармацыйнага бюро, "Пісьмы на фронт і з фронту" ды іншыя. Па ініцыятыве Цэнтральнага штаба партызанскага руху, з ліпеня 1942 года Усесаюзны радыёкамітэт пачаў трансляваць спецыяльныя перадачы для партызан. На беларускай мове трансляцыі вяліся ад трох да пяці гадзін у суткі з улікам партызанскай спецыфікі.

Восенню 1941-га фашысцкая прапаганда распаўсюджвала чуткі аб узяцці гітлераўцамі Масквы і Ленінграда. Успамінаючы гэты перыяд, кіраўнік партызанскага руху на Гомельшчыне А.Куцак пісаў: "Откровенно говоря, никто из нас определенно не знал о положении дел на фронтах. Необходимо было иметь достоверные источники. Командир партизанского отряда "Большевик" И.С. Федосеенко поручил товарищам достать радиоприемник. Его собрали из разных деталей. И вот утром 7 ноября мы собрались в землянке. Затаив дыхание слушали голос родной Москвы: в честь 24-й годовщины Октября в столице нашей Родины состоялся военный парад, на котором с речью выступил Верховный Главнокомандующий. Никакие слова не в состоянии выразить того воодушевления, радость и подъем, которые царили в нашей среде. Родная Москва живет, борется!.."

Выпуск лістовак, падпольных газет, арганізацыя вуснай прапаганды, складанне рэпертуару для партызанскай мастацкай самадзейнасці патрабавалі пастаяннай сувязі з Вялікай зямлёй. Камандаванне ворага прымала ўсе меры да таго, каб пазбавіць насельніцтва Беларусі праўдзівай інфармацыі. Фашысты пад пагрозай смерці забаранілі слухаць савецкія радыёперадачы, патрабавалі здачы радыёпрыёмнікаў. Аднак патрыёты хавалі іх ад ворагаў… Партызаны ж захоплівалі прыёмнікі ў якасці трафеяў, здымалі іх з падбітых танкаў і самалётаў, даставалі ў мясцовых жыхароў, выраблялі самі. Рабочыя саўгаса "Суцін" (Міншчына) схавалі ад фашыстаў радыёабсталяванне, якое перадалі партызанам 2-й Мінскай брыгады. Партызанскія радысты радыяфікавалі ўсю брыгаду. У штабе быў радыёвузел, а па атрадах — радыёкропкі. Пры правядзенні савецкіх святаў партызаны вывозілі вузел у суседнія населеныя пункты. Напрыклад, адзначаючы 25-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі ў вёсцы Гарэлец на Пухавіччыне, партызаны ўстанавілі каля 25 рэпрадуктараў.

У 1942-м Цэнтральны і Беларускі штабы партызанскага руху пачалі засылаць на тэрыторыю рэспублікі радыстаў з радыёстанцыямі. На працягу года беларускія партызаны атрымалі 55 радыёстанцый, а ў 1943-м — яшчэ 101. Акрамя таго, па просьбе Цэнтральнага штаба прамысловасць СССР стала выпускаць дэтэктарныя і лямпавыя радыёпрыёмнікі, якія высылаліся партызанам.

1 студзеня 1942 года ў Маскве распачала дзейнасць радыёстанцыя "Савецкая Беларусь". Разам з праграмамі для шырокага кола слухачоў яна вяла перадачы для партызан, служачых, чыгуначнікаў, жанчын, моладзі… Працавалі пастаянныя рубрыкі "Хроніка партызанскай барацьбы", "Саветы партызанам" ды іншыя. Для выдання падпольнага друку была ўведзена спецыяльная радыёперадача "Матэрыялы для абласных, раённых і партызанскіх газет". Яна трансляваліся кожную ноч, і матэрыялы дыктаваліся так павольна, каб можна было запісаць іх тэкст.

За гады Вялікай Айчыннай вайны перад мікрафонам радыёстанцыі "Савецкая Беларусь" выступіла больш за 300 чалавек, было перададзена 70 літаратурных выступленняў і 50 канцэртаў. А ўсяго выйшла 3 270 радыёперадач. У 1943-м падпольныя партыйныя арганізацыі і партызанскія злучэнні Беларусі наладзілі двухбаковую радыёсувязь усіх раёнаў рэспублікі з Масквой.

Радыёматэрыялы значна абагачалі формы культурна-дасугавай работы ў партызанскіх краях і зонах. Зводкі, якія прымаліся радыстамі, друкаваліся ў падпольных друкарнях і перада валіся ў падраздзяленні для палітінфар мацый, вывешваліся на бачнае месца ў размяшчэннях партызанскіх атрадаў. Разам з запісамі радыёзводак камандаванне партызанскіх атрадаў старалася арганізаваць для партызан ды насельніцтва калектыўнае слуханне праграм.

Успамінаючы аб рэйдзе, які правялі на пачатку 1942 года ў Мінскай вобласці, сакратар Мінскага падпольнага абкама партыі Р.Мачульскі пісаў: "Першы прыпынак — у вёсках Хадынка, Абідземля і Сухая Міля. Партызаны ўстанавілі прыёмнік і арганізавалі праслухоўванне маскоўскіх перадач. Людзей набілася поўная хата. Усе слухалі затаіўшы дыханне. Гаворыць родная Масква! Дыктар перадаў апошнія звесткі з савецка-германскага фронту і аб'явіў: "А зараз слухайце музыку". І паліліся знаёмыя мелодыі. У людзей на вочы навярнуліся слёзы… […] Партызанскія калоны рухаліся па начах па 25-30 кіламетраў. А днём — адпачынак, масавая работа з насельніцтвам. Камандзіры атрадаў выступалі з дакладамі, агітатары праводзілі гутаркі, чытку лістовак. У кожнай вёсцы абавязкова ладзілі калектыўнае радыёслуханне".

У мястэчку Кабыльнік (Вілейская вобласць), непадалёк ад варожых гарнізонаў, у базарныя дні з'язджалася больш за 300 падвод з Пастаўскага, Мядзельскага і Свірскага раёнаў. Партызаны брыгады імя Варашылава часта выкарыстоўвалі гэтае мястэчка для правядзення культурна-дасугавай дзейнасці. Група партызан камісара П.Рублеўскага выязджала на базарную плошчу і ўстанаўлівала прыёмнік з узмацняльнікам. Збіраліся людзі. Пасля перадачы выступаў камісар.

Раней радыёпрыёмнікі былі даволі значных памераў. Каб яны працавалі, патрабаваліся высокая антэна і даволі цяжкія батарэі. Радыёпрыёмнік звычайна вазілі на санях або калёсах. Партызанскія ўмельцы, радысты брыгады "Смерць фашызму!" С.Тарасаў і Я.Шышоў сабралі прыёмнік і ўманціравалі яго ў футляр ад патэфона. З гэтым чамаданчыкам, што не выклікаў падазрэння, сябры амаль кожны вечар выязджалі ў навакольныя вёскі ды ладзілі там калектыўныя праслухоўванні маскоўскіх перадач…

Аляксандр ПАЦЫЕНКА, дацэнт, кандыдат педагагічных навук, і Ягор ВАСІЛЕЎСКІ

Працяг артыкула **чытайце ў наступных нумарах "К".**

Выстаўка з цыкла "Краявіды зямлі беларускай: творы класікаў беларускага жывапісу з прыватных збораў" працуе ў Музеі Янкі Купалы.

Абрысы сустрэч з народным паэтам Беларусі

"Каб не быў я атулены крылом Барадуліна…"

Уладзімір Караткевіч, Рыгор Барадулін у гасцях у бацькоў аўтара, чыя сястра Ніна вядзе экскурсію па беразе Рыжскага заліва. Юрмала. Каўгуры. Ліпень 1966 г.

ТЭКСТ

Сяргей ПАНІЗЬНІК,
паэт

"Per aspera ad astra" ("Праз церні да зорак") — так гучыць дэвіз самай высокай узнагароды Латвіі — ордэна Трох Зорак, які быў уручаны народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну ў Літаратурным музеі Янкі Купалы 24 лютага 1998 года. Цудоўны падарунак на Дзень яго нараджэння!

Калісьці Рыгор прызнаваўся: "Мне Латвія асабліва дарагая і блізкая, бо мой дзед Андрэй Галвіньш, механік млыноў, трапіў у Полацк з Рыгі". Але каб стаць Барадуліну кавалерам зорнага ордэна, спатрэбілася дапамога і Райніса, і Веяна, і Ліўзэмніека… Паспрыялі турботы "хроснай маці" — Мірдзы Абалы, якой і я з Васілём Сёмухам удзячны. Асаблівы клопат быў у яе прадстаўляць да ўзнагароды беларусаў "за асаблівыя заслугі перад Латвіяй".

Пра тыя Рыгоравы зоркі з помніка Свабоды ў Рызе пісаў я ў прэсе. Многія сумесныя літаратурныя вандроўкі аказаліся на фотаздымках у друку. І вось з-пад павекаў Часу выглядаюць абрысы сустрэч, што прашумелі за пяцьдзясят гадоў нашага з Рыгорам Барадуліным знаёмства. Спынімся ля некаторых камлёў, якія і сёння пазначаюць многія дарогі праз церні паэтычных пакут да поклічных зорак натхнення.

1966

31 студзеня мяне, курсанта факультэта журналістыкі Львоўскага ваеннага вучылішча, прытуліла на зімовых канікулах сям'я Барадуліных. Трапіў на прыём да Алеся Цімафеевіча Бажко — загадчыка рэдакцыі выдавецтва "Беларусь". Рэдактарам майго зборніка "Кастры Купалля" быў прызначаны Анатоль Кудравец, а вось "на грамадскіх пачатках" апошнім стаў займацца Рыгор. Дзякуючы майму апекуну былы дывізіённы фельчар, а на той час — недаспелы курсант, знаёміўся з творцамі — Яўгенам Шабаном, Юрыем Кушаком, Міхасём Стральцовым, Навумам Кіслікам… А вось пра рэдагаванне ім маіх вершаў і сёння спакойна згадваць не магу, нібыта я зноў на літаратурным эшафоце. Вось Рыгор правіць тэкст, закрэслівае радок — і пяро скрыпіць не па паперы, а нібыта ёрзае па маёй скуры. Урэшце атрымліваю стос лістоў, дзе, ужо алоўкам, пазначана: "Зняць!". Бо і паправіць мае крэмзы не атрымалася. А прысуды такія: "Верша няма. Абкатаныя, як галька, збітыя словы і вобразы"; "Няясны верш, невыразны"; "Агульны, рытарычны"; "Вельмі неакрэслены палітычна"…



Рыгор Барадулін

РУМ ›

Сяргейка, —
пяць! —
Не ад віна
табе я стаўлю
бал такі.
Нам родная з табой
Дзвіна —
Уся твая да Балтыкі!

Рогер

Прысвячэнне Рыгора Барадуліна на тытуле зборніка "Рум".

На лета я выпрасіўся на стажыроўку ў газету Беларускай ваеннай акругі, каб падлагодзіць слабаватыя радкі будучага зборніка. Удзячны быў Рыгору за яго бацькоўскія клопаты.

У ліпені рэдакцыя накіравала мяне ў камандзіроўку ажно за Віцебск. Ад Валі, Рыгоравай жонкі, даведаўся, што мой настаўнік разам з Уладзімірам Караткевічам гасцюе ў Ераніма Стулпана на юрмальскім лецішчы. А мае бацькі і сястра жылі ў юрмальскім жа пасёлку Каўгуры. Дык чаму на выхадныя не зрабіць круг? Дапамагла "Чайка" (фірменны цягнік "Мінск — Талін"), з Рыгі электрычка — і вось я здзяйсняю ўрачысты выхад сухапутных беларусаў да мора. У бацькоў на той час адпачывалі родзічы і знаёмцы з Масквы, Ленінграда, Ташкента. Усе яны былі ўражаны сцэнічным пераўвасабленнем Рыгора і Уладзіміра. Песні, вершы, показкі-пацешкі, жарты-экспромты…

Адбыліся невідонныя, як мама казала, забавы. Узбалтошылі балткрэвы Балтыку!

У жніўні пасля мінскай стажыроўкі я апынуўся ў Кудэпсце, Сухумі. І на борце самалёта, які ляцеў з Каўказа на Украіну, пачаў такі верш, прысвечаны Рыгору:

Мяне адобраю гнялі,
Я чуў парадныя парады…
Але навек я буду рады
Усходам шчырае спагады,
Што з твайго сэрца прараслі…

Ужо ў Львове для далейшага натхнення атрымаў ад Рыгора лірычную кніжачку "Нагбом" з такім надпісам: "Дарагі Сяргей, прымі ад мяне гэты зборнічак, як сотую кропельку расінкі Беларусі. Беларусь ты помніш. Так трымаць! Твой Рыгор. 13.11.66 г. P.S. Чакаю ад цябе зборніка ў адказ".

1967

5 чэрвеня львоўскі курсант атрымаў ад Рыгора некалькі асобнікаў зборніка "Кастры Купалля". Наіўны, пахваліўся здабыткам. Начальства вучылішча ўбачыла там не партрэт курсанта, а лірыка ў вышыванцы. "Не наш!" Пазней было абвешчана, што мне прызначана служба ў чыгуначных войсках Забайкальскай ваеннай акругі. Давялося адправіць тэлеграму Максіму Танку, пісьмо Янку Брылю…

І вось я служу ў дывізійнай газеце ва Уруччы. Прытуляла сям'я Барадуліных, пакуль не атрымаў каморку ў ваенным гарадку. Рыгор першым напісаў рэкамендацыю для прыёму мяне ў Саюз пісьменнікаў, падарыўшы "для ўдасканалення" вялізны "Руска-беларускі слоўнік" з аўтографам: "Надзеі Беларусі — Сяргею ад шчырага, шчырага сэрца! Рыгор. Мінск. 29.X.67 г.". І вось збылася яшчэ адна мая надзея: 24 лістапада я стаў сябрам Саюза. І сёння паўтараю: "Было б горка, каб не Рыгорка, каб не быў я атулены крылом Барадуліна"…

1979

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" падрыхтавала кнігу Стэфана Паптонева "Беларусь — белая балада". Мы ўсе ўзбуджана працавалі, на дружбу народаў — дружбу літаратур. У Мінск прыехаў слаўны балгарын, і я згадзіўся з прапановай Рыгора адвезці іх на яго (вялікую, а не малую) радзіму, далучыўшы і перакладчыка Ванкарэма Нікіфаровіча. На Мемарыяльным комплексе "Прарыў" нас сустракалі з пашанотай. Засталіся фотаздымкі "на памяць". Але самымі дарагімі сведчаннямі з той сустрэчы аказаліся дарчыя надпісы на падоранай мне кнізе "Беларусь — белая балада". Пасля тэксту Паптонева па-балгарску чытаюцца радкі перакладу ад Ванкарэма Нікіфаровіча. І трэці "пласт" — барадулінскі: "Дзякуй, Сяргей, табе за хвіліны радасці дотыку да роднай зямлі! Рыгор. 30.IX.79. Ушачы".

1999

26 лістапада ў Лявонпалі Мёрскага раёна быў адкрыты музей. Будыніна сельскага клуба служыла калісьці польскай стражніцай, і за ёй праз некалькі сотняў метраў заканчвалася на беразе Дзвіны Заходняя Беларусь. А ў XVII стагоддзі тут "падпілавалі" тэрыторыю Рэчы Паспалітай. За Лявонпалем і па сёння стаіць Калона ў гонар Канстытуцыі 3 Мая 1791 года, узведзеная графам Лапацінскім "на агледзіны грознаму непрыяцелю".

Назваць установу дапамог верш Барадуліна "Радзімазнаўства", прысвечаны Алесю Карлюкевічу: "Радзімазнаўства — //Мудрая навука, // Яе адолець могуць дзівакі, //Якім з рукі // Ад сну прачнуць вякі". О, тут, на беразе Дзвіны-Рубона, пазнакі вякоў — куды ні кінься.

2009

Пра кнігу Рыгора Барадуліна "Паслаў бы табе душу…" (ліставанне паэта з мамай Акулінай) мы гутарылі 17 верасня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Наведвальнікам прадставілі здымкі Акуліны Андрэеўны, а таксама мае запісы ейнага голасу. Я назваў Рыгора паэтам мамы і пажадаў такой любові кожнай маме і такую маму — кожнаму паэту.

Песні Акуліны Андрэеўны чакалі такой прылюднасці ажно сорак гадоў. Сям'я Грынчыкаў гасцявала ў Рыгора з Валяй у тыя дні, калі прытулялі там маму Рыгора. 17 — 18 сакавіка 1969-га я запісаў 40 бытэньскіх твораў ад Любы Грынчык і вушацкія вечнасці: "Добра мне, добра мне за маім дзедам…", "Рада, рада, шэра перапёлка…", "А ў цёмным лесесава кугічыць…", "А дайце мне, дайце сем чарак гарэлкі!..". (А вось песню, вельмі падобную да апошняй з названых песень бабулі Акуліны, я запісаў у Лявонпалі ад Вольгі Грэцкай.) Пра запіс твораў было надрукавана ў газеце "Голас Радзімы" ад 9 сакавіка 1974-га, а верш памяці Акуліны Барадулінай я змясціў у сваім зборніку "Пры свячэнні…" (2004).

Не магу не агучыць тут і дарчы надпіс на кнізе "Паслаў бы табе душу…": "Родны Сяргей Іванёнак! Мама цябе любіла, бо ты наш, свой! Хай табе шчасціць! Рыгор. 20.XI.09.". Дзіва, але і назаўтра я быў высока абдораны Рыгорам. На кнізе "Ксты" перачытваю сёння надпіс: "Роднаму нашаму, крывіцкаму Сяргею Панізьніку — з нязменнай падзякай за ўсё добрае, што ён чыніў і чыніць! Рыгор Барадулін. 21.XI.09".

2013

Даўным-даўно заахвоціў мяне Рыгор пільней вычуваць маўленне землякоў. Цешылі прыгаданыя ім прыбабунькі, пацешкі, досціпы. Дзівіўся, калі знаходзіў адпаведнікі на маім прыдзвінскім мацерыку. Вось ад Рыгора: "Яглі — пацалаваліся і спаць ляглі". Ад майго бацькі: "Яглы — няеўшы спаць ляглі". Ад чэхаў дазнаўся: яглы — гэта проса. Слабы, скажам, наедак. Калі на Вушаччыне кажуць: "Не круці духамі", — то ў нас: "Не круці мітулямі". А гэта страшней: ад лічынак стужачных глістоў хварэлі авечкі, козы. І яшчэ адзін цуд параўнання. Рыгор запісаў такі кленіч: "Соль табе ў вочы, малання ў зубы! Траскуча палена табе ў калена!". А мне пад дыхалку — жартам, канешне ж, — лявонпальская Марыля Кезік яшчэ ў 1968 годзе пальнула: "Хрэн табе ў вочы, галавешка ў зубы, перац у нос, клубок нітак паміж лытак, галень паміж калень, пад хвост памяло — каб аж дух заняло!"

Пад Новы год Сяржук Доўгушаў, збіральнік і выканаўца фальклорных рарытэтаў, захацеў разам са мной наведаць сям'ю Барадуліных. Валя прызначыла нам дзень сустрэчы. З дужа дарагімі падарункамі мы пакідалі кватэру на вуліцы Мележа. Дома ўчытаўся ў радкі на кнізе "Вушацкі словазбор Рыгора Барадуліна": "Роднаму Сяргею Панізьніку — дзякуй за ўсё! Рыгор Барадулін. 19.12.3013".

Праз тры дні, выявіўшы новыя паралелі ў лексічных знаходках, я пачаў пісаць верш:

На цабэрак, на гладыш
ты, Рыгорка, не глядзіш.
Вочы квеліш абы-як
на раўгені поўны гляк.
Жэгіны не абжаргаеш,
але суднік славы маеш.
Пажаданкі: не галець,
перад споведдзю…

Верш доўга не мог закончыць, памятаючы даўнейшыя Рыгоравы прысуды: "Зняць!". І вось…

2014

Перад споведдзю гавець,
перад светам выранджацца…
Доіш доднік? Будзь дарадцам
прывіваць жывічны здор
у прыдзвінскі словазбор.

"Так не так, а ператакваць не будзем". Гэта чарговая парада Рыгора.

На Дзень нараджэння я патэлефанаваў Рыгору, павіншаваў, перадаў прывітанні ад масквічоў Івана Бурсава і Ніны Дзябольскай, актыўнай перакладчыцы яго твораў на французскую мову. І дасюль пракручваюцца ў галаве згукі яго развітальных слоў: "Звані часцей!"…

А ёсць што сказаць шчодраму сябру і сёння. Ніна Дзябольская, пераклаўшы амаль усе "Ахвярынкі" Барадуліна, дзясяткі вершаў з кнігі "Ксты", адгукаецца на просьбы аб новых перакладах і дасылае іх з Масквы ў Мінск.

Не для гаркаты, а на задуму, на светлае развітанне хочацца вось цяпер паклікаць чатырохрадкоўе нашай з Рыгорам даўняй сяброўкі — Маі Львовіч з Харкава. 12 красавіка ў адказ на маё журботнае паведамленне яна напісала:

Праўда таму, праўда,
Што зноўку гаворыць сэрца:
Паэт адыходзіць,
А паэзія — застаецца…

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст." .
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст." .
Выстаўкі:
■ Выстаўка **слуцкіх паясоў** са збору Нацыянальнага музея ў Варшаве — да 6 красавіка.
■ Выстаўка **"Mater Dei. Іканаграфія аднаго кахання"** — да 3 мая.
■ Выстаўка жывапісу і графікі Уладзіміра Стэльмашонка **"Летапіс часу"** — да 2 сакавіка.
■ Выстаўка жывапісу Ілоны Касабука **"Танец ветру"** — да 23 лютага.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
Выстаўка:
■ **"Прарок свайго часу. Адам Міцкевіч. Ілюстрацыі і медалі"** — да 25 снежня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:
■ "Старажытная Беларусь".
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да 26 красавіка.
■ Выстаўка **"Музей ёлачных цацак"** — да 1 сакавіка.
■ Выстаўка твораў Яўгена Ждана і Аляксандра Рашэтнікава **"Грані натхнення"** — да 1 сакавіка.
■ Выстаўка **"Мастацтва рускага мадэрна. Пошукі нацыянальнага стылю"** — да 29 сакавіка.
■ Выстаўка **"Альтэрнатыўнае фота Беларусі. Сувязь часоў..."** — да 29 сакавіка.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыя:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".
Выстаўкі:
■ **"Вікінгі і балты: паўночная сага"** — да 12 красавіка.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
Выстаўка:
■ **"Экзатычны свет"** — да чэрвеня.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9А.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстаўка **"Чароўныя матылькі"** — да 23 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
Выстаўка:
■ **"POST SCRIPTUM: першая беларуская выстаўка-фестываль аўтарскай паштоўкі"** — да 15 сакавіка.
Кінапраграмы:
■ Тэматычная рэтра-праграма **"LOVE STORIES 9"** — да 27 лютага.
■ Рэтраспектыва **"Той самы Піткін, або Камедыі для дзяцей ад 3 да 93 гадоў"** — да 1 сакавіка.
■ Рэтраспектыва **"Беларуская мультпраграма. 40 гадоў на экране. Частка 12"** — да 1 сакавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
Выстаўка:
■ Выстаўка твораў Ядзвігі Сянько **"Святло іконы"** — з 25 лютага.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14.
Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Беларускія маляванкі"** — да 15 сакавіка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка, прысвечаная **26-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана**.
■ Выстаўка дзіцячай творчасці **"Свет без вайны"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка Анатоля Дрыбаса **"Зімовыя пейзажы"** — да 23 лютага.
■ Выстаўка Сяргея Пыжыкава **"Роздумы і мроі"** — да 12 красавіка.
Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** — да 16 сакавіка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўка:
■ Выстаўка **"Аб роднай мове замоўлю слова я..."** — да 20 сакавіка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
Выстаўка:
■ Выстаўка мастацкіх работ класікаў беларускага жывапісу з прыватных збораў **"Краявіды зямлі беларускай"** — да 2 сакавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстаўка скульптуры Уладзіміра Жбанава **"Ад мяне"** — да 31 мая.
■ Выстаўка, прысвечаная 56-годдзю Кубінскай рэвалюцыі і ўсталяванню савецка-кубінскіх дыпламатычных стасункаў, **"Маё імя — Куба"** — да 1 сакавіка.
■ Выстаўка жывапісу, графікі і фатаграфіі **"Мінск — старадаўні і малады"** — да 22 сакавіка.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
Выстаўкі:
■ Выстаўка жывапісу **"Залатое стагоддзе"**, прымеркаваная да 10-годдзя аб'яднання мастакоў "Арцель", — да 22 лютага.
■ Выстаўка макетаў, фотаздымкаў, мультымедыя **"Гарады на грані выжывання: японскія ўрбаністычныя праекты 1960-х гадоў"** — з 27 лютага да 29 сакавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
Выстаўка:
■ Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да верасня.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА Б БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97 ,
+375 17 334 57 41 (факс);
kultura@tut.by

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49.
Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**
Выстаўка:
■ Калектыўная міжнародная выстаўка **"Свет без межаў"** — да 27 сакавіка.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

Выстаўка:
■ **"Доблесць і слава. Даспехі і ўзбраенне XVI — XVII стст."** — да 1 сакавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Анджэй Струміла. Жывапіс"** — да 22 сакавіка.
■ Фотавыстаўка **"Гомельскі палац і мастацкія калекцыі Паскевічаў са збору Дзяржаўнага Эрмітажа"** — да 5 сакавіка.
■ Выстаўка **"Беларусь у Першай Сусветнай вайне"**, арганізаваная сумесна з Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь.
■ Выстаўка дагістарычных гігантаў з санкт-пецярбургскага Музея васковых фігур **"Планета дыназаўраў"** — да 26 красавіка.
■ Выстаўка **"Таямніцы і казкі Японіі"** — да 29 сакавіка.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**
Выстаўкі:
■ **"Гісторыя ў пісьмёнах"** (факсімільныя выданні старажытнарускіх летапісаў з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 28 лютага.
■ **"Рэтра-Гомель"** — да 28 лютага.

Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
Выстаўкі:
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Белая гасцёўня
■ Канцэрт **"Кахайце! — яны адказвалі"** — 21 лютага.
■ Канцэрт **"Шэдэўры камернай музыкі XX стагоддзя"** — 22 лютага.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
Выстаўкі:
■ **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
■ **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
■ **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
■ **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
■ Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Выстаўка **"Чарадзейны куфар"**.
■ Персанальная фотавыстаўка Алены Кавалёвай **"Дзень, які натхніў"**.

ЛІДСКІ ЗАМАК

■ Камера катаванняў.
■ Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
■ Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
■ Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка"**.
■ Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства".**

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстаўка скульптуры Сяргея Аганава **"XL"** — да 28 лютага.
■ Выстаўка мастацкага тэкстылю Марыі Барысенка **"Блюз"** — да 21 сакавіка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **21** — **"Снягурка"** (опера ў 2-х дзеях) М.Рымскага-Корсакава.
■ **22** — **"Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзях) В.-А. Моцарта.
■ **22, 24** — **"Эсмеральда"** (балет у 3-х дзеях) Ц.Пуні.
■ **25** — **"Пікавая дама"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **26, 27** — **"Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **27** — **"Вечар рускага раманса"** (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **28** — Юблейны вечар да 80-годдзя народнага артыста Беларусі, кампазітара Сяргея Картэса (**"Хто я?"** (балет); **"Мядзведзь"** (опера).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 327 60 81.
■ **21, 22** — **"Ноч на Каляды"** М.Гогаля.
■ **24** — **"Хам"** Э.Ажэшка.
■ **25, 26** — **"Местачковае кабарэ"**.
■ **27** — **"Вячэра з прыдуркам"** Ф.Вебэра.
■ **28** — **"Пан Тадэвуш"** А.Міцкевіча.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **21** — **"Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
■ **22** — **"Усе мышы любяць цырк"** В.Буслаевай. Пачатак а 12-й.
■ **22** — **"Адамавы жарты"** С.Навуменка. Пачатак а 19-й.
■ **24** — **"Ціхі шоргат сыходзячых крокаў"** Д.Багаслаўскага.
■ **25** — **"Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
■ **26** — **"Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
■ **27** — **"Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
■ **28** — **"А мне не сорамна!.."** Л.Усцінава. Пачатак а 12-й.
■ **28** — **"Кантракт"** Ф.Вебэра. Пачатак а 19-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **21** — **"Асоль"** У.Саўчыка.
■ **21** — **"Лятучая мыш"** І.Штрауса.
■ **22** — **"Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава.
■ **22** — **"Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера, Дж.Кандэра і інш.
■ **24** — **"Бабскі бунт"** Я.Пцічкіна.
■ **25** — **"Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **26** — **"Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** У.Баскіна.
■ **27** — **"Соф'я Гальшанская"** У.Кандрусевіча.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **21, 24** — **"Папялушка"** (прэм'ера). Пачатак а 10-й (24), аб 11-й (21) і ў 12.30 (24).
■ **22** — **"Тук-тук! Хто там?"** Л.Ралчава. Пачатак а 11-й.
■ **25** — **"Дэкамерон"** Д.Бакача. Пачатак а 18-й.
■ **27, 28** — **"Брэменскія музыкі"** В.Ліванава і Ю.Энціна. Пачатак а 10-й (27), аб 11-й (28) і ў 12.30 (27).